# ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ

## РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



# ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ

## РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

R
«Радыёла-плюс»

ІП Сіўчыкаў Ул. М.

Мінск 2012

УДК 656.11.05(083.15)(476)
ББК 67-99(4Беи)
П683

**Правілы дарожнага руху Рэспублікі Беларусь. —**
П683 Мінск: Уладзімір Сіўчыкаў, 2012. — 96 с., іл. 8 л. укл.
ISBN 978-985-7030-03-3.

Гэта першае выданне Правілаў дарожнага руху Рэспублікі Беларусь на беларускай мове, якое дапаможа вывучаць правілы дарожнага руху і здаваць на дзяржаўнай беларускай мове экзамены для атрымання правоў кіроўцы.

**УДК 656.11.05(083.15)(476)**
**ББК 67-99(4Беи)**

**ISBN 978-985-7030-03-3**

© ГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны». Пераклад з рускай мовы. 2012
© Афармленне. ІП Уладзімір Сіўчыкаў, 2012

# ПРАДМОВА

У найноўшай гісторыі наша краіна адсвяткавала 20-годдзе сваёй незалежнасці. Аднак да гэтага часу існуюць прабелы ў функцыянаванні дзяржаўнай беларускай мовы. Адзін з іх — адсутнасць Правілаў дарожнага руху на беларускай мове. Між тым усе грамадзяне Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца ўдзельнікамі дарожнага руху. Немагчымасць вывучаць Правілы дарожнага руху і здаваць на дзяржаўнай беларускай мове экзамены для атрымання правоў кіроўцы яскрава дэманструе моўную дыскрымінацыю значнай часткі грамадства.

Неаднаразова ў нашу арганізацыю звярталіся грамадзяне Беларусі са скаргамі на адсутнасць як Правілаў дарожнага руху выдадзеных па-беларуску, так і дапаможных беларускамоўных матэрыялаў па іх вывучэнні ў аўташколах. На працягу пяці гадоў ТБМ шмат разоў звярталася да ўладаў Беларусі, а таксама да Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Схода Рэспублікі Беларусь з просьбай зацвердзіць і выдаць афіцыйны беларускамоўны варыянт вышэйзгаданага дакумента. Нягледзячы на пэўныя абяцанні, сітуацыя ніяк не вырашалася.

Каб забяспечыць канстытуцыйныя правы беларускамоўных грамадзян нашай краіны, ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» ажыццявіла пераклад тэксту Правілаў з рускай мовы на беларускую. Падчас працы над перакладам мы звярталіся да прадстаўнікоў розных галін улады з прапановай супрацоўнічаць, і ад некаторых з іх мы атрымалі пэўную падтрымку. Непасрэдна пераклад Правілаў дарожнага руху выканалі сябры Таварыства, супрацоўнікі Інстытута мовы і літаратуры НАН Беларусі, а таксама Святлана і Юрась Гецэвічы.

Мы выказваем шчырую падзяку супрацоўнікам ДАІ МУС Рэспублікі Беларусь за ўзаемадзеянне падчас падрыхтоўкі перакладу, а таксама кіраўніцтву Інстытута мовы і літаратуры НАН Беларусі за навуковае заключэнне адносна тэксту нашага перакладу.

Гэта першае выданне Правілаў дарожнага руху на беларускай мове, якое пакуль з'яўляецца неафіцыйным. Спадзяёмся, што неўзабаве з'явіцца афіцыйны беларускамоўны дакумент па Правілах дарожнага руху.

Першы намеснік старшыні ТБМ
**Алена Анісім**

# Раздзел 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**1.** Дадзенымі Правіламі вызначаецца парадак руху на дарогах Рэспублікі Беларусь.

**2.** У дадзеных Правілах прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны і паняцці:

**2.1.** **аўтобус** — аўтамабіль з колькасцю месцаў для сядзення больш за дзевяць, уключаючы месца кіроўцы;

**2.2.** **аўтамабіль** — механічны транспартны сродак, які мае не менш за чатыры колы, размешчаныя не менш чым на дзвюх восях, за выключэннем колавых трактароў і самаходных машын. Да аўтамабіляў прыраўноўваюцца квадрыцыклы (мотакаляскі) — чатырохколавыя транспартныя сродкі, якія маюць прыводы кіравання аўтамабільнага тыпу і масу ў падрыхтаваным стане не больш за 550 кілаграмаў;

**2.3.** **аўтапоезд** — састаў транспартных сродкаў, які складаецца з аўтамабіля (колавага трактара) і прычэпа, які ім буксіруецца, прычэпа-роспуску, паўпрычэпа (калі не пазначана іншае, далей — прычэп);

**2.4.** **бяспека дарожнага руху** — стан дарожнага руху, які забяспечвае мінімальную верагоднасць узнікнення небяспекі для руху і дарожна-транспартнага здарэння;

**2.5.** **веласіпед, веламабіль (далей — веласіпед)** — транспартны сродак, за выключэннем інвалідных калясак, які прыводзіцца ў рух мускульнай сілай чалавека (людзей), які знаходзіцца на (у) ім;

**2.6.** **веласіпедная дарожка** — вылучаны канструктыўна ці з дапамогай ліній гарызантальнай дарожнай разметкі элемент дарогі, прызначаны для руху кіроўцаў веласіпедаў (далей — веласіпедысты), пазначаны дарожным знакам «Веласіпедная дарожка»;

**2.7.** **бачнасць дарогі** — максімальная аддегласць у кірунку руху, на якой з месца кіроўцы можна распазнаць элементы дарогі і тэхнічныя сродкі арганізацыі дарожнага руху перад транспартным сродкам і правільна арыентавацца пры кіраванні ім;

**2.8.** **кіроўца** — фізічная асоба, якая кіруе транспартным сродкам, за выключэннем асобы, якая навучаецца кіраванню механічным транспартным сродкам (здае кваліфікацыйны практычны экзамен на права кіравання механічным транспартным сродкам). Да кіроўцы прыраўноўваецца асоба, якая навучае кіраванню механічным транспартным сродкам (прымае кваліфікацыйны практычны экзамен на права кіравання механічным транспартным сродкам) і пры гэтым знаходзіцца ў ім, а таксама коннік, паганяты жывёлы;

**2.9. вымушаны прыпынак транспартнага сродку** — спыненне руху транспартнага сродку з-за яго тэхнічнай няспраўнасці або небяспекі, створанай удзельнікамі дарожнага руху, грузам, які перавозіцца, станам кіроўцы (пасажыра), з'яўленнем аб'екта, які перашкаджае дарожнаму руху;

**2.10. газон** — участак зямлі з натуральным або штучна створаным раслінным, пераважна травяным, покрывам;

**2.11. галоўная дарога** — дарога, пазначаная дарожнымі знакамі «Галоўная дарога», «Перасячэнне з другараднай дарогай», «Прымыканне другараднай дарогі», «Аўтамагістраль» або «Дарога для аўтамабіляў» у адносінах да дарогі, якая перасякаецца (якая прымыкае), дарога з удасканаленым пакрыццём у адносінах да дарогі без такога пакрыцця, дарога з гравійным пакрыццём у адносінах да грунтавой, любая дарога ў адносінах да выездаў з прылеглых тэрыторый або жылых зон. Наяўнасць на другараднай дарозе непасрэдна перад скрыжаваннем участка з пакрыццём (удасканаленым або гравійным) не робіць яе роўнай па значэнні з дарогай, якая перасякаецца;

**2.12. дзяржаўны тэхнічны агляд** — сукупнасць арганізацыйна-тэхнічных мер, накіраваных на недапушчэнне да ўдзелу ў дарожным руху транспартных сродкаў, якія не адпавядаюць патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі (далей — тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты);

**2.13. гужавы транспартны сродак** — транспартны сродак, які прыводзіцца ў рух мускульнай сілай жывёлы (жывёл);

**2.14. дзеці** — непаўналетнія ўдзельнікі дарожнага руху, узрост якіх вядомы або відавочны па знешніх прыкметах іншым удзельнікам дарожнага руху;

**2.15. дарога** — комплекс інжынерных збудаванняў або паласа зямлі, якія прызначаны і выкарыстоўваюцца для руху ў вызначаным парадку транспартных сродкаў і пешаходаў;

**2.16. дарожка для коннікаў** — паласа зямлі, прызначаная для руху ў вызначаным парадку коннікаў, пазначаная дарожным знакам «Дарожка для коннікаў»;

**2.17. дарожны рух** — рух пешаходаў і (або) транспартных сродкаў па дарозе, у тым ліку стаянка і прыпынак у межах дарогі, і звязаныя з ім грамадскія адносіны;

**2.18. дарожна-транспартнае здарэнне** — здарэнне, здзейсненае з удзелам хоць бы аднаго механічнага транспартнага сродку, які знаходзіўся ў руху, у выніку якога нанесена шкода жыццю або здароўю фізічнай асобы, яе маёмасці або маёмасці юрыдычнай асобы;

**2.19. чыгуначны транспартны сродак** — лакаматыў, электрацягнік, дызель-цягнік, аўтаматрыса, іншы транспартны сродак, прызначаны для перавозкі пасажыраў і грузаў па чыгуначным пуці;

**2.20. чыгуначны пераезд** — перасячэнне дарогі з чыгуначнымі пуцямі на адным узроўні;

**2.21. жылая зона** — тэрыторыя, уезды на якую і выезды з якой пазначаны дарожнымі знакамі «Жылая зона» і «Канец жылой зоны», а таксама дваровая тэрыторыя, прылеглая да жылой забудовы;

**2.22. колавы трактар** — механічны транспартны сродак для выканання разнастайных тэхналагічных аперацый пры дапамозе навясных, паўнавясных і прычапных машын або прылад, а таксама для прывода стацыянарных машын або руху ў саставе з прычэпам;

**2.23. крайняе правае (левае) размяшчэнне на праезнай частцы дарогі** — становішча транспартнага сродку на праезнай частцы дарогі, прызначанай для руху ў дадзеным кірунку, якое не дае магчымасці руху нават аднакалейных транспартных сродкаў адпаведна правей (лявей) у спадарожным напрамку;

**2.24. манеўраванне (манеўр)** — пачатак руху, перастраенне транспартнага сродку ў руху з адной паласы руху ў іншую (далей — перастраенне), а таксама яго паварот направа або налева, разварот, з'езд з праезнай часткі дарогі, рух заднім ходам;

**2.25. маршрутны транспартны сродак** — механічны транспартны сродак (аўтобус, тралейбус, трамвай, іншы транспартны сродак, які ажыццяўляе рух у рэгулярных звычайных, хуткасных зносінах, у тым ліку экспрэсных), які рухаецца па вызначаным маршруце з пазначанымі пунктамі прыпынку;

**2.26. механічны транспартны сродак** — транспартны сродак, які прыводзіцца ў рух рухавіком;

**2.27. мапед** — механічны транспартны сродак, які прыводзіцца ў рух рухавіком з рабочым аб'ёмам да 50 куб. сантыметраў і мае максімальную канструктыўную хуткасць руху, вызначаную яго тэхнічнай характарыстыкай, не больш за 50 км/г. Да мапедаў прыраўноўваюцца веласіпеды з падвесным рухавіком, мокікі і іншыя механічныя транспартныя сродкі з аналагічнымі характарыстыкамі;

**2.28. матацыкл** — двухколавы механічны транспартны сродак з бакавым прычэпам або без яго, які прыводзіцца ў рух рухавіком з рабочым аб'ёмам больш за 50 куб. сантыметраў. Да матацыклаў прыраўноўваюцца трохколавыя механічныя транспартныя сродкі, якія маюць масу ў падрыхтаваным стане не больш за 400 кілаграмаў, а таксама механічныя транспартныя сродкі,

абсталяваныя рухавіком з рабочым аб'ёмам да 50 куб. сантыметраў, якія маюць максімальную канструктыўную хуткасць руху, вызначаную іх тэхнічнай характарыстыкай, больш за 50 км/г;

**2.29. населены пункт** — тэрыторыя, уезды на якую і выезды з якой пазначаны дарожнымі знакамі «Пачатак населенага пункта» і «Канец населенага пункта» або дарожнымі знакамі «Пачатак мяжы населенага пункта» і «Канец мяжы населенага пункта»;

**2.30. недастатковая бачнасць дарогі** — бачнасць дарогі ў напрамку руху менш за 300 метраў, абумоўленая метэаралагічнымі ўмовамі (дождж, снег і іншыя атмасферныя ападкі) і іншымі фактарамі, якія зніжаюць празрыстасць атмасферы (пыл, дым, туман, смог);

**2.31. абгон** — апярэджанне аднаго або некалькіх транспартных сродкаў, якія рухаюцца, звязанае з выездам на сустрэчную паласу руху (бок праезнай часткі дарогі);

**2.32. агляднасць дарогі** — аб'ектыўная магчымасць бачыць дарожнае становішча з месца кіроўцы;

**2.33. пазначанае скрыжаванне** — скрыжаванне, перад якім на дадзенай дарозе ўсталяваны дарожныя знакі прыярытэту;

**2.34. узбочына** — вылучаны канструктыўна ці суцэльнай лініяй гарызантальнай дарожнай разметкі элемент дарогі, які прымыкае непасрэдна да знешняга краю праезнай часткі, размешчаны з ёй на адным узроўні і не прызначаны для руху транспартных сродкаў, акрамя выпадкаў, прадугледжаных дадзенымі Правіламі;

**2.35. абмежаваная агляднасць дарогі** — агляднасць дарогі, абмежаваная геаметрычнымі параметрамі дарогі, прыдарожнымі інжынернымі збудаваннямі, насаджэннямі і іншымі аб'ектамі, а таксама транспартнымі сродкамі;

**2.36. аднакалейны транспартны сродак** — транспартны сродак на колах, якія размешчаны на адной лініі адно за адным;

**2.37. небяспека для руху** — змяненне ўмоў дарожнага руху або тэхнічнага стану транспартнага сродку, якое пагражае бяспецы ўдзельнікаў дарожнага руху, змушае кіроўцу знізіць хуткасць руху або спыніцца;

**2.38. апярэджанне** — рух транспартнага сродку з хуткасцю, якая перавышае хуткасць транспартнага сродку (транспартных сродкаў), які рухаецца ў спадарожным напрамку;

**2.39. арганізаваная пешаходная калона** — група пешаходаў, пазначаная ў адпаведнасці з дадзенымі Правіламі, якая мае кіраўніка і перамяшчаецца па вызначаным маршруце;

**2.40. арганізаваная транспартная калона** — транспартны сродак або транспартная калона, якія рухаюцца з пастаянна ўключаным блізкім святлом фар у суправаджэнні транспартнага сродку (транспартных сродкаў) аператыўнага прызначэння з уключанымі проблісквымі сігналамі (маячкамі) (далей — маячкі) сіняга або сіняга і чырвонага колераў;

**2.40[1]. пакіданне месца дарожна-транспартнага здарэння** — дзеянні ўдзельніка дарожна-транспартнага здарэння, накіраваныя на ўтойванне факта такога здарэння або абставін яго здзяйснення, якія выклікалі неабходнасць правядзення супрацоўнікамі Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў (далей — ДАІ) мерапрыемстваў па ўстанаўленні (вышуку) дадзенага ўдзельніка і (або) вышуку транспартнага сродку;

**2.41. прыпынак транспартнага сродку** — наўмыснае спыненне руху транспартнага сродку на час да 5 хвілін, а таксама больш чым на 5 хвілін, калі гэта неабходна для пасадкі (высадкі) пасажыраў або загрузкі (разгрузкі) транспартнага сродку;

**2.42. астравок бяспекі** — тэхнічны сродак арганізацыі дарожнага руху на наземных пешаходных пераходах (калі не вызначана іншае, далей — пешаходны пераход), канструктыўна вылучаны над праезнай часткай дарогі і прызначаны ў якасці ахоўнага элемента для прыпынку пешаходаў пры пераходзе праезнай часткі дарогі. Да астраўка бяспекі адносіцца ўчастак раздзяляльнай паласы, праз якую праходзіць пешаходны пераход. У выпадках, вызначаных Міністрам унутраных спраў, дапускаецца пазначэнне астраўкоў бяспекі пры дапамозе ліній гарызантальнай дарожнай разметкі;

**2.43. відавочца дарожна-транспартнага здарэння** — фізічная асоба, якая непасрэдна назірала дарожна-транспартнае здарэнне, валодае адпаведнай інфармацыяй і можа яе паведаміць;

**2.44. пасажыр** — недатычная да кіравання транспартным сродкам фізічная асоба, якая знаходзіцца ў (на) транспартным сродку, а таксама ўваходзіць (садзіцца) у (на) транспартны сродак або сыходзіць (высаджваецца) з транспартнага сродку;

**2.45. скрыжаванне** — месца перасячэння, прымыкання ці разгалінавання дарог на адным узроўні. Мяжа скрыжавання вызначаецца ўяўнымі лініямі, якія злучаюць адпаведна процілеглыя, найбольш аддаленыя ад цэнтра скрыжавання пачаткі закругленняў праезных частак дарог. Не з'яўляюцца скрыжаваннямі перасячэнні з веласіпеднымі, пешаходнымі дарожкамі і дарожкамі для коннікаў;

**2.46. пешаход** — фізічная асоба, якая ўдзельнічае ў дарожным руху па-за транспартным сродкам, у тым ліку рухаецца ў інваліднай калясцы, наролікавых каньках, лыжах, на іншым спартыўным

інвентары, якая вядзе веласіпед, мапед або матацыкл, вязе санкі або каляску і не выконвае ў вызначаным парадку на дарозе рамонтныя і іншыя работы;

**2.47. пешаходная дарожка** — вылучаны канструктыўна ці з дапамогай ліній гарызантальнай дарожнай разметкі элемент дарогі, прызначаны для руху пешаходаў, пазначаны дарожным знакам «Пешаходная дарожка»;

**2.48. пешаходная зона** — тэрыторыя, прызначаная для руху пешаходаў і веласіпедыстаў, уезды на якую і выезды з якой пазначаны дарожнымі знакамі «Пешаходная зона» і «Канец пешаходнай зоны»;

**2.49. пешаходны пераход** — участак праезнай часткі, прызначаны для руху пешаходаў праз праезную частку дарогі і пазначаны дарожнымі знакамі «Пешаходны пераход» і (або) гарызантальнай дарожнай разметкай;

**2.50. паласа руху** — любая з падоўжных палос праезнай часткі дарогі, пазначаная або не пазначаная гарызантальнай дарожнай разметкай, якая мае шырыню, дастатковую для руху транспартных сродкаў (за выключэннем аднакалейных) у адзін рад;

**2.51. перавага** — права на першачарговы рух у вызначаным напрамку ў адносінах да іншых удзельнікаў дарожнага руху;

**2.52. перашкода для дарожнага руху** — аб'ект, які знаходзіцца на шляху ўдзельніка дарожнага руху і змушае яго знізіць хуткасць руху, здзейсніць аб'езд або спыніцца;

**2.53. прылеглая тэрыторыя** — тэрыторыя, якая непасрэдна прылягае да праезнай часткі дарогі, не прызначаная для скразнога праезду, на якой размешчаны двары, пляцоўкі, спецыяльна адведзеныя для стаянкі транспартных сродкаў, аўтазапраўчныя станцыі, будаўнічыя пляцоўкі і іншыя аб'екты;

**2.54. прычэп** — транспартны сродак, прызначаны для руху ў саставе з механічным транспартным сродкам;

**2.55. праезная частка дарогі** — элемент дарогі, прызначаны для руху транспартных сродкаў і ў выпадках, прадугледжаных дадзенымі Правіламі, — для руху пешаходаў;

**2.56. пуцепровод** — інжынернае збудаванне над дарогай (чыгуначнымі пуцямі), якая мае з'езды на іншую дарогу, што забяспечвае рух на розных узроўнях;

**2.57. раздзяляльная зона** — вылучаны гарызантальнай дарожнай разметкай элемент дарогі, які падзяляе сумежныя праезныя часткі і не прызначаны для руху або спынення транспартных сродкаў і пешаходаў па-за спецыяльна абазначанымі месцамі;

**2.58. раздзяляльная паласа** — вылучаны канструктыўна элемент дарогі, які падзяляе сумежныя праезныя часткі і не прызначаны

для руху або спынення транспартных сродкаў і пешаходаў па-за спецыяльна абсталяванымі і пазначанымі месцамі;

**2.59. рэгуліроўшчык** — супрацоўнік ДАІ, які ажыццяўляе рэгуляванне дарожнага руху ў экіпіроўцы (форменным адзенні павышанай бачнасці з элементамі са святлоадбівальнага матэрыялу, з жазлом і свістком). Да рэгуліроўшчыка прыраўноўваецца супрацоўнік Ваеннай аўтамабільнай інспекцыі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь у экіпіроўцы (форменным адзенні павышанай бачнасці з элементамі са святлоадбівальнага матэрыялу, з дыскам з чырвоным сігналам (святлоадбівальнікам) і свістком) пры забеспячэнні руху арганізаваных транспартных калон, у склад якіх уваходзяць транспартныя сродкі, якія належаць Міністэрству абароны, Міністэрству ўнутраных спраў, Камітэту дзяржаўнай бяспекі, Дзяржаўнаму пагранічнаму камітэту, іншым войскам і воінскім фарміраванням Рэспублікі Беларусь;

**2.60. самаходная машына** — гусенічны трактар, сельскагаспадарчая, дарожная, будаўнічая, іншая машына, якія без дадатковых мер забеспячэння бяспекі дарожнага руху, прадугледжаных арганізацыяй (заводам)-вытворцам, не прызначаны для ўдзелу ў дарожным руху. Удзел у дарожным руху самаходных машын павінен ажыццяўляцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі дадзеных Правіл, якія прад'яўляюцца да транспартных сродкаў, калі гэтымі Правіламі не вызначана іншае ў адносінах да самаходных машын;

**2.61. стаянка транспартнага сродку** — наўмыснае спыненне руху транспартнага сродку больш чым на 5 хвілін па прычынах, не звязаных з пасадкай (высадкай) пасажыраў або загрузкай (разгрузкай) транспартнага сродку;

**2.62. тахограф** — кантрольная прылада (сродак вымярэння), якая ўсталёўваецца на механічных транспартных сродках з мэтай бесперапыннага вымярэння і (або) рэгістрацыі ў аўтаматычным рэжыме пройдзенага шляху, хуткасці руху гэтых транспартных сродкаў, перыядаў работы, адпачынку кіроўцаў і іншай інфармацыі;

**2.63. цёмны час сутак** — прамежак часу, які пачынаецца пасля заходу сонца і заканчваецца з узыходам сонца;

**2.64. тэхнічна дапушчальная агульная маса** — максімальная маса транспартнага сродку, вызначаная арганізацыяй (заводам)-вытворцам (з грузам, кіроўцам і пасажырамі). Тэхнічна дапушчальнай агульнай масай аўтапоезда з'яўляецца сума тэхнічна дапушчальных агульных мас аўтамабіля (колавага трактара) і прычэпа;

**2.65. тэхнічныя сродкі арганізацыі дарожнага руху** — прылады, канструкцыі і выявы, якія прымяняюцца на дарогах для рэгуля-

вання дарожнага руху, забеспячэння яго бяспекі і павышэння прапускной здольнасці дарог;

**2.66. ціхаходны транспартны сродак** — механічны транспартны сродак, які па сваёй канструкцыі ці па ўмовах забеспячэння бяспекі пры перавозцы грузу не можа рухацца з хуткасцю, якая перавышае 30 км/г, пазначаны апазнавальным знакам «Ціхаходны транспартны сродак»;

**2.67. трамвай** — механічны транспартны сродак, прызначаны для руху па рэйках, які ўдзельнічае ў дарожным руху і не з'яўляецца чыгуначным транспартным сродкам;

**2.68. транспартная калона** — група з двух і больш механічных транспартных сродкаў, якія ідуць адзін за адным па адной паласе руху з пастаянна ўключаным блізкім святлом фар, пазначаная апазнавальнымі знакамі «Калона», калі іншае не вызначана падпунктам 201.7 пункта 201 дадзеных Правіл;

**2.69. транспартны сродак** — прылада, прызначаная для руху па дарозе і для перавозкі пасажыраў, грузаў або ўстаноўленага на ім абсталявання;

**2.70. транспартны сродак аператыўнага прызначэння** — транспартны сродак, які мае спецыяльную колераграфічную афарбоўку і (або) светлавую і гукавую сігналізацыю;

**2.71. тралейбус** — механічны транспартны сродак, які прыводзіцца ў рух электрарухавіком, сілкаванне якога забяспечваецца па падвеснай кантактнай сетцы ад знешняй крыніцы электрычнага току;

**2.72. тратуар** — элемент дарогі, які прымыкае да праезнай часткі або аддзелены ад яе газонам, прызначаны для руху пешаходаў і веласіпедыстаў у адпаведнасці з дадзенымі Правіламі;

**2.73. цяжкавагавы і (або) буйнагабарытны транспартны сродак** — транспартны сродак такіх масы і (або) габарытаў, пры якіх для праезду па дарогах патрабуецца спецыяльны дазвол, які выдаецца ў парадку, вызначаным заканадаўствам;

**2.74. кіраванне транспартным сродкам** — уздзеянне на органы кіравання транспартнага сродку, якое прывяло да змены яго размяшчэння адносна першапачатковага;

**2.75. удасканаленае пакрыццё** — пакрыццё дарогі з асфальтабетонных або цэментабетонных сумесяў, са шчэбеневых, гравійных, шлакавых або іншых мінеральных матэрыялаў, апрацаваных арганічнымі або мінеральнымі вяжучымі матэрыяламі, а таксама са штучных матэрыялаў: брусчаткі, каменю, клінкеру, мазаікі і да т. п.;

**2.76. саступіць дарогу (не мець перавагі)** — патрабаванне, якое азначае не аднаўляць ці не працягваць рух або не ажыццяўляць

які-небудзь манеўр (за выключэннем патрабавання вызваліць занятую паласу руху, якое падаецца рэгуліроўшчыкам або кіроўцам транспартнага сродку аператыўнага прызначэння), калі гэта можа прымусіць іншага ўдзельніка (іншых удзельнікаў) дарожнага руху змяніць напрамак і (або) хуткасць руху;

**2.77. удзельнік дарожнага руху** — фізічная асоба, якая знаходзіцца ў межах дарогі ў (на) транспартным сродку або па-за ім, за выключэннем рэгуліроўшчыка і работніка, які выконвае ў вызначаным парадку на дарозе рамонтныя і іншыя работы;

**2.77[1]. шасі транспартнага сродку** — састаўная частка грузавога аўтамабіля, прычэпа да яго, грузапасажырскага аўтамабіля, цягача, прызначаная для наступнага вырабу транспартнага сродку, якая не мае састаўляючых частак для перавозкі пасажыраў і (або) грузаў і ўстаноўленага абсталявання. Удзел у дарожным руху шасі транспартных сродкаў павінен ажыццяўляцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі дадзеных Правіл, якія прад'яўляюцца да транспартных сродкаў, калі гэтымі Правіламі не вызначана іншае ў адносінах да шасі транспартных сродкаў;

**2.78. элементы дарогі** — адна або некалькі праезных частак дарогі, трамвайныя пуці, тратуары, пешаходныя і веласіпедныя дарожкі, раздзяляльныя зоны, раздзяляльныя палосы, насцілы чыгуначных пераездаў і ўзбочыны;

**2.79. эстакада** — інжынернае збудаванне для ўзняцця адной дарогі над іншай у месцы іх перасячэння, а таксама для размяшчэння на пэўнай вышыні дарогі, якая не мае з'ездаў на іншую дарогу.

**3.** На дарогах Рэспублікі Беларусь устаноўлены правабаковы рух транспартных сродкаў.

**4.** ДАІ ажыццяўляе ўзгадненне дарожнага руху ў выпадках, якія не вызначаны дадзенымі Правіламі, а таксама пры прымяненні з эксперыментальнымі мэтамі тэхнічных сродкаў арганізацыі дарожнага руху, не прадугледжаных дадзенымі Правіламі і тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі. Своечасовае давядзенне ў даступных формах да ведама фізічных і юрыдычных асоб тэхнічных нарматыўных прававых актаў у сферы дарожнага руху і забеспячэння яго бяспекі ўскладаецца на рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі.

Формы і метады кантролю за выкананнем удзельнікамі дарожнага руху патрабаванняў дадзеных Правіл вызначаюцца Міністэрствам унутраных спраў.

**5.** Парушэнне дадзеных Правіл цягне адказнасць, вызначаную заканадаўчымі актамі.

# Раздзел 2
# Агульныя правы і абавязкі ўдзельнікаў дарожнага руху

**6.** Удзельнікі дарожнага руху маюць права на:

**6.1.** забеспячэнне бяспечных і эфектыўных умоў дарожнага руху;

**6.2.** атрыманне ад дзяржаўных органаў і ўпаўнаважаных службовых асоб дакладнай інфармацыі аб бяспечных умовах дарожнага руху, прычынах увядзення абмежавання або забароны руху па дарогах, якасці прадукцыі, работ і паслуг, звязаных з забеспячэннем бяспекі дарожнага руху;

**6.3.** атрыманне медыцынскай дапамогі ў выпадку дарожна-транспартнага здарэння;

**6.4.** абскарджанне ў парадку, вызначаным заканадаўствам, дзеянняў (бяздзеяння) дзяржаўных органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўнае рэгуляванне і кіраванне ў сферы дарожнага руху і забеспячэння яго бяспекі (іх службовых асоб);

**6.5.** пакрыццё нанесенай ім і (або) іх маёмасці шкоды ў парадку, вызначаным заканадаўствам;

**6.6.** карыстанне іншымі правамі ў галіне дарожнага руху, прадугледжанымі дадзенымі Правіламі і іншымі актамі заканадаўства.

**7.** Удзельнікі дарожнага руху абавязаны:

**7.1.** ведаць і выконваць патрабаванні дадзеных Правіл, якія адносяцца да іх, і кіравацца:

**7.1.1.** сігналамі (указаннямі) рэгуліроўшчыка (далей — сігналы рэгуліроўшчыка);

**7.1.2.** сігналамі дарожных святлафораў (калі не вызначана іншае, далей — святлафоры), віды якіх прыведзены ў дадатку 1 да дадзеных Правіл;

**7.1.3.** дарожнымі знакамі згодна з дадаткам 2 да дадзеных Правіл;

**7.1.4.** гарызантальнай і вертыкальнай дарожнай разметкай згодна з дадаткам 3 да дадзеных Правіл;

**7.1.5.** пералікам няспраўнасцей транспартных сродкаў і ўмоў, пры якіх забараняецца іх удзел у дарожным руху, згодна з дадаткам 4 да дадзеных Правіл;

**7.1.6.** апазнавальнымі знакамі транспартных сродкаў згодна з дадаткам 5 да дадзеных Правіл;

**7.2.** не ствараць перашкод і небяспекі для дарожнага руху, дзейнічаць добрасумленна, карэктна, быць уважлівымі і ўзаемна ветлівымі. Кожны ўдзельнік дарожнага руху, які выконвае дадзеныя Правілы, мае права разлічваць на тое, што і іншыя ўдзельнікі дарожнага руху будуць выконваць патрабаванні, якія змяшчаюцца ў іх;

**7.3.** пры суправаджэнні дзяцей прымаць усе магчымыя меры па недапушчэнні іх самастойнага выхаду на праезную частку дарогі (акрамя жылых і пешаходных зон);

**7.4.** прымаць меры па недапушчэнні забруджвання дарог і навакольнага асяроддзя, не выкідваць смецце і іншыя прадметы па-за спецыяльна адведзенымі месцамі;

**7.5.** выконваць іншыя абавязкі ў галіне дарожнага руху, вызначаныя дадзенымі Правіламі і іншымі актамі заканадаўства.

## Раздзел 3
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ КІРОЎЦАЎ

**8.** Кіроўца мае права:

**8.1.** кіраваць транспартным сродкам у вызначаным парадку;

**8.2.** ведаць прычыну, па якой супрацоўнікам ДАІ, іншымі службовымі асобамі, названымі ў частцы трэцяй падпункта 9.1 пункта 9 дадзеных Правіл, спынены транспартны сродак, а таксама прозвішча і пасаду гэтых асоб. Пры гэтым асобы, якія валодаюць правам правяраць у кіроўцы дакументы, абавязаны прад'явіць па патрабаванні кіроўцы службовае пасведчанне;

**8.3.** перадаваць кіраванне транспартным сродкам іншай асобе, якая мае пры сабе пасведчанне кіроўцы на права кіравання механічным транспартным сродкам адпаведнай катэгорыі з талонам да яго (пасведчанне трактарыста-машыніста адпаведнай катэгорыі з талонам да яго, часовы дазвол на права кіравання механічным транспартным сродкам) (калі не пазначана іншае, далей — пасведчанне кіроўцы).

**9.** Кіроўца абавязаны:

**9.1.** спыняцца па патрабаванні супрацоўніка ДАІ ў форменным адзенні, а таксама службовых асоб, названых у частцы трэцяй дадзенага падпункта.

Патрабаванне супрацоўніка ДАІ аб спыненні транспартнага сродку павінна быць пададзена ім своечасова, зразумела кіроўцу і выяўляецца шляхам падачы сігналу жазлом, жэстам рукі, з дапамогай гукаўзмацняльніка або шляхам уключэння на транспартным сродку аператыўнага прызначэння маячка чырвонага колеру.

Службовыя асобы органаў унутраных спраў (акрамя супрацоўнікаў ДАІ), органаў дзяржаўнай аховы, Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю, Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, унутраных войск Міністэрства ўнутраных спраў, органаў дзяржаўнай бяспекі, органаў пагранічнай службы,

мытных органаў, Транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый маюць права спынення транспартных сродкаў толькі для ажыццяўлення ўскладзеных на названыя органы функцый. Пры гэтым яны павінны быць у форменным адзенні (акрамя службовых асоб Транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый), камізэльцы павышанай бачнасці з элементамі са святлоадбівальнага матэрыялу і выкарыстоўваць для падачы сігналу дыск з чырвоным сігналам (святлоадбівальнікам).

У цёмны час сутак па-за населеным пунктам побач з названымі асобамі павінен знаходзіцца транспартны сродак аператыўнага прызначэння з уключаным маячком;

**9.2.** па патрабаванні супрацоўніка ДАІ прайсці ў вызначаным парадку праверку (агляд) для вызначэння стану алкагольнага ап'янення або стану, выкліканага ўжываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў;

**9.3.** трымаць транспартны сродак, які ўдзельнічае ў дарожным руху, у тэхнічна спраўным стане, правяраць яго тэхнічны стан перад пачаткам руху, а таксама трымаць у чысціні шкло і знешнія светлавыя прыборы;

**9.4.** своечасова прадстаўляць на дзяржаўны тэхнічны агляд механічны транспартны сродак, які ўдзельнічае ў дарожным руху і знаходзіцца ў яго валоданні, а таксама прычэп (прычэпы) да яго;

**9.5.** быць прышпіленым і не перавозіць пасажыраў з непрышпіленымі рамянямі бяспекі пры руху ў механічным транспартным сродку, абсталяваным рамянямі бяспекі, а пры руху на матацыкле, мапедзе — быць у зашпіленым моташлеме і не перавозіць пасажыраў без зашпіленага моташлема. Рамянём бяспекі таксама павінна быць прышпілена асоба, якая навучаецца кіраванню механічным транспартным сродкам.

Дапускаецца не прышпільвацца рамянямі бяспекі толькі для:

асобы, якая навучае кіраванню механічным транспартным сродкам, калі транспартным сродкам кіруе асоба, якая навучаецца кіраванню;

пасажыра транспартнага сродку аператыўнага прызначэння, кіроўцы аўтамабіля-таксі — пры руху ў населеным пункце;

пасажыра і кіроўцы з медыцынскімі супрацьпаказаннямі, пералік якіх вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя;

**9.6.** не выконваць дзеянняў, якія адцягваюць яго ад кіравання транспартным сродкам;

**9.7.** забяспечыць бяспечныя ўмовы перавозкі пасажыраў;

**9.8.** выязджаць на дарогу і з'язджаць з яе, параязджаць раздзяляльную паласу, раздзяляльную зону ў вызначаных для гэтага месцах (месцы, пазначаныя адпаведнымі дарожнымі знакамі, дарожнай разметкай, абсталяваныя прыладамі, якія агароджваюць ці накіроўваюць і да т. п.);

**9.9.** прымаць меры па зніжэнні хуткасці ў сітуацыі, што складваецца, аж да спынення транспартнага сродку, якія забяспечваюць бяспечныя ўмовы для дарожнага руху пешаходаў (у тым ліку дзяцей, інвалідаў, людзей сталага ўзросту, а таксама веласіпедыстаў, якія знаходзяцца на дарозе), саступаць дарогу пешаходам на нерэгулюемых пешаходных пераходах і рэгулюемых пешаходных пераходах пры адначасовым для кіроўцаў і пешаходаў дазваляльным сігнале рэгуліроўшчыка або святлафора;

**9.10.** пакідаць сваё месца або пакідаць транспартны сродак толькі ў выпадку, калі прыняты меры, якія выключаюць самаадвольны рух транспартнага сродку;

**9.11.** пры перадачы кіравання механічным транспартным сродкам іншай асобе пераканацца ў наяўнасці ў яе пры сабе пасведчання кіроўцы (акрамя выпадку навучання кіраванню механічным транспартным сродкам);

**9.12.** прадастаўляць транспартны сродак для вызвалення праезнай часткі дарогі ад транспартных сродкаў, пашкоджаных пры дарожна-транспартным здарэнні, а таксама дастаўляць на кіруемым транспартным сродку*:

асоб, якія маюць патрэбу ў тэрміновай медыцынскай дапамозе, у бліжэйшую арганізацыю аховы здароўя па патрабаванні работнікаў праваахоўных органаў і арганізацый аховы здароўя;

работнікаў арганізацый аховы здароўя для праезду да месца знаходжання хворага, жыццё якога знаходзіцца пад пагрозай;

работнікаў праваахоўных органаў для выканання неадкладных службовых абавязкаў, звязаных з праследам асоб, якія падазраюцца ў здзяйсненні злачынстваў, пры прыняцці названымі работнікамі належных мер па забеспячэнні бяспекі кіроўцы і пасажыраў транспартнага сродку.

Асоба, якая скарысталася транспартным сродкам, павінна па патрабаванні кіроўцы выдаць яму адпаведную даведку або зрабіць запіс у дарожны ліст з указаннем працягласці паездкі,

* Дадзенае патрабаванне не распаўсюджваецца на транспартныя сродкі, якія належаць дыпламатычным прадстаўніцтвам, консульскім установам, міжнародным арганізацыям і грамадзянам замежных дзяржаў, якія карыстаюцца ў адпаведнасці з міжнароднымі дамовамі Рэспублікі Беларусь дыпламатычным імунітэтам.

пройдзенай адлегласці, свайго прозвішча, пасады, нумара службовага пасведчання, назвы адпаведнай арганізацыі. Выдаткі, звязаныя з прадастаўленнем транспартнага сродку, па патрабаванні ўладальніка транспартнага сродку пакрываюцца ў парадку, вызначаным заканадаўствам;

**9.13.** навучаць кіраванню механічным транспартным сродкам у індывідуальным парадку толькі на пляцоўках або аўтадромах, закрытых для дарожнага руху, пры наяўнасці ў яго пасведчання кіроўцы і стажу кіроўцы не менш за два гады.

**10.** Кіроўцу забараняецца:

**10.1.** кіраваць транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення або ў стане, выкліканым ужываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў, а таксама ўжываць алкагольныя, слабаалкагольныя напоі, піва, наркатычныя сродкі, псіхатропныя, таксічныя або іншыя адурманьваючыя рэчывы пасля падачы супрацоўнікам органаў унутраных спраў патрабавання аб спыненні транспартнага сродку да праходжання ў вызначаным парадку праверкі (агляду) на прадмет вызначэння стану алкагольнага ап'янення або стану, выкліканага ўжываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў. У гэтых выпадках супрацоўнікі ДАІ маюць права праводзіць затрыманне і прымусовую адбуксіроўку транспартнага сродку пры адсутнасці іншай правамернай магчымасці даставіць транспартны сродак да месца захоўвання;

**10.2.** кіраваць транспартным сродкам у хваравітым ці стомленым стане, які ставіць пад пагрозу бяспеку дарожнага руху, пад уздзеяннем лекавых сродкаў, якія зніжаюць увагу і хуткасць рэакцыі;

**10.3.** удзельнічаць у дарожным руху на транспартным сродку з забруджваннямі (наслаеннямі), якія абмяжоўваюць аглядласць дарогі, а таксама не дазваляюць бачыць інфармацыю на рэгістрацыйным знаку з адлегласці 40 метраў і менш;

**10.4.** карыстацца падчас руху транспартнага сродку апаратам радыё- і тэлефоннай сувязі, не абсталяваным тэхнічнай прыладай, якая дазваляе весці перамовы без выкарыстання рук;

**10.5.** рухацца на цяжкавагавым і (або) буйнагабарытным транспартным сродку без спецыяльнага дазволу, які выдаецца ў парадку, вызначаным заканадаўствам, або з парушэннем умоў, вызначаных у такім дазволе, а таксама адхіляцца ад маршруту, названага ў гэтым дазволе;

**10.6.** рухацца на транспартным сродку на гусенічным ходзе або з металічнымі шыпамі (акрамя ашыпаваных шын) па дарозе агульнага карыстання з удасканаленым пакрыццём.

**11.** Уладальніку транспартнага сродку або асобе, якая мае права на кіраванне транспартным сродкам, забараняецца перадаваць кіраванне транспартным сродкам іншай асобе:

**11.1.** якая не мае пры сабе пасведчання кіроўцы;

**11.2.** не пераканаўшыся, што асоба, якой перадаецца кіраванне транспартным сродкам, не знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення або ў стане, выкліканым ужываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў.

**12.** Кіроўца механічнага транспартнага сродку абавязаны мець пры сабе і перадаваць для праверкі:

**12.1.** супрацоўнікам ДАІ:

**12.1.1.** пасведчанне кіроўцы;

**12.1.2.** пасведчанне аб рэгістрацыі (тэхнічны пашпарт, тэхнічны талон) механічнага транспартнага сродку, прычэпа (прычэпаў) да яго або пашпарт транспартнага сродку (яго шасі), які зроблены ў Рэспубліцы Беларусь і дастаўляецца да спажыўца або да месца дзяржаўнай рэгістрацыі сваім ходам (далей — пашпарт транспартнага сродку (шасі транспартнага сродку);

**12.1.3.** дакумент (сертыфікат) аб праходжанні дзяржаўнага тэхнічнага агляду (за выключэннем транспартнага сродку, які раней не зарэгістраваны ў Рэспубліцы Беларусь і дастаўляецца спажыўцу або да месца дзяржаўнай рэгістрацыі сваім ходам);

**12.1.4.** дакумент, які пацвярджае заключэнне дагавора абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальніка транспартнага сродку (дагавор пагранічнага страхавання або сапраўдны на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дагавор страхавання «Зялёная карта»);

**12.1.5.** дазвол органа сувязі на выкарыстанне сродкаў радыё- і спадарожнікавай сувязі пры іх наяўнасці на транспартным сродку ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам (за выключэннем кіроўцы транспартнага сродку аператыўнага прызначэння);

**12.2.** службовым асобам, названым у частцы трэцяй падпункта 9.1 пункта 9 дадзеных Правіл, — дакумент, які сведчыць яго асобу, або пасведчанне кіроўцы.

**13.** Кіроўцы механічных транспартных сродкаў, што належаць юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам, якія здзяйсняюць дзейнасць у галіне аўтамабільнага транспарту, таксама павінны мець пры сабе і перадаваць для праверкі супрацоўнікам ДАІ, службовым асобам Транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый транспартныя і іншыя дакументы, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі.

Іншыя службовыя асобы маюць права праверкі дакументаў у кіроўцаў механічных транспартных сродкаў толькі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі для здзяйснення функцый, ускладзеных на адпаведныя дзяржаўныя органы.

**14.** Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія часова знаходзяцца ці часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, пры кіраванні механічным транспартным сродкам абавязаны мець:

**14.1.** дакументы, названыя ў падпунктах 12.1.4 і 12.1.5 пункта 12 дадзеных Правіл;

**14.2.** нацыянальнае пасведчанне кіроўцы, якое адпавядае патрабаванням Канвенцыі аб дарожным руху, падпісанай у г. Вене 8 лістапада 1968 года (далей — Канвенцыя), а ў выпадку неадпаведнасці патрабаванням Канвенцыі — нацыянальнае пасведчанне кіроўцы з завераным перакладам на адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь;

**14.3.** пасведчанне аб рэгістрацыі транспартнага сродку, якое адпавядае патрабаванням Канвенцыі, — у выпадку кіравання транспартным сродкам, які не зарэгістраваны ў Рэспубліцы Беларусь і часова знаходзіцца на яе тэрыторыі;

**14.4.** на транспартным сродку рэгістрацыйныя знакі, выдадзеныя кампетэнтным органам дзяржавы, у якой ён зарэгістраваны.

**15.** Кіроўца механічнага транспартнага сродку, абсталяванага тахографам, абавязаны прадастаўляць па патрабаванні супрацоўнікаў ДАІ, службовых асоб Транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый:

**15.1.** пры аналагавым тахографе — рэгістрацыйныя лісткі (тахаграмы);

**15.2.** пры лічбавым тахографе — картку кіроўцы, раздрукоўкі з тахографа, рэгістрацыйныя лісткі (тахаграмы), даць доступ да тахографа;

**15.3.** пасведчанне аб праверцы (каліброўцы) тахографа.

## Раздзел 4
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ ПЕШАХОДАЎ

**16.** Пешаход мае права:

**16.1.** рухацца па дарогах у адпаведнасці з дадзенымі Правіламі;

**16.2.** на пераважнае перасячэнне праезнай часткі дарогі па нерэгулюемым пешаходным пераходзе, а таксама па рэгулюемым пешаходным пераходзе пры дазвальняльным сігнале рэгуліроўшчыка або святлафора.

**17.** Пешаход абавязаны:

**17.1.** рухацца па тратуары, пешаходнай або веласіпеднай дарожцы, а пры іх адсутнасці — па ўзбочыне.

У выпадку адсутнасці названых элементаў дарогі ці немагчымасці руху пешаходаў па іх дапускаецца рух пешахода па краі яе праезнай часткі насустрач руху транспартных сродкаў.

Пры руху па краі праезнай часткі дарогі ў цёмны час сутак пешаход павінен пазначыць сябе святлоадбівальным элементам (элементамі). Святлоадбівальныя характарыстыкі дадзеных элементаў вызначаюцца тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі;

**17.2.** пераходзіць (перасякаць) праезную частку дарогі па падземным, надземным пешаходных пераходах, а пры іх адсутнасці, пераканаўшыся, што выхад на праезную частку дарогі бяспечны, — па наземным пешаходным пераходзе (пры адсутнасці наземнага пешаходнага перахода — на скрыжаванні па лініі тратуараў або ўзбочын);

**17.3.** пры адсутнасці ў межах бачнасці пешахода падземнага, надземнага, наземнага пешаходных пераходаў і скрыжавання пераходзіць (перасякаць) праезную частку дарогі па найкарацейшай траекторыі на ўчастку, дзе дарога добра праглядаецца ў абодва бакі, пераканаўшыся, што выхад на праезную частку дарогі бяспечны і сваімі дзеяннямі пешаход не створыць перашкоды для руху транспартных сродкаў.

Пры перасячэнні праезнай часткі дарогі па-за падземным, надземным, наземным пешаходнымі пераходамі і скрыжаваннем у цёмны час сутак пешаходу рэкамендуецца пазначыць сябе святлоадбівальным элементам (элементамі).

**18.** Пешаходу забараняецца:

**18.1.** рухацца па краі праезнай часткі дарогі пры наяўнасці тратуара, пешаходнай або веласіпеднай дарожкі, узбочыны, па якіх магчымы рух пешаходаў, за выключэннем выпадкаў, названых у пунктах 21 і 135 дадзеных Правіл;

**18.2.** затрымлівацца і спыняцца на праезнай частцы дарогі, у тым ліку на лініі гарызантальнай дарожнай разметкі, якая падзяляе сустрэчныя і спадарожныя патокі транспартных сродкаў, за выключэннем спынення на астраўках бяспекі;

**18.3.** пераходзіць (перасякаць) праезную частку па-за падземным, надземным, наземным пешаходнымі пераходамі на ўчастку дарогі:

**18.3.1.** з раздзяляльнай зонай, раздзяляльнай паласой;

**18.3.2.** з агульнай колькасцю палос руху шэсць і больш;

**18.3.3.** дзе ўсталяваныя дарожныя агароджванні;

**18.4.** выходзіць на праезную частку дарогі з-за транспартнага сродку, які стаіць, або іншага аб'екта, які абмяжоўвае агляднасць

дарогі, не пераканаўшыся ў адсутнасці транспартных сродкаў, якія набліжаюцца.

**19.** У цёмны час сутак і (або) пры недастатковай бачнасці дарогі ў выпадку руху па ўзбочыне ці па краі праезнай часткі дарогі пешаход, які вядзе веласіпед, мапед, матацыкл без бакавога прычэпа, пазначаны габарытнымі агнямі, сігнальнымі ліхтарамі ці святлоадбівальнікамі (святлоадбівальнымі стужкамі), павінен рухацца па ходу руху транспартных сродкаў.

**20.** Пры набліжэнні транспартнага сродку з уключанымі маячкамі сіняга або сіняга і чырвонага колераў пешаходу забараняецца пераходзіць (перасякаць) праезную частку дарогі, а пешаход, які знаходзіцца на праезнай частцы дарогі, павінен сысці з яе, выконваючы меры засцярогі.

**21.** Рух арганізаванай пешаходнай калоны па праезнай частцы дарогі дазваляецца толькі ў кірунку руху транспартных сродкаў па правым баку не больш за чатырох чалавек у радзе. У светлы час сутак спераду і ззаду з левага боку гэтай калоны павінны быць суправаджальнікі са сцяжкамі чырвонага колеру, а ў цёмны час сутак і (або) пры недастатковай бачнасці дарогі спераду — суправаджальнікі з ліхтаром, які выпраменьвае белае святло, і ззаду — які выпраменьвае чырвонае святло.

**22.** Групы дзяцей дазваляецца вадзіць толькі па тратуарах, пешаходных і веласіпедных дарожках, а пры іх адсутнасці — па ўзбочынах насустрач руху транспартных сродкаў і толькі ў светлы час сутак. Пры гэтым іх перамяшчэнне ажыццяўляецца калонай не больш чым па двое дзяцей у радзе ў суправаджэнні паўналетніх з разліку не менш за аднаго суправаджальніка на дваццаць дзяцей.

## Раздзел 5
## АБАВЯЗКІ ПАСАЖЫРАЎ

**23.** Пасажыр абавязаны:

**23.1.** ажыццяўляць пасадку (высадку) толькі пасля поўнага спынення транспартнага сродку з пасадачнай пляцоўкі, а ў выпадку яе адсутнасці — з тратуара або ўзбочыны;

**23.2.** быць прышпіленым пры руху ў механічным транспартным сродку, абсталяваным рамянямі бяспекі, акрамя выпадкаў, названых у абзацах трэцім і чацвёртым часткі другой падпункта 9.5 пункта 9 дадзеных Правіл, а пры паездцы на матацыкле, мапедзе — быць у зашпіленым моташлеме;

**23.3.** выконваць меры бяспекі, прадугледжаныя канструкцыяй транспартнага сродку і правіламі перавозкі пасажыраў на адпаведным відзе транспартнага сродку.

**24.** Пасажыру забараняецца:

**24.1.** адцягваць кіроўцу ад кіравання транспартным сродкам падчас яго руху і (або) перашкаджаць кіроўцу ў кіраванні транспартным сродкам;

**24.2.** перашкаджаць закрыццю дзвярэй транспартнага сродку, а падчас яго руху высоўвацца ў аконныя праёмы, адчыняць дзверы транспартнага сродку;

**24.3.** пры руху на грузавым аўтамабілі з бартавой платформай стаяць, сядзець на яго бартах або на грузе, які знаходзіцца вышэй за барты.

## Раздзел 6
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ КІРОЎЦАЎ І ІНШЫХ АСОБ У АСАБЛІВЫХ ВЫПАДКАХ

**25.** Кіроўцы транспартных сродкаў аператыўнага прызначэння з уключанымі маячкамі сіняга або сіняга і чырвонага колераў могуць адыходзіць ад патрабаванняў святлафораў, дарожных знакаў і дарожнай разметкі, а таксама падпункта 9.8 пункта 9, падпункта 10.4 пункта 10, раздзела 9 (акрамя пунктаў 56 і 57), раздзелаў 10 – 15, 17 – 19 дадзеных Правіл пры ўмове забеспячэння бяспекі дарожнага руху.

Гэтым жа правам карыстаюцца кіроўцы транспартных сродкаў, якія суправаджаюцца транспартнымі сродкамі аператыўнага прызначэння з уключанымі маячкамі сіняга або сіняга і чырвонага колераў.

Правы і абавязкі кіроўцаў і іншых асоб пры ажыццяўленні дзяржаўнай аховы вызначаюцца дадзенымі Правіламі з улікам асаблівасцей, прадугледжаных заканадаўчымі актамі ў галіне дзяржаўнай аховы.

**26.** Пры набліжэнні транспартнага сродку аператыўнага прызначэння з уключаным маячком сіняга колеру кіроўцы незалежна ад напрамку іх руху павінны саступіць дарогу і забяспечыць бесперашкодны праезд дадзенаму транспартнаму сродку аператыўнага прызначэння, а ў выпадку яго руху ў арганізаванай транспартнай калоне — і іншым транспартным сродкам, якія рухаюцца ў гэтай калоне.

Пры набліжэнні транспартнага сродку аператыўнага прызначэння з уключанымі маячкамі сіняга і чырвонага колераў кіроўцы спадарожных, а пры адсутнасці раздзяляльнай паласы таксама і кіроўцы сустрэчных транспартных сродкаў павінны спыніцца на ўзбочыне, а пры яе адсутнасці — заняць крайняе правае становішча ў правай паласе руху і спыніцца.

Пачынаць рух дазваляецца пасля праезду транспартнага сродку аператыўнага прызначэння з уключанымі маячкамі сіня-

га і чырвонага колераў. Пры руху арганізаванай транспартнай калоны ў суправаджэнні транспартнага сродку аператыўнага прызначэння з уключанымі маячкамі сіняга і чырвонага колераў пачынаць рух дазваляецца толькі пасля праезду транспартнага сродку аператыўнага прызначэння з уключаным маячком сіняга колеру (транспартнага сродку з апазнавальным знакам «Калона»), які замыкае дадзеную калону.

**27.** Кіроўцам забараняецца выконваць абгон і апярэджанне транспартных сродкаў аператыўнага прызначэння з уключанымі маячкамі сіняга або сіняга і чырвонага колераў, рухацца па суседніх палосах руху з іх хуткасцю руху, а таксама займаць месца ў арганізаванай транспартнай калоне або перасякаць яе.

**28.** Набліжаючыся да транспартнага сродку аператыўнага прызначэння, які стаіць, з уключаным:

**28.1.** маячком сіняга колеру, кіроўца павінен знізіць хуткасць руху, каб мець магчымасць неадкладна спыніцца ў выпадку неабходнасці;

**28.2.** маячком чырвонага колеру, кіроўца павінен спыніцца, не даязджаючы да транспартнага сродку аператыўнага прызначэння. Працягнуць рух можна пасля дазволу рэгуліроўшчыка або выключэння маячка чырвонага колеру.

**29.** Для прыцягнення ўвагі ўдзельнікаў дарожнага руху кіроўцамі транспартных сродкаў аператыўнага прызначэння можа падавацца спецыяльны гукавы сігнал.

**30.** Кіроўцы транспартных сродкаў дарожна-эксплуатацыйнай службы, абсталяваных маячком аранжавага колеру, пры яго ўключэнні падчас выканання работ на дарозе могуць адыходзіць ад патрабаванняў дарожных знакаў і дарожнай разметкі, а таксама падпункта 9.8 пункта 9, пунктаў 78 – 80, 82 і падпунктаў 131.1 – 131.5 пункта 131 дадзеных Правіл пры ўмове забеспячэння бяспекі дарожнага руху. Удзельнікі дарожнага руху не павінны перашкаджаць іх працы.

Маячок аранжавага колеру, усталяваны на іншых транспартных сродках і самаходных машынах, не дае перавагі ў руху і служыць для прыцягнення ўвагі і папярэджання ўдзельнікаў дарожнага руху аб магчымай небяспецы.

**31.** Кіроўца, які з'яўляецца ўдзельнікам дарожна-транспартнага здарэння, абавязаны:

**31.1.** неадкладна спыніцца і не прымаць мер па змяненні становішча транспартнага сродку, пры ўдзеле якога здзейснена дарожна-транспартнае здарэнне, уключыць аварыйную светлавую сігналізацыю і выставіць знак аварыйнага прыпынку з выка-

наннем палажэнняў раздзела 8 дадзеных Правіл, заставацца на месцы дарожна-транспартнага здарэння па магчымасці паза праезнай часткай дарогі;

**31.2.** прыняць меры па аказанні неабходнай дапамогі пацярпеламу (пацярпелым), выклікаць хуткую медыцынскую дапамогу, а калі гэта немагчыма, прыняць меры па дастаўцы пацярпелага (пацярпелых) у бліжэйшую арганізацыю аховы здароўя на адным або некалькіх спадарожных транспартных сродках (пры іх адсутнасці даставіць пацярпелага (пацярпелых) на транспартным сродку, пры ўдзеле якога здзейснена дарожна-транспартнае здарэнне).

Кіроўца, які даставіў пацярпелага (пацярпелых) у арганізацыю аховы здароўя, абавязаны паведаміць у гэтай арганізацыі сваё прозвішча, рэгістрацыйны знак транспартнага сродку, прад'явіўшы пасведчанне кіроўцы ці іншы дакумент, які сведчыць асобу, і пасведчанне аб рэгістрацыі транспартнага сродку (пашпарт транспартнага сродку або шасі транспартнага сродку), і вярнуцца да месца дарожна-транспартнага здарэння;

**31.3.** у выпадку неабходнасці дастаўкі пацярпелага (пацярпелых) у арганізацыю аховы здароўя на транспартным сродку, пры ўдзеле якога здзейснена дарожна-транспартнае здарэнне, папярэдне зафіксаваць у прысутнасці відавочцаў становішча транспартнага сродку, сляды і прадметы, якія адносяцца да дарожна-транспартнага здарэння;

**31.4.** запісаць прозвішчы і адрасы відавочцаў дарожна-транспартнага здарэння, паведаміць аб здарэнні ў міліцыю і чакаць прыбыцця супрацоўнікаў ДАІ, за выключэннем выпадку, прадугледжанага часткай другой дадзенага падпункта.

Кіроўца ў выпадку дарожна-транспартнага здарэння мае права не паведамляць пра яго ў ДАІ пры наяўнасці адначасова наступных абставін:

у выніку дарожна-транспартнага здарэння шкода нанесена толькі маёмасці яго ўдзельнікаў;

дарожна-транспартнае здарэнне адбылося з удзелам двух транспартных сродкаў;

асобы, якія кіравалі транспартнымі сродкамі, маюць права на кіраванне транспартным сродкам адпаведнай катэгорыі;

у дачыненні да транспартных сродкаў маюцца дзеючыя дагаворы абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці іх уладальнікаў;

абставіны прычынення шкоды ў сувязі з пашкоджаннем маёмасці ў выніку дарожна-транспартнага здарэння, характар і пералік бачных пашкоджанняў транспартных сродкаў не

выклікаюць рознагалоссяў ва ўдзельнікаў дадзенага здарэння і зафіксаваныя ў паведамленнях аб дарожна-транспартным здарэнні, бланкі якіх запоўненыя асобамі, якія кіравалі транспартнымі сродкамі, у адпаведнасці з Палажэннем аб страхавой дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 г. № 530 «Аб страхавой дзейнасці» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 143,1/7866);

асобы, якія кіравалі транспартнымі сродкамі, не маюць прэтэнзій да стану адзін аднаго (дадзеныя асобы не знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення або ў стане, выкліканым ужываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў, у выніку дарожна-транспартнага здарэння не нанесена шкода жыццю або здароўю);

шкода, нанесеная маёмасці кожнага з удзельнікаў дарожна-транспартнага здарэння, ацэньваецца імі ў памеры да 200 еўра па вызначаным Нацыянальным банкам афіцыйным курсе беларускага рубля ў адносінах да еўра;

**31.5.** да прыбыцця супрацоўнікаў ДАІ прыняць усе магчымыя меры па захаванні слядоў і прадметаў, якія адносяцца да дарожна-транспартнага здарэння, іх абгароджванні і арганізацыі аб'езду месца дарожна-транспартнага здарэння.

**32.** Удзельніку дарожнага руху, які з'яўляецца ўдзельнікам дарожна-транспартнага здарэння, забараняецца:

**32.1.** пакідаць месца дарожна-транспартнага здарэння, перамяшчаць транспартны сродак і прадметы, якія маюць дачыненне да дарожна-транспартнага здарэння, акрамя выпадкаў, названых у падпункце 31.3 і частцы другой падпункта 31.4 пункта 31 дадзеных Правіл;

**32.2.** ужываць алкагольныя, слабаалкагольныя напоі, піва, наркатычныя сродкі, псіхатропныя, таксічныя або іншыя адурманьваючыя рэчывы да праходжання ў вызначаным парадку праверкі (агляду) на прадмет вызначэння стану алкагольнага ап'янення або стану, выкліканага ўжываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў;

**32.3.** адкрываць тахограф без дазволу супрацоўніка ДАІ.

**33.** Удзельнікі дарожна-транспартнага здарэння, не названыя ў пункце 31 дадзеных Правіл, і яго відавочцы абавязаны:

**33.1.** аказаць магчымую дапамогу пацярпеламу (пацярпелым);

**33.2.** запісаць прозвішчы і адрасы іншых відавочцаў дарожна-транспартнага здарэння, а таксама рэгістрацыйныя знакі транспартных сродкаў, якія знаходзіліся пры здзяйсненні дарожна-транспартнага здарэння;

**33.3.** паведаміць у міліцыю аб дарожна-транспартным здарэнні;

**33.4.** знаходзіцца па магчымасці на месцы дарожна-транспартнага здарэння па-за праезнай часткай дарогі да прыбыцця супрацоўнікаў ДАІ, пасля чаго паведаміць ім інфармацыю аб дарожна-транспартным здарэнні, відавочцамі якога яны сталі.

**34.** У выпадку выяўлення або стварэння на дарозе перашкоды, якая стварае небяспеку для руху, удзельнікі дарожнага руху абавязаны:

**34.1.** прыняць меры па яе ліквідацыі;

**34.2.** пры немагчымасці ліквідацыі перашкоды пазначыць яе ў адпаведнасці з дадзенымі Правіламі ці іншым спосабам, які забяспечвае бяспеку дарожнага руху, пасля чаго паведаміць аб перашкодзе ў міліцыю або дарожна-эксплуатацыйную ці камунальную службу.

## Раздзел 7
## СІГНАЛЫ РЭГУЛІРОЎШЧЫКА І СВЯТЛАФОРАЎ

**35.** Патрабаванне рэгуліроўшчыка аб спыненні транспартнага сродку выражаецца шляхам падачы сігналу жазлом ці жэстам рукі, а таксама з дапамогай гукаўзмацняльніка. Для дадатковага прыцягнення ўвагі ўдзельнікаў дарожнага руху рэгуліроўшчык можа падаваць сігнал свістком. Кіроўца павінен спыніцца ў паказаным яму рэгуліроўшчыкам месцы.

Сігналы рэгуліроўшчыка абавязковыя для выканання ўдзельнікамі дарожнага руху, нават калі яны не адпавядаюць патрабаванням сігналаў святлафораў і іншых тэхнічных сродкаў арганізацыі дарожнага руху.

**36.** Сігналы рэгуліроўшчыка маюць наступныя значэнні:

**36.1.** рукі выцягнутыя ў бакі ці апушчаныя:

**36.1.1.** з левага і правага боку дазволена: трамваю — рух прама, іншым транспартным сродкам — рух прама і направа, пешаходам — пераходзіць праезную частку дарогі;

**36.1.2.** з боку грудзей і спіны: рух усіх транспартных сродкаў і пешаходаў забаронены;

**36.2.** правая рука выцягнутая наперад:

**36.2.1.** з левага боку дазволена: трамваю — рух налева, іншым транспартным сродкам — рух ва ўсіх кірунках;

**36.2.2.** з боку грудзей: усім транспартным сродкам дазволены рух толькі направа;

**36.2.3.** з правага боку і спіны: рух усіх транспартных сродкаў забаронены, пешаходам дазволена пераходзіць праезную частку дарогі за спінай рэгуліроўшчыка;

**36.3.** рука паднятая ўверх: рух усіх транспартных сродкаў і пешаходаў забаронены ва ўсіх кірунках, акрамя выпадкаў, прадугледжаных падпунктамі 50.1 і 50.2 пункта 50 дадзеных Правіл.

**37.** Рэгуліроўшчык можа падаваць зразумелыя ўдзельнікам дарожнага руху сігналы, не названыя ў пункце 36 дадзеных Правіл.

**38.** Святлафоры адносяцца да тэхнічных сродкаў арганізацыі дарожнага руху і прымяняюцца для рэгулявання чарговасці пропуску транспартных сродкаў і пешаходаў, а таксама для пазначэння небяспечных участкаў дарог. Святлафоры падзяляюцца на транспартныя і пешаходныя.

Са святлафорамі можа прымяняцца дадатковае абсталяванне: экраны, інфармацыйныя секцыі, інфармацыйныя і пазначальныя таблічкі, лічбавыя табло, кнопкі ўключэння дазваляльнага сігналу для пешаходаў (табло выклікальныя пешаходныя). У святлафорах прымяняюцца светлавыя сігналы зялёнага, жоўтага, чырвонага і бела-месяцовага колераў.

У залежнасці ад прызначэння сігналы святлафораў могуць быць круглымі, у выглядзе стрэлкі (стрэлак), сілуэта пешахода, веласіпеда, трамвая і Х-падобныя.

Святлафоры з круглымі сігналамі могуць мець адну ці дзве дадатковыя секцыі з сігналамі ў выглядзе зялёнай стрэлкі (стрэлак), якія размяшчаюцца на ўзроўні зялёнага круглага сігналу.

Святлафоры з Х-падобным чырвоным сігналам, жоўтым сігналам у выглядзе стрэлкі (пры яго наяўнасці), скіраванай направа, і зялёным сігналам у выглядзе стрэлкі, скіраванай уніз, называюцца рэверсіўнымі і прызначаны для рэгулявання руху транспартных сродкаў па палосах праезнай часткі дарогі, па якіх напрамак руху можа змяняцца на процілеглы.

**39.** Круглыя сігналы святлафора маюць наступныя значэнні:

**39.1.** зялёны сігнал дазваляе рух;

**39.2.** зялёны перарывісты сігнал дазваляе рух і інфармуе, што час яго дзеяння заканчваецца і неўзабаве будзе ўключаны забараняльны сігнал;

**39.3.** жоўты сігнал папярэджвае аб маючай адбыцца змене сігналаў і забараняе рух, акрамя выпадкаў, названых у падпунктах 50.1, 50.2 пункта 50 і пункце 106 дадзеных Правіл;

**39.4.** жоўты перарывісты сігнал дазваляе рух і інфармуе аб наяўнасці нерэгулюемага скрыжавання ці пешаходнага пераходу, папярэджвае аб магчымай небяспецы для руху;

**39.5.** чырвоны сігнал, у тым ліку перарывісты (два міганні чырвонага сігналу), забараняе рух;

**39.6.** спалучэнне чырвонага і жоўтага сігналаў забараняе рух і інфармуе аб маючым адбыцца ўключэнні зялёнага сігналу.

**40.** Сігналы святлафора, выкананыя ў выглядзе стрэлак чырвонага, жоўтага і зялёнага колераў, маюць тое ж значэнне, што і круглыя сігналы адпаведнага колеру. Рух ажыццяўляецца пры ўключэнні дазваляльнага сігналу святлафора толькі ў напрамках, паказаных стрэлкамі. Замест чырвоных, жоўтых і зялёных стрэлак у тым жа значэнні могуць выкарыстоўвацца круглыя чырвоныя, жоўтыя і зялёныя сігналы з нанесенымі на іх чорнымі контурнымі стрэлкамі.

При гэтым стрэлка, якая дазваляе паварот налева, дазваляе і разварот, калі гэта не забаронена адпаведным дарожным знакам. Такое ж значэнне мае зялёная стрэлка ў дадатковай секцыі. Выключаны сігнал дадатковай секцыі азначае забарону руху ў напрамку, які рэгулюецца гэтай секцыяй.

**41.** Калі на асноўны зялёны сігнал святлафора нанесена чорная контурная стрэлка (стрэлкі), то яна інфармуе кіроўцаў аб наяўнасці дадатковай секцыі святлафора і паказвае іншыя, чым сігнал дадатковай секцыі, дазволеныя напрамкі руху.

**42.** Калі сігнал святлафора выкананы ў выглядзе зялёнага або чырвонага сілуэта пешахода, то яго дзеянне распаўсюджваецца толькі на пешаходаў. Зялёны сігнал дазваляе, а чырвоны забараняе рух пешаходаў. Пры гэтым:

**42.1.** перарывісты зялёны сігнал пешаходнага святлафора забараняе выхад пешаходаў на праезную частку дарогі з тратуара або астраўка бяспекі, але дазваляе пешаходам, якія знаходзяцца на праезнай частцы, працягнуць рух у тым жа напрамку да астраўка бяспекі (пры яго наяўнасці) або завяршыць пераход праезнай часткі дарогі (пры адсутнасці астраўка бяспекі);

**42.2.** калі чырвоны сігнал пешаходнага святлафора заспеў пешахода на праезнай частцы дарогі, на якой адсутнічае астравок бяспекі, то пешаход павінен завяршыць пераход праезнай часткі дарогі;

**42.3.** калі чырвоны сігнал пешаходнага святлафора заспеў пешахода на праезнай частцы дарогі да астраўка бяспекі, то пешаход павінен працягнуць рух у тым жа кірунку да астраўка бяспекі і спыніцца на ім;

**42.4.** калі чырвоны сігнал пешаходнага святлафора заспеў пешахода на астраўку бяспекі, то пешаход павінен заставацца на ім да ўключэння дазваляльнага сігналу святлафора;

**42.5.** калі чырвоны сігнал пешаходнага святлафора заспеў пешахода на праезнай частцы дарогі пасля астраўка бяспекі, то пешаход павінен завяршыць пераход праезнай часткі дарогі;

**42.6.** для інфармавання пешаходаў аб тым, што ў перыяд дазволенага для іх руху па пешаходным пераходзе праз пераход могуць рухацца транспартныя сродкі, якія выконваюць на скрыжаванні правы і (або) левы паварот, дазвальяльны сігнал пешаходнага святлафора можа быць дапоўнены па перыметры кальцом жоўтага колеру;

**42.7.** для дадатковага інфармавання пешаходаў аб магчымасці перасячэння праезнай часткі дарогі светлавыя сігналы святлафораў могуць быць дапоўнены гукавым сігналам;

**42.8.** для інфармавання пешаходаў пра час чакання дазвальяльнага сігналу і (або) пра час, які застаўся для бяспечнага завяршэння пераходу праезнай часткі дарогі, сумесна з пешаходнымі святлафорамі могуць прымяняцца лічбавыя табло;

**42.9.** пры адсутнасці на пешаходным пераходзе пешаходнага святлафора пешаходы павінны кіравацца сігналамі транспартнага святлафора.

**43.** Калі на сігналы святлафора нанесены сілуэты веласіпеда або пад святлафорам устаноўлена пазначальная таблічка белага колеру з чорным сілуэтам веласіпеда, дзеянне сігналаў такога святлафора распаўсюджваецца толькі на веласіпедыстаў. Значэнні сігналаў святлафора для іх аналагічныя значэнню круглых сігналаў, названых у пункце 39 дадзеных Правіл.

**44.** Чырвоны сігнал рэверсіўнага святлафора забараняе, а зялёны дазваляе рух.

Пры выключаных сігналах рэверсіўнага святлафора, які размешчаны над паласой руху, пазначанай з абодвух бакоў гарызантальнай дарожнай разметкай 1.9, уезд на гэтую паласу забаронены.

Асноўныя сігналы рэверсіўнага святлафора могуць быць дапоўнены жоўтым сігналам у выглядзе стрэлкі, нахіленай па дыяганалі ўніз направа, уключэнне якой інфармуе аб маючай адбыцца змене сігналу і неабходнасці перастроіцца на паласу руху справа.

**45.** Для рэгулявання руху трамваяў, а таксама іншых маршрутных транспартных сродкаў, якія рухаюцца па вылучанай для іх паласе руху, могуць прымяняцца святлафоры:

аднакаляровай сігналізацыі з чатырма круглымі сігналамі бела-месяцовага колеру, размешчанымі ў выглядзе літары «Т», пры гэтым рух дазваляецца толькі пры ўключэнні адначасова ніжняга сігналу і аднаго або некалькіх верхніх, з якіх левы азначае рух налева (на разварот для маршрутных транспартных сродкаў, акрамя трамвая), сярэдні — прама, правы — направа. Калі ўключаны толькі тры верхнія сігналы, рух забаронены;

двухколернай сігналізацыі з вертыкальным або гарызантальным размяшчэннем сігналаў, адзін з якіх выкананы ў выглядзе чырвонага сілуэта трамвая на чорным фоне, а другі — у выглядзе стрэлкі бела-месяцовага колеру на чорным фоне (толькі для рэгулявання руху трамваяў). Бела-месяцовы сігнал такога святлафора дазваляе рух трамваяў у кірунку, які паказвае стрэлка, чырвоны сігнал забараняе рух трамваяў у гэтым кірунку. Святлафоры могуць быць дапоўнены таблічкай белага колеру з чорным сілуэтам трамвая.

Кіроўцы трамваяў і іншых маршрутных транспартных сродкаў, якія рухаюцца па вылучанай для іх паласе руху, павінны кіравацца сігналамі святлафораў, названымі ў частцы першай гэтага пункта, у выпадках прымянення гэтых святлафораў сумесна з іншымі транспартнымі святлафорамі.

**46.** Для рэгулявання руху на чыгуначных пераездах прымяняюцца святлафоры з двума чырвонымі сігналамі або адным бела-месяцовым і двума чырвонымі сігналамі, якія маюць наступныя значэнні:

**46.1.** перарывістыя чырвоныя сігналы забараняюць рух транспартных сродкаў праз чыгуначны пераезд. Адначасова з гэтымі сігналамі павінен быць уключаны гукавы сігнал, які дадаткова інфармуе ўдзельнікаў дарожнага руху аб забароне руху праз чыгуначны пераезд;

**46.2.** перарывісты бела-месяцовы сігнал інфармуе аб спраўнасці сігналізацыі і не забараняе рух транспартных сродкаў;

**46.3.** выключаныя чырвоны і бела-месяцовы сігналы азначаюць, што сігналізацыя не працуе ці няспраўная. У гэтым выпадку дазваляецца рух транспартных сродкаў пасля таго, як кіроўца пераканаецца ў адсутнасці чыгуначнага транспартнага сродку.

**47.** Для пазначэння нерэгулюемых скрыжаванняў і пешаходных пераходаў могуць прымяняцца святлафоры з адным або двума перарывістымі жоўтымі сігналамі.

**48.** На скрыжаванні пры забараняльным сігнале рэгуліроўшчыка або святлафора кіроўцы павінны спыніцца перад дарожным знакам «Стоп-лінія» (лініяй гарызантальнай дарожнай разметкі 1.12), а пры яе адсутнасці:

**48.1.** перад святлафорам, кіруючыся пунктам 106 дадзеных Правіл;

**48.2.** перад пешаходным пераходам — пры адсутнасці святлафора;

**48.3.** перад бліжэйшым да кіроўцы краем тратуара — пры адсутнасці святлафора і пешаходнага пераходу;

**48.4.** перад краем праезнай часткі дарогі, што перасякаецца, — пры адсутнасці святлафора, пешаходнага пераходу і тратуара.

**49.** Па-за скрыжаваннем пры забараняльным сігнале рэгуліроўшчыка або святлафора (акрамя рэверсіўнага) кіроўцы павінны спыніцца перад дарожным знакам «Стоп-лінія» (лініяй гарызантальнай дарожнай разметкі 1.12), а пры яго адсутнасці:

**49.1.** на рэгулюемым пешаходным пераходзе — перад святлафорам, а пры яго адсутнасці — перад пешаходным пераходам;

**49.2.** перад чыгуначным пераездам — у адпаведнасці з пунктам 129 дадзеных Правіл;

**49.3.** у іншых месцах — перад рэгуліроўшчыкам або святлафорам, не ствараючы перашкоды і небяспекі для дарожнага руху.

**50.** Пры ўзняцці рэгуліроўшчыкам рукі ўверх або ўключэнні жоўтага сігналу святлафора:

**50.1.** кіроўцам, якія не могуць спыніцца, не звяртаючыся да экстраннага тармажэння, у месцах, вызначаных пунктамі 48 і 49 дадзеных Правіл, дазваляецца далейшы рух;

**50.2.** пешаходам, якія знаходзяцца на праезнай частцы дарогі, дазваляецца працягнуць рух у тым жа кірунку да астраўка бяспекі (пры яго наяўнасці) або завяршыць пераход праезнай часткі дарогі (пры адсутнасці астраўка бяспекі);

**50.3.** пешаходам забараняецца:

**50.3.1.** выходзіць на праезную частку дарогі;

**50.3.2.** пакідаць астравок бяспекі.

## Раздзел 8
## ПРЫМЯНЕННЕ АВАРЫЙНАЙ СВЕТЛАВОЙ СІГНАЛІЗАЦЫІ, ЗНАКА АВАРЫЙНАГА ПРЫПЫНКУ, ЛІХТАРА З ПЕРАРЫВІСТЫМ ЧЫРВОНЫМ СВЯТЛОМ

**51.** Аварыйная светлавая сігналізацыя павінна быць уключана ў выпадках:

**51.1.** дарожна-транспартнага здарэння;

**51.2.** вымушанага спынення транспартнага сродку на праезнай частцы дарогі і ў месцах, дзе прыпынак забаронены;

**51.3.** асляплення кіроўцы святлом фар;

**51.4.** буксіроўкі механічнага транспартнага сродку (калі не вызначана іншае, далей — буксіроўка) — на механічным транспартным сродку, які буксіруецца;

**51.5.** прыпынку, стаянкі транспартнага сродку ў цёмны час сутак на неасветленых участках дарогі (акрамя жылых зон) і (або) пры недастатковай бачнасці дарогі пры няспраўных габарытных і стаяначных агнях;

**51.6.** руху на транспартным сродку з тэхнічнай няспраўнасцю, названай у дадатку 4 да дадзеных Правіл, калі рух не забаронены дадзенымі Правіламі;

**51.7.** папярэджання ўдзельнікаў дарожнага руху аб небяспецы для руху;

**51.8.** пасадкі (высадкі) груп дзяцей у аўтобусы, якія перавозяць іх, — на аўтобусах;

**51.9.** наближэння трамвая да зоны пункта прыпынку трамвая, пазначанай дарожнымі знакамі «Пункт прыпынку трамвая», «Месца прыпынку трамвая» і (або) гарызантальнай дарожнай разметкай 1.17.2, і ў час знаходжання яго ў гэтай зоне — на трамваях. На трамваях, не абсталяваных аварыйнай светлавой сігналізацыяй, павінен быць уключаны светлавы паказальнік правага павароту.

**52.** Аварыйную светлавую сігналізацыю рэкамендуецца ўключаць у выпадку руху транспартнага сродку заднім ходам.

**53.** Пасля ўключэння аварыйнай светлавой сігналізацыі, а таксама пры яе адсутнасці або няспраўнасці павінен быць неадкладна выстаўлены знак аварыйнага прыпынку (у цёмны час сутак у дадатак да знака аварыйнага прыпынку можа быць выстаўлены ліхтар з перарывістым чырвоным святлом):

**53.1.** пры дарожна-транспартным здарэнні;

**53.2.** пры вымушаным прыпынку транспартнага сродку на праезнай частцы дарогі і ў месцах, дзе прыпынак забаронены, за выключэннем спынення руху транспартнага сродку ў сувязі з вялікай колькасцю іншых транспартных сродкаў, што спыніліся на праезнай частцы дарогі (далей — затор);

**53.3.** у выпадку прыпынку, стаянкі транспартнага сродку ў цёмны час сутак на неасветленых участках дарогі (акрамя жылых зон) і (або) пры недастатковай бачнасці дарогі пры няспраўных габарытных і стаяначных агнях.

**54.** Знак аварыйнага прыпынку і ліхтар з перарывістым чырвоным святлом усталёўваюцца на адлегласці, якая забяспечвае ў канкрэтных дарожна-транспартных абставінах своечасовае папярэджанне іншых кіроўцаў аб небяспецы, але не менш за 15 метраў ад транспартнага сродку ў населеных пунктах і не менш за 40 метраў — па-за населенымі пунктамі.

**55.** Пры адсутнасці або няспраўнасці аварыйнай светлавой сігналізацыі на механічным транспартным сродку, які буксіруецца, або транспартным сродку, які рухаецца з тэхнічнай няспраўнасцю, на яго задняй частцы злева павінен быць замацаваны знак аварыйнага прыпынку.

# Раздзел 9
# МАНЕЎРАВАННЕ

**56.** Перад пачаткам руху, перастраеннем, паваротам налева ці направа, разваротам і спыненнем кіроўца абавязаны падаваць сігнал светлавымі паказальнікамі павароту адпаведнага кірунку, а калі яны адсутнічаюць або няспраўныя або ўключана аварыйная светлавая сігналізацыя, — рукой, упэўніўшыся, што яго дзеянні будуць бяспечнымі і не створаць перашкоды для дарожнага руху. Пры гэтым:

**56.1.** сігналу левага светлавога паказальніка павароту адпавядае левая рука, выцягнутая ўбок, ці правая рука, выцягнутая ўбок і сагнутая ў локці пад прамым вуглом уверх;

**56.2.** сігналу правага светлавога паказальніка павароту адпавядае правая рука, выцягнутая ўбок, ці левая рука, выцягнутая ўбок і сагнутая ў локці пад прамым вуглом уверх;

**56.3.** сігнал тармажэння падаецца паднятай уверх левай ці правай рукой.

**57.** Падача сігналу светлавымі паказальнікамі павароту або рукой павінна ажыццяўляцца да пачатку манеўравання (за выключэннем выпадкаў руху заднім ходам) такім чынам, каб іншыя ўдзельнікі дарожнага руху мелі магчымасць бяспечнага працягу руху, і спыняцца неадкладна пасля завяршэння манеўравання (падача сігналу рукой можа быць скончана непасрэдна перад манеўраваннем). Пры гэтым:

**57.1.** падача сігналу не дае кіроўцу перавагі;

**57.2.** сігнал не павінен падавацца, калі ён можа ўвесці ў зман іншых удзельнікаў дарожнага руху.

**58.** Пасля прыпынку або стаянкі кіроўца транспартнага сродку, які пачынае рух, абавязаны саступіць дарогу транспартным сродкам, якія рухаюцца, акрамя выпадку, прадугледжанага пунктам 125 дадзеных Правіл.

Пры з'ездзе з праезнай часткі дарогі кіроўца абавязаны саступіць дарогу пешаходам, коннікам і веласіпедыстам, шлях руху якіх ён перасякае.

**59.** Пры перастраенні кіроўца павінен саступіць дарогу транспартным сродкам, якія рухаюцца ў спадарожным напрамку, без змены іх напрамку руху. Пры адначасовым перастраенні транспартных сродкаў, якія рухаюцца ў спадарожным напрамку, кіроўца павінен саступіць дарогу транспартнаму сродку, які знаходзіцца справа.

**60.** Перастраенне транспартных сродкаў на скрыжаванні забараняецца, акрамя скрыжавання, на якім арганізаваны кругавы рух.

**61.** Перастройвацца на суседнюю паласу руху на дарозе з дзвюма і больш палосамі руху ў адным кірунку, пазначанымі гарызантальнай дарожнай разметкай, калі гэтыя палосы раўнамерна занятыя транспартнымі сродкамі, якія рухаюцца, дазваляецца толькі для павароту налева ці направа, развароту, прыпынку або аб'езду перашкоды.

**62.** Калі на дарозе, якая мае дзве і больш паласы руху ў адным напрамку, з-за перашкоды на адной з іх утварыўся затор, кіроўца кожнага транспартнага сродку, які рухаецца па суседняй паласе руху, павінен даць магчымасць перастроіцца на яго паласу аднаму з транспартных сродкаў, якія стаяць у заторы.

**63.** Перад разваротам, паваротам налева ці направа кіроўца абавязаны, не ствараючы перашкоды і небяспекі для руху іншых удзельнікаў дарожнага руху, заняць адпаведнае крайняе становішча на праезнай частцы дарогі, прызначанай для руху ў дадзеным кірунку, акрамя выпадкаў, калі паварот пры ўездзе на скрыжаванне і выездзе з яго здзяйсняецца ў тых месцах, дзе арганізаваны кругавы рух, а таксама ў месцах, дзе напрамак руху па праезнай частцы дарогі (скрыжаванні) вызначаны дарожнымі знакамі і (або) гарызантальнай дарожнай разметкай.

**64.** Пры наяўнасці трамвайных пуцей спадарожнага напрамку, размешчаных злева на адным узроўні з праезнай часткай дарогі:

**64.1.** паварот налева або разварот павінен выконвацца з гэтых пуцей, калі дарожнымі знакамі «Напрамкі руху па палосах», «Напрамак руху па паласе» не вызначаны іншы парадак руху;

**64.2.** калі выезд на трамвайныя пуці створыць перашкоду для руху трамвая, кіроўца павінен застацца на паласе руху, не выязджаючы на трамвайныя пуці, у чаканні праезду спадарожнага трамвая і сустрэчных транспартных сродкаў;

**64.3.** у выпадку стварэння перашкоды для руху трамвая трамвайны пуць па магчымасці павінен быць вызвалены. Кіроўцы транспартных сродкаў, якія рухаюцца побач у спадарожным напрамку, павінны даць магчымасць для гэтага.

**65.** Паварот налева або направа павінен ажыццяўляцца такім чынам, каб пры выездзе з перасячэння праезных частак дарог транспартны сродак не апынуўся на сустрэчнай паласе руху:

**65.1.** пры павароце налева транспартны сродак павінен рухацца як мага бліжэй да цэнтра скрыжавання, калі дарожнымі знакамі (гарызантальнай дарожнай разметкай) не вызначаны іншы парадак руху, пры гэтым сустрэчны транспартны сродак, які паварочвае налева, павінен знаходзіцца справа;

**65.2.** пры павароце направа транспартны сродак павінен рухацца бліжэй да правага краю праезнай часткі дарогі, калі дарожнымі знакамі (гарызантальнай дарожнай разметкай) не вызначаны іншы парадак руху.

**66.** Калі транспартны сродак з-за сваіх габарытаў або па іншых прычынах не можа выканаць разварот, паварот налева або направа з выкананнем патрабаванняў пунктаў 63, 65 і 77 дадзеных Правіл, дапускаецца ажыццяўляць яго з адступленнем ад гэтых патрабаванняў, калі гэта не створыць перашкоды для руху іншых удзельнікаў дарожнага руху.

**67.** Перад паваротам налева ці разваротам па-за скрыжаваннем кіроўца транспартнага сродку абавязаны саступіць дарогу сустрэчным транспартным сродкам і спадарожнаму трамваю.

**68.** Калі для развароту па-за скрыжаваннем шырыня праезнай часткі дарогі недастатковая для яго выканання з крайняга левага становішча, разварот дапускаецца ажыццяўляць ад правага краю праезнай часткі дарогі або з правай па ходзе руху ўзбочыны. Пры гэтым кіроўца павінен саступіць дарогу спадарожным і сустрэчным транспартным сродкам.

**69.** У выпадках, калі траекторыі руху транспартных сродкаў перасякаюцца, а чарговасць праезду не вызначана дадзенымі Правіламі, дарогу абавязаны саступіць кіроўца, да якога транспартны сродак набліжаецца справа.

**70.** Пры наяўнасці паласы тармажэння кіроўца, які мае намер павярнуць, павінен своечасова перастроіцца на гэтую паласу і зніжаць хуткасць руху толькі на ёй.

**71.** Пры наяўнасці ў месцы ўезду на дарогу паласы разгону кіроўца павінен рухацца па ёй і перастройвацца на суседнюю паласу руху, саступаючы дарогу транспартным сродкам, якія рухаюцца па гэтай дарозе.

**72.** Разварот забараняецца:

**72.1.** на пешаходных пераходах і бліжэй за 15 метраў ад іх з абодвух бакоў, акрамя выпадку дазволенага развароту на скрыжаванні;

**72.2.** у месцах, дзе бачнасць дарогі хоць бы ў адным кірунку руху менш за 100 метраў;

**72.3.** на пунктах прыпынку маршрутных транспартных сродкаў;

**72.4.** на мастах, пуцеправодах, эстакадах і пад імі;

**72.5.** на чыгуначных пераездах.

**73.** Рух транспартнага сродку заднім ходам дазваляецца пры ўмове, калі гэтыя дзеянні не створаць перашкоды для іншых удзельнікаў дарожнага руху і будзе забяспечана бяспека дарожнага руху. Пры неабходнасці кіроўца павінен звярнуцца

да дапамогі іншых асоб, якія б сігналізавалі аб сітуацыі, якая складваецца ззаду транспартнага сродку.

**74.** Рух заднім ходам забараняецца на скрыжаваннях (акрамя скрыжаванняў, размешчаных у жылых зонах) і ў месцах, дзе забаронены разварот згодна з пунктам 72 дадзеных Правіл.

## Раздзел 10
## РАЗМЯШЧЭННЕ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ НА ПРАЕЗНАЙ ЧАСТЦЫ ДАРОГІ

**75.** Колькасць палос руху для транспартных сродкаў (за выключэннем трамваяў і аднакалейных транспартных сродкаў) вызначаецца дарожнымі знакамі «Напрамкі руху па палосах», «Напрамак руху па паласе», «Напрамак руху па палосах» і (або) гарызантальнай дарожнай разметкай, а калі іх няма, то самімі кіроўцамі з улікам шырыні праезнай часткі дарогі, габарытаў транспартных сродкаў і неабходных бакавых інтэрвалаў паміж імі.

Пры адсутнасці дарожных знакаў і гарызантальнай дарожнай разметкі палова шырыні праезнай часткі дарогі, размешчаная злева, лічыцца яе сустрэчным бокам. На дарозе з аднабаковым рухам палова шырыні праезнай часткі дарогі, размешчаная злева, лічыцца левым бокам праезнай часткі.

**76.** На дарозе з двухбаковым рухам пры наяўнасці ў кірунку руху дзвюх і больш палос забараняецца выязджаць на сустрэчную паласу руху.

**77.** На дарозе з двухбаковым рухам, якая мае тры паласы руху, пазначаныя гарызантальнай дарожнай разметкай (за выключэннем гарызантальнай дарожнай разметкі 1.9), з якіх сярэдняя паласа руху выкарыстоўваецца для руху ў абодвух напрамках, перастройвацца на гэтую паласу дазваляецца толькі для абгону, аб'езду перашкоды, павароту налева або развароту, пры гэтым паварот налева або разварот павінен ажыццяўляцца з гэтай паласы. Перастройвацца на сустрэчную крайнюю левую паласу руху забараняецца.

**78.** Калі дарожнымі знакамі забаронены рух веласіпедыстаў, коннікаў і гужавых транспартных сродкаў, кіроўцы транспартных сродкаў павінны весці іх па магчымасці бліжэй да правага краю праезнай часткі дарогі (лініі гарызантальнай дарожнай разметкі 1.2, якая абазначае край праезнай часткі дарогі).

Калі такая забарона адсутнічае, то кіроўцы павінны весці транспартны сродак па магчымасці бліжэй да левага краю ў межах правай крайняй паласы руху.

**79.** Пры руху перастройвацца на іншую паласу руху можна толькі перад абгонам, апярэджаннем, аб'ездам перашкоды, паваротам налева ці направа, разваротам або спыненнем. Пры гэтым:

**79.1.** па-за населенымі пунктамі забараняецца займаць левыя палосы руху пры свабодных правых;

**79.2.** пры трох і больш палосах руху ў дадзеным кірунку займаць крайнюю левую паласу руху дазваляецца толькі тады, калі занятыя іншыя палосы руху, або для апярэджання, аб'езду перашкоды, павароту налева ці развароту, а таксама для прыпынку, стаянкі на левым баку дарогі з аднабаковым рухам у выпадку, названым у падпункце 138.3 пункта 138 дадзеных Правіл;

**79.3.** пры трох і больш палосах руху ў дадзеным кірунку забараняецца ажыццяўляць перастраенне на крайнюю правую паласу руху з мэтай апярэджання па ёй;

**79.4.** грузавыя аўтамабілі з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай больш за 3,5 тоны, колавыя трактары і самаходныя машыны могуць перастройвацца ў іншыя палосы руху лявей за другую паласу толькі для аб'езду перашкоды, павароту налева ці развароту, а таксама для прыпынку, стаянкі на левым баку дарогі з аднабаковым рухам у выпадку, названым у падпункце 138.3 пункта 138 дадзеных Правіл;

**79.5.** у населеных пунктах маршрутныя транспартныя сродкі павінны рухацца па вылучанай для іх паласе руху, а пры яе адсутнасці — па крайняй правай паласе руху. Перастройвацца на іншыя палосы руху можна толькі для аб'езду перашкоды, павароту налева ці развароту. Маршрутным транспартным сродкам дазваляецца апярэджанне транспартных сродкаў, якія рухаюцца па крайняй правай паласе руху з хуткасцю менш за 40 км/г, па другой справа паласе руху;

**79.6.** у выпадку ўзнікнення затору, які перашкаджае руху транспартных сродкаў аператыўнага прызначэння, кіроўцы павінны забяспечыць «калідор бяспекі», па якім дазваляецца праезд толькі названых транспартных сродкаў. Для гэтага транспартныя сродкі, якія знаходзяцца ў крайняй левай паласе руху, павінны заняць у гэтай паласе крайняе правае становішча.

**80.** Транспартныя сродкі, хуткасць руху якіх не павінна перавышаць 40 км/г або якія па тэхнічных прычынах не могуць развіваць больш высокую хуткасць руху ў параўнанні з названай, павінны рухацца па крайняй правай паласе руху, акрамя выпадкаў абгону, апярэджання, аб'езду перашкоды або перастраення перад паваротам або разваротам.

**81.** Рух па трамвайных пуцях спадарожнага напрамку, якія размешчаны злева на адным узроўні з праезнай часткай дарогі,

дазваляецца толькі для апярэджання (па-за пазначанымі і рэгулюемымі скрыжаваннямі), аб'езду перашкоды пры ўмове, што ўсе палосы руху ў дадзеным кірунку занятыя, а таксама для павароту налева ці развароту ў адпаведнасці з пунктам 64 дадзеных Правіл. Пры гэтым забараняецца выязджаць на трамвайныя пуці сустрэчнага напрамку і ажыццяўляць рух па іх, а таксама рух па трамвайных пуцях спадарожнага напрамку пры наяўнасці канструктыўна выдзеленай над праезнай часткай дарогі пасадачнай пляцоўкі, з якой ажыццяўляецца пасадка (высадка) пасажыраў у трамвай.

**82.** На дарозе, праезная частка якой падзелена на палосы руху лініямі гарызантальнай дарожнай разметкі, рух транспартных сродкаў павінен ажыццяўляцца строга па гэтых палосах. Наязджаць на перарывістыя лініі гарызантальнай дарожнай разметкі дазваляецца толькі пры манеўраванні.

**83.** Пры павароце на дарогу з рэверсіўным рухам кіроўца павінен кіраваць транспартным сродкам такім чынам, каб пры выездзе з перасячэння праезных частак дарог транспартны сродак заняў крайнюю правую паласу руху. Перастраенне можна ажыццяўляць толькі пасля таго, як кіроўца пераканаецца, што рух у дадзеным напрамку дазваляецца і па іншых палосах руху.

**84.** Забараняецца рух транспартных сродкаў па ўзбочынах, тратуарах, веласіпедных, пешаходных дарожках і дарожках для коннікаў, за выключэннем выпадкаў, названых у частцы другой пункта 26, пунктах 68, 138, 148, 152 і падпункце 160.2 пункта 160 дадзеных Правіл. Дапускаецца рух па названых элементах дарогі транспартных сродкаў дарожна-эксплуатацыйнай і камунальнай службаў, аўтамабіляў з нахіленай белай паласой на бартах, а таксама іншых транспартных сродкаў, якія абслугоўваюць гандлёвыя і іншыя арганізацыі, размешчаныя непасрэдна каля ўзбочын, тратуараў, веласіпедных, пешаходных дарожак, дарожак для коннікаў або пешаходных зон, пры адсутнасці іншых магчымасцяў пад'езда. Пры гэтым павінна быць забяспечана бяспека дарожнага руху.

**85.** Кіроўца абавязаны прытрымлівацца такой дыстанцыі да транспартнага сродку, які рухаецца наперадзе, якая дазволіла б пазбегнуць сутыкнення ў выпадку яго экстраннага тармажэння або спынення, і неабходны бакавы інтэрвал, які забяспечвае бяспеку дарожнага руху, з транспартнымі сродкамі, якія стаяць або рухаюцца па суседніх палосах руху.

**86.** На дарозе па-за населеным пунктам кіроўца транспартнага сродку даўжынёй больш за 10 метраў або хуткасць руху якога не павінна перавышаць 40 км/г, або якое па тэхнічных прычынах не можа развіваць больш высокую хуткасць руху ў

параўнанні з названай, абавязаны падтрымліваць паміж кіруемым ім транспартным сродкам і тым транспартным сродкам, які рухаецца наперадзе, дыстанцыю, якая дазваляе транспартным сродкам, што здзяйсняюць абгон, бесперашкодна перастройвацца на раней займаную паласу руху.

Гэта правіла не дзейнічае ў выпадках, калі кіроўцы названых транспартных сродкаў здзяйсняюць абгон або рыхтуюцца да яго, а таксама пры руху ў калоне з трох і больш транспартных сродкаў, пазначаных апазнавальнымі знакамі «Калона», і ў арганізаванай транспартнай калоне.

## Раздзел 11
## ХУТКАСЦЬ РУХУ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ

**87.** Пры выбары хуткасці руху кіроўца павінен улічваць абмежаванні хуткасці, вызначаныя пунктамі 88, 89 дадзеных Правіл і тэхнічнымі сродкамі арганізацыі дарожнага руху, а таксама інтэнсіўнасць руху, агляднасць дарогі, асаблівасці і стан транспартнага сродку і грузу, які ім перавозіцца, дарожныя, метэаралагічныя ўмовы і іншыя фактары, якія зніжаюць празрыстасць атмасферы і ўплываюць на бачнасць дарогі ў кірунку руху. Пры гэтым:

**87.1.** у цёмны час сутак і (або) пры недастатковай бачнасці дарогі хуткасць руху павінна дазваляць кіроўцу спыніць транспартны сродак у межах бачнасці дарогі ў напрамку руху;

**87.2.** пры ўзнікненні перашкоды або небяспекі для руху, якія кіроўца ў стане выявіць, ён абавязаны неадкладна прыняць меры да зніжэння хуткасці руху, аж да прыпынку транспартнага сродку.

**88.** У населеных пунктах дазваляецца рух транспартных сродкаў з хуткасцю не больш за 60 км/г, а тым, якія буксіруюць механічныя транспартныя сродкі, — не больш за 50 км/г, у жылых і пешаходных зонах, на прылеглых тэрыторыях — не больш за 20 км/г.

**89.** Па-за населенымі пунктамі дазваляецца рух з хуткасцю:

**89.1.** легкавым аўтамабілям і грузавым аўтамабілям з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай не больш за 3,5 тоны на аўтамагістралях — не больш за 110 км/г, на астатніх дарогах — не больш за 90 км/г;

**89.2.** аўтобусам і матацыклам — не больш за 90 км/г;

**89.3.** аўтобусам, легкавым і грузавым аўтамабілям пры іх руху з прычэпам, грузавым аўтамабілям з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай больш за 3,5 тоны на аўтамагістралях — не больш за 90 км/г, на астатніх дарогах — не больш за 70 км/г;

**89.4.** механічным транспартным сродкам, якімі кіруюць кіроўцы са стажам да двух гадоў, а таксама пры навучанні кіраванню механічным транспартным сродкам, калі транспартным сродкам кіруе асоба, якая навучаецца кіраванню, — не больш за 70 км/г;

**89.5.** грузавым аўтамабілям, якія перавозяць пасажыраў у кузаве, — не больш за 60 км/г;

**89.6.** транспартным сродкам, якія буксіруюць механічныя транспартныя сродкі, — не больш за 50 км/г;

**89.7.** транспартным сродкам, якія перавозяць небяспечныя грузы, цяжкавагавым і (або) буйнагабарытным транспартным сродкам — з хуткасцю, якая не перавышае хуткасць руху, вызначаную пры ўзгадненні ўмоў перавозкі.

**90.** З улікам дарожных умоў і забеспячэння бяспекі дарожнага руху дазволеная пунктамі 88 і 89 дадзеных Правіл хуткасць руху можа быць зменена (паніжана або павышана) прымяненнем дарожных знакаў «Абмежаванне максімальнай хуткасці».

Дзеянне дарожных знакаў «Абмежаванне максімальнай хуткасці» не распаўсюджваецца на названыя ў пункце 88 дадзеных Правіл транспартныя сродкі, якія буксіруюць механічныя транспартныя сродкі, і на транспартныя сродкі, пералічаныя ў падпунктах 89.4 – 89.7 пункта 89 дадзеных Правіл, калі паказаная на гэтых знаках велічыня хуткасці перавышае абмежаванне максімальнай хуткасці, вызначанай у дадзеных палажэннях.

**91.** Кіроўцу забараняецца:

**91.1.** перавышаць максімальную хуткасць руху, вызначаную тэхнічнай характарыстыкай транспартнага сродку;

**91.2.** перавышаць хуткасць руху, вызначаную дарожным знакам «Абмежаванне максімальнай хуткасці», пунктамі 88 і 89 дадзеных Правіл;

**91.3.** перавышаць хуткасць руху, паказаную на апазнавальным знаку «Абмежаванне хуткасці», устаноўленым на транспартным сродку ў адпаведнасці з падпунктам 201.5 пункта 201 дадзеных Правіл;

**91.4.** ствараць перашкоду для дарожнага руху, рухаючыся без вымушанай неабходнасці з малой хуткасцю, а таксама рухацца з меншай хуткасцю, чым устаноўлена дарожным знакам «Абмежаванне мінімальнай хуткасці»;

**91.5.** рэзка тармазіць, калі гэта не патрабуецца для прадухілення дарожна-транспартнага здарэння.

# Раздзел 12
# АБГОН, СУСТРЭЧНЫ РАЗ'ЕЗД

**92.** Да пачатку абгону кіроўца павінен пераканацца ў тым, што паласа руху, на якую ён мае намер выехаць, вольная і сваімі дзеяннямі ён не створыць пагрозу бяспецы дарожнага руху, не прымусіць удзельнікаў дарожнага руху змяніць напрамак і (або) знізіць хуткасць руху.

**93.** Кіроўцу забараняецца выконваць абгон:

**93.1.** калі кіроўца транспартнага сродку, які рухаецца наперадзе па той жа паласе руху, падаў сігнал левага павароту;

**93.2.** калі кіроўцы, якія рухаюцца ўслед за ім, пачалі абгон.

**94.** Аб'езд транспартнага сродку, кіроўца якога падаў сігнал павароту налева і распачаў выкананне манеўра, ажыццяўляецца з правага боку.

**95.** Кіроўца транспартнага сродку, які абганяюць, абавязаны з улікам дарожна-транспартных абставін рухацца бліжэй да правага краю праезнай часткі дарогі і не перашкаджаць абгону павелічэннем хуткасці руху або іншымі дзеяннямі.

**96.** Абгон забараняецца:

**96.1.** у зоне дзеяння дарожных знакаў «Абгон забаронены», «Абгон грузавым аўтамабілям забаронены», на паваротах дарогі, пазначаных дарожнымі знакамі «Небяспечны паварот», «Небяспечныя павароты», на пад'ёмах, пазначаных дарожным знакам «Круты пад'ём», а таксама пры наяўнасці дарожнай разметкі 1.1 у канцы пад'ёмаў і на іншых участках дарог з абмежаванай агляднасцю дарогі;

**96.2.** на пазначаных і рэгулюемых скрыжаваннях;

**96.3.** на пешаходных пераходах і бліжэй чым за 50 метраў ад іх у абодва бакі;

**96.4.** транспартнага сродку, які ажыццяўляе абгон або аб'езд перашкоды;

**96.5.** пры недастатковай бачнасці дарогі;

**96.6.** на мастах, пуцеправодах, эстакадах і пад імі;

**96.7.** на чыгуначных пераездах і бліжэй чым за 100 метраў перад імі.

**97.** Па-за населенымі пунктамі кіроўца ціхаходнага, цяжкавагавага і (або) буйнагабарытнага транспартнага сродку, а таксама транспартнага сродку, канструкцыя якога, груз, што перавозіцца, або тэхнічны стан ускладняюць яго абгон, павінен заняць становішча на дарозе як мага правей, а пры неабходнасці і спыніцца, каб прапусціць транспартныя сродкі, што сабраліся за ім.

**98.** Калі сустрэчны раз'езд транспартных сродкаў ускладнены, то кіроўца, на баку якога маецца перашкода для дарожнага руху, абавязаны саступіць дарогу.

**99.** На ўхілах, пазначаных дарожнымі знакамі «Круты спуск», «Круты пад'ём», пры наяўнасці перашкоды для дарожнага руху саступіць дарогу абавязаны кіроўца транспартнага сродку, які рухаецца на спуск.

## Раздзел 13
## ПРАЕЗД СКРЫЖАВАННЯЎ

**100.** Пры павароце налева ці направа кіроўца абавязаны саступіць дарогу пешаходам, якія пераходзяць (перасякаюць) праезную частку дарогі (па пешаходным пераходзе, а пры яго адсутнасці па лініі тратуараў або ўзбочын), на якую ён паварочвае, а таксама веласіпедыстам і коннікам, якія перасякаюць яе адпаведна па веласіпеднай дарожцы і дарожцы для коннікаў.

**101.** Забараняецца выязджаць на скрыжаванне, калі ўтварыўся затор, які вымусіць кіроўцу спыніцца.

**102.** Скрыжаванне, на якім чарговасць руху вызначаецца сігналамі рэгуліроўшчыка або святлафора, з'яўляецца рэгулюемым.

Пры жоўтым перарывістым сігнале святлафора, непрацуючых святлафорах і адсутнасці рэгуліроўшчыка скрыжаванне з'яўляецца нерэгулюемым і кіроўцы абавязаны кіравацца правіламі праезду нерэгулюемых скрыжаванняў і дарожнымі знакамі прыярытэту. Святлафоры лічацца непрацуючымі, калі адсутнічаюць сігналы адначасова ва ўсіх святлафорах дадзенага кірунку або сігналы супярэчаць адзін аднаму.

**103.** Пры павароце налева ці развароце па зялёным сігнале святлафора кіроўца транспартнага сродку, за выключэннем трамвая, абавязаны саступіць дарогу сустрэчным транспартным сродкам, якія рухаюцца прама або направа, і спадарожнаму трамваю. Такім жа правілам павінны кіравацца паміж сабой кіроўцы трамваяў.

**104.** Пры руху ў кірунку стрэлкі, уключанай у дадатковай секцыі адначасова з жоўтым або чырвоным сігналам святлафора, кіроўца абавязаны саступіць дарогу транспартным сродкам, якія рухаюцца з іншых напрамкаў.

Пры ўключанай стрэлцы дадатковай секцыі святлафора (адначасова з забараняльным сігналам) кіроўца, які знаходзіцца на крайняй паласе праезнай часткі дарогі, павінен працягваць рух у кірунку названай стрэлкі, калі яго спыненне створыць перашкоду для руху транспартных сродкаў, якія рухаюцца за ім па гэтай жа паласе, калі іншы парадак руху не вызначаны дарож-

нымі знакамі «Напрамкі руху па палосах», «Напрамак руху па паласе» ці адпаведнай гарызантальнай дарожнай разметкай.

**105.** Калі сігналы рэгуліроўшчыка або святлафора дазваляюць рух адначасова трамваю і іншым транспартным сродкам, то трамвай мае перавагу незалежна ад кірунку яго руху. Пры руху па сігнале стрэлкі, уключанай у дадатковай секцыі адначасова з чырвоным або жоўтым сігналам святлафора, кіроўца трамвая павінен саступіць дарогу транспартным сродкам, якія рухаюцца з іншых напрамкаў.

**106.** Кіроўца, які заехаў на скрыжаванне пры дазваляльным сігнале святлафора, павінен выехаць у абраным напрамку незалежна ад сігналу святлафора на выхадзе са скрыжавання, пры гэтым ён абавязаны саступіць дарогу сустрэчным транспартным сродкам, якія рухаюцца прама або направа. Калі на скрыжаванні перад святлафорамі, размешчанымі на шляху руху кіроўцы, маецца дарожны знак «Стоп-лінія» (лінія гарызантальнай дарожнай разметкі 1.12), кіроўца абавязаны кіравацца сігналамі кожнага святлафора.

**107.** Пры ўключэнні дазваляльнага сігналу святлафора кіроўца павінен саступіць дарогу транспартным сродкам, якія завяршаюць рух праз скрыжаванне, і пешаходам, якія не скончылі пераход праезнай часткі дарогі.

**108.** На скрыжаванні нераўназначных дарог кіроўца транспартнага сродку, які рухаецца па другараднай дарозе, павінен саступіць дарогу транспартным сродкам, якія набліжаюцца да яго па галоўнай дарозе, незалежна ад напрамку іх далейшага руху.

**109.** У выпадку, калі галоўная дарога на скрыжаванні змяняе напрамак, кіроўцы транспартных сродкаў, якія рухаюцца па галоўнай дарозе, павінны кіравацца паміж сабой правіламі праезду скрыжаванняў раўназначных дарог. Гэтымі ж правіламі кіруюцца кіроўцы транспартных сродкаў, якія рухаюцца па другараднай дарозе.

**110.** На скрыжаванні раўназначных дарог кіроўца транспартнага сродку, акрамя трамвая, абавязаны саступіць дарогу транспартным сродкам, якія набліжаюцца справа. Гэтым жа правілам павінны кіравацца паміж сабой кіроўцы трамваяў. На такіх скрыжаваннях кіроўца трамвая мае перавагу перад іншымі транспартнымі сродкамі (акрамя трамваяў) незалежна ад кірунку яго руху.

**111.** Пры павароце налева ці развароце кіроўца транспартнага сродку абавязаны саступіць дарогу сустрэчным транспартным сродкам, якія рухаюцца па раўназначнай дарозе прама або направа, і спадарожнаму трамваю. Гэтым жа правілам павінны кіравацца паміж сабой кіроўцы трамваяў. Пры адначасовым

праве на рух кіроўцы трамваяў маюць перавагу перад іншымі транспартнымі сродкамі (акрамя трамваяў) незалежна ад напрамку іх руху.

**112.** Калі кіроўца не можа вызначыць паслядоўнасць праезду скрыжавання (з-за немагчымасці распазнаць наяўнасць пакрыцця на праезнай частцы дарогі (цёмны час сутак, бруд, снег і іншае) або адсутнічае дарожны знак прыярытэту ў кірунку руху), ён павінен дзейнічаць так, нібы знаходзіцца на другарадйай дарозе.

**113.** На рэгулюемых скрыжаваннях могуць прымяняцца інфармацыйныя секцыі з бела-месяцовым перарывістым сігналам на чорным фоне або інфармацыйныя таблічкі белага колеру з чорнымі сімваламі. Інфармацыйныя секцыі або таблічкі могуць размяшчацца пад правай дадатковай секцыяй транспартных святлафораў або перад пешаходным пераходам разам з дарожнымі знакамі «Пешаходны пераход». Інфармацыйная секцыя або таблічка не змяняе значэння сігналаў святлафораў, патрабаванняў дарожных знакаў, дадзеных Правіл і дадаткова папярэджвае кіроўцаў аб неабходнасці саступіць дарогу пешаходам, веласіпедыстам і кіроўцам трамваяў.

## Раздзел 14
## ПЕШАХОДНЫЯ ПЕРАХОДЫ І ПУНКТЫ ПРЫПЫНКУ МАРШРУТНЫХ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ

**114.** Пешаходны пераход пазначаецца дарожнымі знакамі «Пешаходны пераход» і (або) гарызантальнай дарожнай разметкай 1.14.1 – 1.14.3. Дадаткова на пешаходным пераходзе могуць быць устаноўлены іншыя тэхнічныя сродкі арганізацыі дарожнага руху.

Пры адсутнасці гарызантальнай дарожнай разметкі 1.14.1 – 1.14.3 шырыня пешаходнага пераходу вызначаецца адлегласцю паміж дарожнымі знакамі «Пешаходны пераход», а пры ўстаноўцы дарожных знакаў толькі са знешняй у адносінах да цэнтру скрыжавання мяжы пешаходнага пераходу — адлегласцю паміж створам устаноўкі дарожных знакаў і ўмоўнай лініяй, якая злучае пачаткі закругленняў краёў прылеглай да тратуара праезнай часткі дарогі.

**115.** Пешаходны пераход, на якім рух пешаходаў праз праезную частку дарогі рэгулюецца рэгуліроўшчыкам або святлафорам, называецца рэгулюемым.

На рэгулюемым пешаходным пераходзе пры падачы дазваляльнага сігналу рэгуліроўшчыкам або ўключэнні дазваляльнага сігналу святлафора кіроўца павінен саступіць дарогу пешаходам, якія не скончылі пераход праезнай часткі дарогі.

**116.** Пры пад'ездзе да нерэгулюемага пешаходнага пераходу кіроўца павінен знізіць хуткасць, аж да спынення транспартнага сродку, каб саступіць дарогу пешаходам.

**117.** Калі перад пешаходным пераходам спыніўся (стаіць) або запаволіў рух транспартны сродак, то кіроўцы іншых транспартных сродкаў, якія рухаюцца па суседніх палосах руху ў спадарожным напрамку, павінны знізіць хуткасць руху і пры наяўнасці пешаходаў саступіць ім дарогу.

**118.** Кіроўцу забараняецца заязджаць на пешаходны пераход, калі ўтварыўся затор, які вымусіць яго спыніцца на пешаходным пераходзе.

**119.** Усюды, у тым ліку і па-за пешаходнымі пераходамі, кіроўца павінен саступіць дарогу пешаходу — інваліду па зроку, які падае сігнал кіем белага колеру або кіем з пакрыццём павышанай бачнасці, у тым ліку са святлоадбівальным элементам (элементамі). Кіроўца павінен быць гатовы знізіць хуткасць руху або спыніцца, каб выключыць верагоднасць наезду на такіх удзельнікаў дарожнага руху, а таксама дзяцей і пешаходаў з бачнымі парушэннямі апорна-рухальнага апарату.

**120.** Кіроўца павінен спыніцца, саступіўшы дарогу пешаходам, якія ідуць да маршрутнага транспартнага сродку, што стаіць на пункце прыпынку, або ад яго (з боку дзвярэй), калі пасадка (высадка) пасажыраў ажыццяўляецца з праезнай часткі дарогі або з пасадачнай пляцоўкі, размешчанай на ёй. Пачынаць рух дазваляецца толькі пасля закрыцця дзвярэй маршрутнага транспартнага сродку і выключэння на ім аварыйнай светлавой сігналізацыі (светлавога паказальніка правага павароту).

**121.** Забараняецца апярэджваць трамвай, які рухаецца, у якога ўключана аварыйная светлавая сігналізацыя (светлавы паказальнік правага павароту), у зоне пункта прыпынку трамвая, пазначанай дарожным знакам «Пункт прыпынку трамвая» і (або) гарызантальнай дарожнай разметкай 1.17.2.

**122.** Набліжаючыся да транспартнага сродку, які стаіць з уключанай аварыйнай светлавой сігналізацыяй і які мае апазнавальны знак «Перавозка дзяцей», кіроўца павінен знізіць хуткасць руху, пры неабходнасці спыніцца і саступіць дарогу пешаходам.

## Раздзел 15
## ПЕРАВАГА МАРШРУТНЫХ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ

**123.** Па-за скрыжаваннямі ў месцах, дзе трамвайныя пуці перасякаюць праезную частку дарогі, трамвай мае перавагу перад іншымі транспартнымі сродкамі, акрамя выпадкаў выезду з дэпо і месцаў, дзе чарговасць руху вызначаецца дарожнымі знакамі прыярытэту або сігналамі святлафораў.

**124.** На дарогах з паласой руху для маршрутных транспартных сродкаў, пазначаных дарожнымі знакамі «Паласа для маршрутных транспартных сродкаў», «Дарога з паласой для маршрутных транспартных сродкаў», забараняюцца рух, прыпынак і стаянка іншых транспартных сродкаў на гэтай паласе.

Калі паласа руху, пазначаная дарожным знакам «Паласа для маршрутных транспартных сродкаў», аддзелена ад астатняй праезнай часткі дарогі перарывістай лініяй гарызантальнай дарожнай разметкі, то для ажыццяўлення павароту кіроўца абавязаны перастройвацца на яе. Дазваляецца таксама ў такіх месцах заязджаць на гэтую паласу для пасадкі (высадкі) пасажыраў каля правага краю праезнай часткі, калі гэта не створыць перашкоды для руху маршрутных транспартных сродкаў.

**125.** У населеным пункце кіроўца транспартнага сродку, які рухаецца па крайняй правай паласе, павінен саступіць дарогу маршрутнаму транспартнаму сродку, які пачынае рух ад пазначанага пункта прыпынку, пры яго перастраенні на крайнюю правую паласу руху.

## Раздзел 16
## Чыгуначныя пераезды

**126.** Кіроўцы могуць перасякаць чыгуначныя пуці толькі па чыгуначных пераездах, саступаючы дарогу чыгуначнаму транспартнаму сродку.

**127.** Пры пад'ездзе да чыгуначнага пераезда кіроўца абавязаны пераканацца ў адсутнасці чыгуначнага транспартнага сродку, які набліжаецца, і кіравацца ўказаннямі дзяжурнага па чыгуначным пераездзе, патрабаваннямі святлафораў, дарожных знакаў, дарожнай разметкі, становішчам шлагбаума і гукавым сігналам.

**128.** Забараняецца:

**128.1.** выязджаць на чыгуначны пераезд:

**128.1.1.** пры закрытым шлагбауме ці калі ён пачынае закрывацца незалежна ад сігналу святлафора;

**128.1.2.** пры забараняльным сігнале святлафора незалежна ад наяўнасці і становішча шлагбаума;

**128.1.3.** пры забараняльным сігнале дзяжурнага па чыгуначным пераездзе (дзяжурны звернуты да кіроўцы грудзьмі або спінай з паднятым над галавой ліхтаром, які выпраменьвае чырвонае святло, або сцяжком чырвонага колеру, або з выцягнутымі ў бок рукамі);

**128.1.4.** калі за чыгуначным пераездам утварыўся затор, які вымусіць кіроўцу спыніцца на чыгуначным пераездзе;

**128.1.5.** калі да чыгуначнага пераезда ў межах бачнасці набліжаецца чыгуначны транспартны сродак;

**128.2.** аб'язджаць з выездам на сустрэчную паласу руху транспартныя сродкі, якія стаяць перад чыгуначным пераездам;

**128.3.** самавольна адкрываць шлагбаум;

**128.4.** правозіць праз чыгуначны пераезд сельскагаспадарчыя, дарожныя, будаўнічыя і іншыя машыны і механізмы ў становішчы, пры якім яны пры транспарціроўцы могуць стаць перашкодай для дарожнага руху, пашкодзіць пакрыццё дарогі, чыгуначны пуць, абсталяванне чыгуначнага пераезда, тэхнічныя сродкі арганізацыі дарожнага руху;

**128.5.** рух праз чыгуначны пераезд на электрыфікаваных участках транспартных сродкаў, габарытныя памеры якіх з грузам або без грузу перавышаюць па вышыні 4 метра ад паверхні дарогі, — без узгаднення з начальнікам дыстанцыі электразабеспячэння арганізацыі Беларускай чыгункі;

**128.6.** рух праз чыгуначны пераезд ціхаходных транспартных сродкаў, хуткасць руху якіх менш за 8 км/г, і саней-валакуш — без дазволу начальніка дыстанцыі пуці чыгункі.

**129.** У выпадку, калі рух праз чыгуначны пераезд забаронены, кіроўца павінен спыніцца каля дарожнага знака «Рух без спынення забаронены» ці «Стоп-лінія» (лініі гарызантальнай дарожнай разметкі 1.12), пры іх адсутнасці — перад святлафорам, пры адсутнасці святлафора — не бліжэй за 5 метраў ад шлагбаума, пры адсутнасці шлагбаума — каля дарожнага знака «Аднакалейная чыгунка» або «Шматкалейная чыгунка», пры адсутнасці тэхнічных сродкаў арганізацыі дарожнага руху — не бліжэй за 10 метраў да бліжэйшай рэйкі.

**130.** Пры вымушаным прыпынку транспартнага сродку на чыгуначным пераездзе кіроўца абавязаны ўключыць аварыйную светлавую сігналізацыю, неадкладна высадзіць пасажыраў і прыняць меры для вызвалення чыгуначнага пераезда.

Адначасова кіроўца павінен пры наяўнай магчымасці накіраваць двух чалавек уздоўж чыгуначных пуцей у абодва бакі ад пераезда на 1 кіламетр (калі аднаго, то ў бок горшай бачнасці чыгуначнага пуці), патлумачыўшы ім парадак падачы сігналу прыпынку машыністу чыгуначнага транспартнага сродку, які набліжаецца, а сам — заставацца каля транспартнага сродку і падаваць сігналы агульнай трывогі (серыі з аднаго доўгага і трох кароткіх гукавых сігналаў).

Пры з'яўленні чыгуначнага транспартнага сродку кіроўца (пасажыр) абавязаны бегчы яму насустрач, падаваць сігнал прыпынку, захоўваючы меры засцярогі. Сігналам прыпынку

служыць кругавы рух рукі (днём — з кавалкам яркай тканіны або якім-небудзь добра бачным прадметам, ноччу — з ліхтаром або факелам).

## Раздзел 17
## РУХ ПА АЎТАМАГІСТРАЛІ

**131.** Аўтамагістраль пазначаецца дарожным знакам «Аўтамагістраль». На аўтамагістралях забараняецца:

**131.1.** рух пешаходаў, гужавых транспартных сродкаў, коннікаў, паганятых жывёлы, рух на веласіпедах, мапедах, колавых трактарах, самаходных машынах і транспартных сродках, якія па тэхнічных прычынах не могуць развіваць хуткасць руху больш за 40 км/г;

**131.2.** прыпынак транспартных сродкаў па-за пляцоўкамі для стаянкі, пазначанымі дарожнымі знакамі «Месца стаянкі», «Месца адпачынку»;

**131.3.** разварот і ўезд у разрывы раздзяляльнай паласы, за выключэннем месцаў, пазначаных дарожнымі знакамі «Месца для развароту», «Зона для развароту»;

**131.4.** рух заднім ходам;

**131.5.** буксіроўка механічнага транспартнага сродку (пры яго эвакуацыі неабходна пакінуць аўтамагістраль на бліжэйшым з'ездзе з яе);

**131.6.** навучанне кіраванню механічным транспартным сродкам.

**132.** Патрабаванні дадзеных Правіл, устаноўленыя для руху па аўтамагістралі, распаўсюджваюцца таксама на дарогі, пазначаныя дарожным знакам «Дарога для аўтамабіляў».

## Раздзел 18
## РУХ У ЖЫЛОЙ І ПЕШАХОДНАЙ ЗОНАХ, НА ПРЫЛЕГЛАЙ ТЭРЫТОРЫІ

**133.** Рух транспартных сродкаў у жылой і пешаходнай зонах, на прылеглай тэрыторыі дапускаецца з улікам патрабаванняў дадзенага раздзела пры ўмове прыняцця кіроўцамі ўсіх мер па забеспячэнні бяспекі пешаходаў, веласіпедыстаў, іншых удзельнікаў дарожнага руху.

**134.** У пешаходнай зоне дапускаецца рух толькі транспартных сродкаў дарожна-эксплуатацыйнай і камунальнай службаў, аўтамабіляў з нахіленай белай паласой на бартах, а таксама іншых транспартных сродкаў, якія абслугоўваюць гандлёвыя і іншыя арганізацыі, размешчаныя ў пешаходнай зоне (грамадзян, якія жывуць у дадзенай зоне), транспартных сродкаў, што належаць грамадзянам, якія пражываюць у гэтай зоне, пры адсутнасці іншых магчымасцей пад'езду.

**135.** У жылой і пешаходнай зонах, на прылеглай тэрыторыі рух пешаходаў дазваляецца па тратуары, узбочыне і па праезнай частцы дарогі. Пешаходы маюць перавагу перад транспартнымі сродкамі, але не павінны неабгрунтавана перашкаджаць іх руху.

**136.** Пры выездзе з жылой і пешаходнай зон, прылеглай тэрыторыі кіроўцы павінны саступіць дарогу транспартным сродкам, якія рухаюцца па дарозе, а таксама пешаходам, веласіпедыстам і коннікам, шлях руху якіх яны перасякаюць.

**137.** У жылой і пешаходнай зонах, на прылеглай тэрыторыі кіроўцам механічных транспартных сродкаў забараняецца:

**137.1.** рух з хуткасцю больш за 20 км/г;

**137.2.** транзітны рух;

**137.3.** навучанне кіраванню механічным транспартным сродкам;

**137.4.** стаянка механічнага транспартнага сродку з вядомай кіроўцу няспраўнасцю супрацьугоннай гукавой сігналізацыі, якая адвольна падае бесперапынныя гукавыя сігналы;

**137.5.** стаянка грузавых аўтамабіляў з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай больш за 3,5 тоны, аўтобусаў, колавых трактароў і самаходных машын па-за спецыяльна адведзенымі месцамі, пазначанымі дарожным знакам «Месца стаянкі», калі гэта не звязана з выкананнем імі работ.

## Раздзел 19
## ПРЫПЫНАК І СТАЯНКА ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ

**138.** Прыпынак і стаянка транспартных сродкаў дазваляюцца:

**138.1.** у спецыяльна адведзеным месцы, пазначаным дарожным знакам «Месца стаянкі» («Месца стаянкі таксі», «Месца адпачынку»);

**138.2.** на правай па ходзе руху ўзбочыне, а пры адсутнасці ўзбочыны або немагчымасці спыніцца на ёй — каля краю праезнай часткі дарогі паралельна яму, за выключэннем тых месцаў, дзе з дапамогай дарожных знакаў або дарожнай разметкі дапускаецца іншае размяшчэнне транспартных сродкаў (па-за населенымі пунктамі дазваляецца толькі прыпынак транспартных сродкаў);

**138.3.** на левай узбочыне дарогі з аднабаковым рухам, а пры яе адсутнасці або немагчымасці спыніцца на ёй — каля левага краю праезнай часткі дарогі паралельна яму, за выключэннем тых месцаў, дзе з дапамогай дарожных знакаў або дарожнай разметкі дапускаецца іншае размяшчэнне транспартных сродкаў, пры наяўнасці там тратуара, які непасрэдна прылягае да праезнай часткі дарогі, а ў населеных пунктах — таксама на

дарозе з адной паласой руху для кожнага напрамку без трамвайных пуцей пасярэдзіне (па-за населенымі пунктамі дазваляецца толькі прыпынак транспартных сродкаў).

**139.** Транспартныя сродкі дазваляецца ставіць на стаянку з выкананнем патрабаванняў дарожных знакаў і гарызантальнай дарожнай разметкі, а пры іх адсутнасці — пры ўмове рацыянальнага выкарыстання месца стаянкі, не ствараючы перашкоды для доступу да іншых транспартных сродкаў, якія знаходзяцца на ім, і іх наступнага руху.

**140.** Прыпынак на час больш за 5 хвілін і стаянка транспартнага сродку, у тым ліку ў месцах, спецыяльна адведзеных для адпачынку, павінна ажыццяўляцца з непрацуючым рухавіком транспартнага сродку.

**141.** Пры вымушаным прыпынку транспартнага сродку на праезнай частцы дарогі і ў месцах, дзе прыпынак забаронены, кіроўца павінен прыняць усе магчымыя меры для вывядзення яго за межы праезнай часткі дарогі.

Выпраўляць тэхнічныя няспраўнасці транспартнага сродку па магчымасці неабходна за межамі праезнай часткі дарогі. У выпадку ліквідацыі тэхнічных няспраўнасцей транспартнага сродку на праезнай частцы дарогі асобам, якія выконваюць такія дзеянні, рэкамендуецца знаходзіцца ў адзенні павышанай бачнасці са святлоадбівальнымі элементамі.

**142.** Транспартныя сродкі, за выключэннем веласіпеда, мапеда, матацыкла без бакавога прычэпа, штурхаць па праезнай частцы дарогі забараняецца (за выключэннем выпадку вывядзення іх за межы праезнай часткі дарогі).

**143.** Прыпынак і стаянка транспартных сродкаў забараняюцца:

**143.1.** у зоне дзеяння адпаведна дарожных знакаў «Прыпынак забаронены», «Стаянка забаронена», «Стаянка забаронена па няцотных чыслах месяца», «Стаянка забаронена па цотных чыслах месяца» і (або) ліній гарызантальнай дарожнай разметкі 1.4, 1.10;

**143.2.** у месцах, дзе адлегласць паміж суцэльнай лініяй гарызантальнай дарожнай разметкі (акрамя той, якая пазначае край праезнай часткі дарогі) і спыненым транспартным сродкам складае менш за 3 метры;

**143.3.** на пешаходных пераходах і бліжэй за 15 метраў ад іх на дарозе ў абодва бакі;

**143.4.** на скрыжаваннях і бліжэй за 15 метраў ад краю перасякаемай праезнай часткі дарогі (акрамя жылых зон), за выключэннем боку насупраць бакавога праезду трохбаковых скрыжаванняў, якія маюць суцэльную лінію гарызантальнай дарожнай разметкі або суцэльную раздзяляльную паласу;

**143.5.** на пунктах прыпынку маршрутных транспартных сродкаў і бліжэй за 15 метраў ад іх, акрамя выпадкаў прыпынку для пасадкі (высадкі) пасажыраў, калі гэта не створыць перашкоды для руху маршрутных транспартных сродкаў;

**143.6.** на мастах, пуцеправодах, эстакадах і пад імі, акрамя спецыяльна абсталяваных месцаў для стаянкі;

**143.7.** на палосах разгону і тармажэння, з'ездах транспартных развязак у розных узроўнях і ўездах на іх;

**143.8.** на чыгуначных пераездах і бліжэй за 50 метраў ад іх у абодва бакі;

**143.9.** на паваротах дарогі, пазначаных дарожнымі знакамі «Небяспечны паварот», «Небяспечныя павароты», у іншых месцах з абмежаванай агляднасцю дарогі і дзе бачнасць дарогі менш за 100 метраў хоць бы ў адным напрамку руху;

**143.10.** на праезнай частцы двухпалоснай дарогі насупраць транспартнага сродку, які стаіць на супрацьлеглым баку дарогі;

**143.11.** на левым баку дарогі, за выключэннем выпадкаў, названых у падпункце 138.3 пункта 138 дадзеных Правіл;

**143.12.** на трамвайных пуцях і ў непасрэднай блізкасці ад іх, калі гэта створыць перашкоду для руху трамваяў;

**143.13.** у месцах, дзе транспартны сродак закрые ад іншых кіроўцаў сігналы святлафора, дарожныя знакі або іншыя тэхнічныя сродкі арганізацыі дарожнага руху;

**143.14.** на тратуарах, акрамя спецыяльна адведзеных месцаў, пазначаных дарожным знакам «Месца стаянкі» («Месца стаянкі таксі»). Дапускаецца прыпынак транспартных сродкаў дарожна-эксплуатацыйнай і камунальнай службаў, аўтамабіляў з нахіленай белай паласой на бартах, а таксама іншых транспартных сродкаў, якія абслугоўваюць гандлёвыя і іншыя арганізацыі, размешчаныя непасрэдна каля тратуараў, на час выканання работ або загрузкі (разгрузкі) транспартнага сродку пры ўмове забеспячэння бяспекі дарожнага руху;

**143.15.** на газонах і іншых участках з зялёнымі насаджэннямі;

**143.16.** на праездах у дварах з боку, прылеглага да жылой забудовы;

**143.17.** у месцах, дзе транспартны сродак, які стаіць, створыць перашкоду для руху, працы транспартных сродкаў аператыўнага прызначэння і транспартных сродкаў дарожна-эксплуатацыйнай і камунальных службаў (уезды ў двары і выезды з іх, праезды ў арках, вузкія мясцовыя праезды, месцы размяшчэння кантэйнераў для збору бытавых адыходаў і інш.);

**143.18.** бліжэй за 10 метраў ад службовых дзвярэй магазінаў, праз якія ажыццяўляюцца пагрузачна-разгрузачныя работы, зачыненых варот, у тым ліку варот гаражоў.

**144.** Уключэнне кіроўцам аварыйнай светлавой сігналізацыі пры наўмысным прыпынку і стаянцы ў месцах, дзе яны забароненыя, не вызваляе яго ад адказнасці за парушэнне патрабаванняў пункта 143 дадзеных Правіл.

**145.** Стаянка забараняецца:

**145.1.** па-за населенымі пунктамі транспартных сродкаў на праезнай частцы дарогі і на ўзбочыне;

**145.2.** транспартных сродкаў з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай звыш 3,5 тоны па-за спецыяльна адведзенымі месцамі, пазначанымі дарожным знакам «Месца стаянкі» («Месца адпачынку»).

**146.** Забараняецца адчыняць (зачыняць) дзверы транспартнага сродку або трымаць іх адчыненымі, калі гэта створыць перашкоду для руху іншых удзельнікаў дарожнага руху.

**147.** Пры парушэнні кіроўцамі прадугледжаных дадзеным раздзелам правіл прыпынку або стаянкі транспартных сродкаў, у выніку якога створана перашкода для дарожнага руху або паўстала пагроза бяспекі грамадзян, супрацоўнікі ДАІ маюць права ажыццявіць прымусовую эвакуацыю такіх транспартных сродкаў у парадку, вызначаным заканадаўчымі актамі і Інструкцыяй аб парадку прымусовай эвакуацыі (блакіроўцы колаў) транспартных сродкаў, зацверджанай Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Пры парушэнні кіроўцамі прадугледжаных дадзеным раздзелам правіл прыпынку або стаянкі грузавых аўтамабіляў з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай больш за 3,5 тоны, аўтобусаў, колавых трактароў, самаходных машын супрацоўнікамі ДАІ можа быць ажыццёўлена блакіроўка колаў гэтых транспартных сродкаў у парадку, вызначаным заканадаўчымі актамі і Інструкцыяй, названай у частцы першай дадзенага пункта.

## Раздзел 20
## РУХ НА ВЕЛАСІПЕДАХ І МАПЕДАХ

**148.** Рух на веласіпедзе павінен ажыццяўляцца па веласіпеднай дарожцы, а пры яе адсутнасці — па ўзбочыне, тратуары або пешаходнай дарожцы, не ствараючы перашкоды для бяспечнага руху пешаходаў. Пры адсутнасці названых элементаў дарогі ці немагчымасці руху па іх дапускаецца рух веласіпедыстаў па праезнай частцы дарогі ў адзін рад не далей за 1 метр ад яе правага краю. Пры гэтым:

**148.1.** выезд далей за 1 метр ад правага краю праезнай часткі дарогі дапускаецца толькі для аб'езду перашкоды і ў дазволеных выпадках для павароту налева ці развароту;

**148.2.** калоны веласіпедыстаў пры руху па праезнай частцы дарогі павінны быць падзелены на групы не больш чым па 10 веласіпедыстаў. Адлегласць паміж групамі павінна складаць не менш за 100 метраў;

**148.3.** пры наяўнасці на праезнай частцы дарогі лініі гарызантальнай дарожнай разметкі 1.2, якая пазначае яе край, гэта лінія павінна размяшчацца злева ад веласіпедыста.

**149.** Пры руху па дарозе ў цёмны час сутак і (або) пры яе недастатковай бачнасці на веласіпедзе або мапедзе павінны быць уключаны: спераду — фара (ліхтар), якая выпраменьвае белае святло, ззаду — ліхтар, які выпраменьвае чырвонае святло.

**150.** Па-за скрыжаваннямі на нерэгулюемым скрыжаванні веласіпеднай дарожкі з дарогай веласіпедыст абавязаны саступіць дарогу транспартным сродкам, якія рухаюцца па гэтай дарозе.

**151.** Пры перасячэнні праезнай часткі дарогі па пешаходным пераходзе веласіпедыст павінен весці веласіпед побач з сабой і кіравацца патрабаваннямі, прадугледжанымі дадзенымі Правіламі для руху пешаходаў.

**152.** Рух на мапедзе павінен ажыццяўляцца па ўзбочыне ці праезнай частцы дарогі не далей за 1 метр ад правага краю праезнай часткі. Пры гэтым выезд далей за 1 метр ад яе правага краю дапускаецца толькі для аб'езду перашкоды і ў дазволеных выпадках для павароту налева ці развароту.

**153.** Веласіпедысту і кіроўцу мапеда забараняецца:

**153.1.** выкарыстоўваць тэхнічна няспраўныя веласіпеды і мапеды, а таксама абсталяваныя з парушэннем патрабаванняў тэхнічных нарматыўных прававых актаў;

**153.2.** рухацца, не трымаючыся за руль і (або) не трымаючы ногі на педалях (падножках);

**153.3.** паварочваць налева ці разварочвацца на дарозе, якая мае трамвайны пуць, і на дарозе, якая мае больш за адну паласу для руху ў дадзеным кірунку;

**153.4.** рухацца па дарозе ва ўмовах снегападу і (або) галалёдзіцы;

**153.5.** перавозіць пасажыраў, за выключэннем перавозкі на веласіпедзе дзяцей ва ўзросце да сямі гадоў на дадатковым спецыяльна абсталяваным сядзенні або калі перавозка пасажыраў прадугледжана канструкцыяй мапеда;

**153.6.** перавозіць грузы, якія выступаюць больш чым на 0,5 метра па даўжыні або шырыні за габарыты транспартнага сродку, а таксама грузы, якія замінаюць кіраванню гэтым транспартным сродкам.

**154.** Забараняецца без суправаджэння паўналетняй асобы кіраваць на дарозе асобам, маладзейшым за:

**154.1.** чатырнаццаць гадоў — веласіпедам (акрамя пешаходных і жылых зон, тратуараў, веласіпедных і пешаходных дарожак);

**154.2.** шаснаццаць гадоў — мапедам (акрамя пешаходных і жылых зон).

**155.** Кіроўцу мапеда забараняецца ездзіць па тратуарах, веласіпедных і пешаходных дарожках, дарожках для коннікаў.

**156.** Забараняецца буксіроўка веласіпеда і веласіпедам, за выключэннем веласіпеднага прычэпа прамысловай вытворчасці.

## Раздзел 21
## РУХ ГУЖАВЫХ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ, КОННІКАЎ І ПРАГОН ЖЫВЁЛЫ

**157.** Кіроўцы гужавых транспартных сродкаў, коннікі і паганятыя жывёлы павінны быць не маладзей за чатырнаццаць гадоў.

**158.** Кіроўцам гужавых транспартных сродкаў, коннікам і паганятым жывёлы забараняецца:

**158.1.** вадзіць жывёлу па дарогах агульнага карыстання з удасканаленым пакрыццём па-за населенымі пунктамі;

**158.2.** пакідаць жывёлу без нагляду на дарозе, пераганяць яе праз чыгуначныя пуці і дарогі па-за спецыяльна абсталяванымі месцамі, узгодненымі ў вызначаным парадку, а таксама ў цёмны час сутак і (або) пры недастатковай бачнасці дарогі;

**158.3.** ажыццяўляць выпас жывёлы ў межах паласы зямлі, на якой размяшчаюцца дарога і ўсе яе збудаванні.

**159.** Пры руху па дарозе ў цёмны час сутак і (або) пры яе недастатковай бачнасці на гужавым транспартным сродку спераду павінен быць уключаны ліхтар, які выпраменьвае белае святло, ззаду — ліхтар, які выпраменьвае чырвонае святло.

**160.** Рух па праезнай частцы дарогі на гужавых транспартных сродках і коннікаў дазваляецца толькі ў адзін рад на адлегласці не далей за 1 метр ад яе правага краю. Пры гэтым:

**160.1.** забараняецца паварочваць налева ці разварочвацца на дарозе, якая мае трамвайны пуць, і на дарозе, якая мае больш за адну паласу для руху ў дадзеным кірунку;

**160.2.** дапускаецца рух гужавых транспартных сродкаў і коннікаў па ўзбочыне, калі гэта не стварае перашкоды для бяспечнага руху пешаходаў.

**161.** Кіроўца гужавога транспартнага сродку, коннік пры выездзе з другараднай дарогі на галоўную ў цёмны час сутак, пры недастатковай бачнасці дарогі або ў месцах з яе абмежаванай аглядкасцю абавязаны весці жывёлу за аброць.

## Раздзел 22
## КАРЫСТАННЕ ЗНЕШНІМІ СВЕТЛАВЫМІ ПРЫБОРАМІ І ГУКАВЫМІ СІГНАЛАМІ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ

**162.** Пры руху ў цёмны час сутак і (або) пры недастатковай бачнасці дарогі незалежна ад яе асветленасці на транспартным сродку павінны быць уключаны наступныя светлавыя прыборы:

**162.1.** фары далёкага або блізкага святла — на механічным транспартным сродку;

**162.2.** фары і (або) ліхтары — на веласіпедзе;

**162.3.** габарытныя агні — на прычэпе, а таксама на механічным транспартным сродку, які буксіруюць, пры адсутнасці або няспраўнасці аварыйнай светлавой сігналізацыі.

**163.** Далёкае святло фар павінна быць пераключана на блізкае:

**163.1.** у населеным пункце, калі дарога асветленая;

**163.2.** пры сустрэчным раз'ездзе на адлегласці не менш за 300 метраў да транспартнага сродку, а таксама на большай адлегласці, калі кіроўца сустрэчнага транспартнага сродку перыядычным пераключэннем святла фар пакажа неабходнасць гэтага;

**163.3.** калі далёкае святло фар будзе асвятляць транспартны сродак, які рухаецца ў спадарожным напрамку, або яго кіроўца ўключэннем аварыйнай светлавой сігналізацыі пакажа неабходнасць такога пераключэння;

**163.4.** у любых іншых выпадках для выключэння магчымасці асляплення кіроўцаў як сустрэчных, так і спадарожных транспартных сродкаў. Пры асляпленні кіроўца павінен неадкладна ўключыць аварыйную светлавую сігналізацыю і, не перастройваючыся, знізіць хуткасць руху і спыніцца.

**164.** Пры прыпынку, стаянцы ў цёмны час сутак на неасветленых участках дарогі і (або) пры яе недастатковай бачнасці (акрамя жылых зон) на транспартным сродку павінны быць уключаны габарытныя або стаяначныя агні.

**165.** Супрацьтуманныя фары на транспартным сродку могуць выкарыстоўвацца кіроўцам:

**165.1.** у цёмны час сутак і (або) пры недастатковай бачнасці дарогі сумесна з блізкім або далёкім святлом фар;

**165.2.** замест блізкага святла фар ва ўмовах, прадугледжаных пунктамі 166 і 167 дадзеных Правіл.

**166.** У светлы час сутак для абазначэння транспартнага сродку, які рухаецца, павінны быць уключаны блізкае святло фар або дзённыя хадавыя агні (пры іх наяўнасці):

**166.1.** на матацыкле і мапедзе;

**166.2.** пры руху ў транспартнай калоне;

**166.3.** на маршрутным транспартным сродку, які рухаецца па спецыяльна вылучанай паласе насустрач руху;

**166.4.** пры арганізаванай перавозцы групы дзяцей;

**166.5.** пры перавозцы небяспечных грузаў, руху цяжкавагавых і (або) буйнагабарытных транспартных сродкаў;

**166.6.** пры буксіроўцы (на транспартным сродку, які буксіруе);

**166.7.** падчас навучання кіраванню механічным транспартным сродкам на дарогах;

**166.8.** на механічных транспартных сродках пры арганізацыі часовага іх руху па сустрэчнай паласе руху;

**166.9.** у перыяд правядзення Міністэрствам унутраных спраў рэспубліканскіх спецыяльных комплексных мерапрыемстваў па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху, якія прадугледжваюць рух транспартных сродкаў у светлы час сутак з уключанымі блізкім святлом фар або дзённымі хадавымі агнямі (пры іх наяўнасці).

**167.** Пры пагаршэнні бачнасці транспартнага сродку на дарозе для яго абазначэння падчас руху ў светлы час сутак могуць быць уключаны блізкае святло фар або дзённыя хадавыя агні (пры іх наяўнасці).

**168.** Фарай-пражэктарам і фарай-шукальнікам дазваляецца карыстацца толькі па-за населенымі пунктамі пры адсутнасці сустрэчных транспартных сродкаў. У населеных пунктах карыстацца такімі фарамі могуць толькі кіроўцы транспартных сродкаў аператыўнага прызначэння пры выкананні службовага задання.

**169.** Заднія супрацьтуманныя ліхтары на транспартных сродках могуць прымяняцца толькі пры недастатковай бачнасці дарогі.

**170.** Апазнавальны знак «Аўтапоезд» павінен быць уключаны пры руху аўтапоезда, а ў цёмны час сутак на неасветленых участках дарогі і (або) пры яе недастатковай бачнасці, акрамя таго, — і на час яго прыпынку або стаянкі.

**171.** Маячок аранжавага колеру павінен быць уключаны на:

**171.1.** транспартным сродку, самаходнай машыне пры выкананні рамонтных і іншых работ на дарозе;

**171.2.** транспартным сродку, які перавозіць небяспечныя грузы, цяжкавагавым і (або) буйнагабарытным транспартным сродку;

**171.3.** механічным транспартным сродку, які ажыццяўляе суправаджэнне пры перавозцы цяжкавагавых і (або) буйнагабарытных грузаў;

**171.4.** механічным транспартным сродку, спецыяльна прызначаным для транспарціроўкі пашкоджаных і няспраўных транспартных сродкаў, пры іх пагрузцы, транспарціроўцы і выгрузцы;

**171.5.** механічным транспартным сродку, спецыяльна прызначаным у адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў для падвозу груп дзяцей ва ўстановы адукацыі, пры пасадцы і высадцы пасажыраў;

**171.6.** самаходнай машыне падчас яе руху па дарозе.

**172.** Гукавыя сігналы могуць прымяняцца толькі для:

**172.1.** папярэджання іншых кіроўцаў аб намеры ажыццявіць абгон па-за населенымі пунктамі;

**172.2.** прадухілення дарожна-транспартнага здарэння.

**173.** Для папярэджання аб абгоне замест гукавога сігналу (або сумесна з ім) можа падавацца светлавы сігнал, які ўяўляе сабой у светлы час сутак перыядычнае кароткачасовае ўключэнне і выключэнне святла фар, а ў цёмны час сутак — перыядычнае пераключэнне фар з блізкага святла на далёкі.

## Раздзел 23
## ПЕРАВОЗКА ПАСАЖЫРАЎ

**174.** Пры перавозцы пасажыраў фактычная маса транспартнага сродку не павінна перавышаць тэхнічна дапушчальную агульную масу транспартнага сродку, устаноўленую арганізацыяй (заводам)-вытворцам.

**175.** Перавозка пасажыраў у кузаве грузавога аўтамабіля павінна ажыццяўляцца кіроўцамі, якія маюць стаж кіравання механічным транспартным сродкам дадзенай катэгорыі больш за тры гады і пасведчанне кіроўцы на права кіравання механічным транспартным сродкам катэгорыі «C», а пры перавозцы больш за 8 чалавек (у тым ліку пасажыраў у кабіне) — на права кіравання механічным транспартным сродкам катэгорый «C» і «D» (акрамя перавозкі пасажыраў, што ажыццяўляецца ў вызначаным парадку вайскоўцамі).

**176.** Перад паездкай кіроўца грузавога аўтамабіля абавязаны праінструктаваць пасажыраў аб парадку іх пасадкі (размяшчэння і высадкі) у кузаў, а таксама аб правілах паводзін у час руху.

**177.** Колькасць пасажыраў, якія перавозяцца ў кузаве грузавога аўтамабіля з бартавой платформай, у кузаве-фургоне, не павінна перавышаць колькасці месцаў, абсталяваных для сядзення.

Праезд у кузаве грузавога аўтамабіля з бартавой платформай або ў кузаве-фургоне, не абсталяваных для перавозкі пасажыраў, дазваляецца толькі асобам, якія едуць за атрыманнем грузу або суправаджаюць яго, пры ўмове, што яны забяспечаны месцамі для сядзення, размешчанымі ніжэй за ўзровень бартоў.

**178.** Пры перавозцы дзяцей да дванаццаці гадоў на заднім сядзенні легкавога аўтамабіля рэкамендуецца выкарыстоўваць спецыяльнае дзіцячае стрымліваючае прыстасаванне (сядзенне).

Паўналетні пасажыр на заднім сядзенні легкавога аўтамабіля можа трымаць на каленях адно дзіця ва ўзросце да дванаццаці гадоў пры ўмове, што названы пасажыр прышпілены рамянём бяспекі.

**179.** Пры перавозцы груп дзяцей у аўтобусе кожнае дзіця павінна быць забяспечана асобным пасадачным месцам, а ў салоне павінна знаходзіцца не менш за аднаго паўналетняга суправаджальніка на дваццаць дзяцей. На аўтобусе спераду і ззаду ўсталёўваецца апазнавальны знак «Перавозка дзяцей».

**180.** Кіроўца транспартнага сродку абавязаны ажыццяўляць пасадку (высадку) пасажыраў толькі пасля поўнага спынення транспартнага сродку, а пачынаць рух — толькі з зачыненымі дзвярыма і не адчыняць іх да поўнага спынення. Пры гэтым кіроўца маршрутнага транспартнага сродку для пасадкі (высадкі) пасажыраў абавязаны спыняцца толькі на пазначаных пунктах прыпынку.

**181.** Забараняецца перавозіць:

**181.1.** пасажыраў з парушэннем патрабаванняў, выкладзеных у пунктах 174 – 180 дадзеных Правіл, і іншых патрабаванняў, вызначаных дадзенымі Правіламі ў дачыненні да перавозкі пасажыраў;

**181.2.** пасажыраў па-за салонам (кабінай) аўтамабіля (акрамя выпадкаў перавозкі пасажыраў у кузаве грузавога аўтамабіля з бартавой платформай або ў кузаве-фургоне), кабінай колавага трактара, самаходнай машыны, на прычэпе, у кузаве грузавога матацыкла і па-за прадугледжанымі канструкцыяй матацыкла месцамі для сядзення;

**181.3.** пасажыраў звыш колькасці, прадугледжанай тэхнічнай характарыстыкай транспартнага сродку;

**181.4.** пасажыраў на вучэбным механічным транспартным сродку, якім кіруе асоба, што навучаецца кіраванню механічным транспартным сродкам, за выключэннем выпадкаў прыёму кваліфікацыйнага практычнага экзамену на права кіравання механічным транспартным сродкам і правядзення кантрольных праверак вучэбнай арганізацыі;

**181.5.** дзяцей да дванаццаці гадоў на пярэднім сядзенні легкавога аўтамабіля пры адсутнасці спецыяльнай дзіцячай стрымліваючай прылады (сядзення), а таксама на заднім сядзенні матацыкла, мапеда;

**181.6.** дзяцей на каленях у кіроўцы, у пасажыра на пярэднім сядзенні легкавога аўтамабіля;

**181.7.** дзяцей у кузаве грузавога аўтамабіля з бартавой платформай і ў кузаве-фургоне.

## Раздзел 24
## ПЕРАВОЗКА ГРУЗАЎ

**182.** Маса грузу, які перавозіцца, і размеркаванне нагрузкі па восях не павінны перавышаць велічынь, устаноўленых арганізацыяй (заводам)-вытворцам для дадзенага транспартнага сродку.

**183.** Перад пачаткам руху і падчас руху кіроўца абавязаны пры наяўнасці аб'ектыўнай магчымасці кантраляваць размяшчэнне, мацаванне і стан грузу, каб пазбегнуць яго зрушэння і падзення. Калі размяшчэнне, мацаванне, стан грузу ствараюць пагрозу бяспецы дарожнага руху, кіроўца павінен прыняць меры да ліквідацыі ўзніклай небяспекі альбо спыніць далейшы рух.

**184.** Перавозка грузу забараняецца, калі ён:

**184.1.** стварае пагрозу бяспецы дарожнага руху;

**184.2.** абмяжоўвае кіроўцу агляднасць дарогі;

**184.3.** ускладняе кіраванне транспартным сродкам, парушае яго ўстойлівасць;

**184.4.** закрывае знешнія светлавыя прыборы і святлоадбівальнікі, рэгістрацыйныя і апазнавальныя знакі транспартных сродкаў, а таксама перашкаджае ўспрыняццю сігналаў, якія падаюцца рукой пры няспраўных (адсутных) светлавых паказальніках паваротаў;

**184.5.** стварае шум, пыліць, забруджвае дарогу і навакольнае асяроддзе.

**185.** Груз, які выступае за габарыты транспартнага сродку спераду або ззаду больш чым на 1 метр або збоку больш чым на 0,4 метра ад знешняга краю габарытнага агню, павінен быць пазначаны апазнавальнымі знакамі «Буйнагабарытны груз», а ў цёмны час сутак і (або) пры недастатковай бачнасці дарогі, акрамя таго, спераду — ліхтаром, які выпраменьвае белае святло, ззаду — ліхтаром, які выпраменьвае чырвонае святло.

**186.** У адпаведнасці са спецыяльнымі дазволам і правіламі ажыццяўляецца рух цяжкавагавага транспартнага сродку і транспартнага сродку, габарытныя памеры якога з грузам або без грузу перавышаюць хоць бы адзін з наступных паказчыкаў:

**186.1.** па вышыні — 4 метра ад паверхні дарогі;

**186.2.** па даўжыні:

**186.2.1.** 12 метраў для аўтамабіля, тралейбуса, прычэпа;

**186.2.2.** 13,5 метра для аўтобуса з дзвюма восямі, 15 метраў для аўтобуса з больш чым дзвюма восямі;

**186.2.3.** 18,75 метра для сучлененага аўтобуса, сучлененага тралейбуса;

**186.2.4.** 20 метраў для аўтапоезда;

**186.3.** па шырыні:

**186.3.1.** 2,6 метра для транспартных сродкаў з ізатэрмічным кузавам;

**186.3.2.** 2,75 метра для аўтамабілей КрАЗ, МАЗ-509А, МАЗ-543, МАЗ-5316, МАЗ-6317, МАЗ-6425, МЗКТ-6906 і іх мадыфікацый;

**186.3.3.** 2,55 метра для іншых транспартных сродкаў;

**186.4.** калі груз выступае за габарыты транспартнага сродку па даўжыні на 2 метра і больш, то гэты транспартны сродак адносіцца да катэгорыі буйнагабарытных.

**187.** Перавозка небяспечных грузаў і выкарыстанай для іх перавозкі неачышчанай тары ажыццяўляецца ў адпаведнасці з правіламі перавозкі небяспечных грузаў аўтамабільным транспартам, зацверджанымі Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях.

## Раздзел 25
## БУКСІРОЎКА МЕХАНІЧНЫХ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ

**188.** Буксіроўка механічнага транспартнага сродку ажыццяўляецца пры дапамозе счэпкі (гнуткай ці жорсткай) або шляхам яго частковай пагрузкі на транспартны сродак, які буксіруе.

**189.** Буксіроўка пры дапамозе счэпкі павінна ажыццяўляцца толькі пры наяўнасці кіроўцы за рулём транспартнага сродку, які буксіруецца, акрамя выпадку, калі канструкцыя жорсткай счэпкі забяспечвае рух транспартнага сродку, які буксіруецца, па траекторыі транспартнага сродку, які буксіруе.

**190.** Пры буксіроўцы аўтобуса, тралейбуса, трамвая, грузавога аўтамабіля, колавага трактара, самаходнай машыны пры дапамозе счэпкі забараняецца перавозка ў іх пасажыраў.

Пры буксіроўцы шляхам частковай пагрузкі забараняецца знаходжанне людзей у транспартным сродку, які буксіруецца, а таксама ў кузаве транспартнага сродку, які буксіруе.

**191.** Пры буксіроўцы з дапамогай гнуткай счэпкі адлегласць паміж транспартнымі сродкамі, які буксіруе і які буксіруецца, павінна быць у межах 4—6 метраў, а пры буксіроўцы з дапамогай жорсткай счэпкі — не больш за 4 метры. Для пазначэння гнуткіх сувязных звёнаў прымяняюцца папераджальныя прылады ў адпаведнасці з пунктам 206 дадзеных Правіл.

**192.** Пры буксіроўцы:

**192.1.** з дапамогай гнуткай счэпкі ў транспартнага сродку, які буксіруецца, павінны быць спраўныя рабочая тармазная сістэма і рулявое кіраванне;

**192.2.** з дапамогай жорсткай счэпкі ў транспартнага сродку, які буксіруецца, павінна быць спраўна рулявое кіраванне, акрамя выпадку, калі канструкцыя жорсткай счэпкі забяспечвае рух транспартнага сродку, які буксіруецца, па траекторыі транспартнага сродку, які буксіруе, а пры масе транспартнага сродку, які буксіруецца, больш за палову масы транспартнага сродку, які буксіруе, таксама павінна быць спраўная рабочая тармазная сістэма;

**192.3.** шляхам частковай пагрузкі дапускаюцца няспраўнасці рабочай тармазной сістэмы і рулявога кіравання транспартнага сродку, які буксіруецца.

**193.** Забараняецца буксіроўка:

**193.1.** якая ажыццяўляецца з парушэннем патрабаванняў, вызначаных у пунктах 189 – 192 дадзеных Правіл, і іншых патрабаванняў, вызначаных дадзенымі Правіламі ў дачыненні да буксіроўкі;

**193.2.** у галалёдзіцу пры дапамозе гнуткай счэпкі;

**193.3.** аўтапаяздамі;

**193.4.** матацыкламі без бакавых прычэпаў, а таксама такіх матацыклаў, акрамя буксіроўкі прычэпаў, спецыяльна прызначаных для матацыклаў;

**193.5.** механічных транспартных сродкаў на гнуткай счэпцы, калі работа іх працоўных тармазных і (або) рулявых сістэм звязана з працай рухавіка, які спынены;

**193.6.** двух і больш транспартных сродкаў, за выключэннем буксіроўкі на жорсткай счэпцы седлавога цягача з паўпрычэпам;

**193.7.** мапедаў і мапедамі, за выключэннем буксіроўкі веласіпеднага прычэпа прамысловай вытворчасці.

## Раздзел 26
## АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АБ ДОПУСКУ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ ДА ЎДЗЕЛУ Ў ДАРОЖНЫМ РУХУ, ІХ ТЭХНІЧНЫ СТАН, АБСТАЛЯВАННЕ

**194.** Забараняецца ўдзел у дарожным руху транспартнага сродку:

**194.1.** канструкцыя і тэхнічны стан якога не адпавядае патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў;

**194.2.** без усталяваных у прадугледжаных месцах рэгістрацыйных знакаў, транспартнага сродку, які мае сляды відазмянення або знішчэння рэгістрацыйных знакаў, а таксама маркіровак кузава, шасі, рамы, нанесеных на іх раней арганізацыяй

(заводам)-вытворцам (за выключэннем зарэгістраваных у вызначаным парадку);

**194.3.** з правабаковым размяшчэннем органаў кіравання транспартным сродкам (акрамя транспартных сродкаў, зарэгістраваных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь да 10 жніўня 2002 г., а таксама тых, якія належаць асобам, якія часова прыбылі ў Рэспубліку Беларусь);

**194.4.** пераабсталяванага (шляхам змянення яго тыпу і (або) прызначэння, а таксама вагавых, габарытных і іншых тэхнічных характарыстык, прадугледжаных дакументацыяй арганізацыі (завода)-вытворцы, у тым ліку шляхам абсталявання транспартнага сродку маячкамі, спецыяльнымі гукавымі сігналамі) без узгаднення з ДАІ ў парадку, вызначаным Міністэрствам унутраных спраў;

**194.5.** не зарэгістраванага ў парадку, вызначаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

**194.6.** які не прайшоў дзяржаўны тэхнічны агляд, парадак правядзення якога вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

**194.7.** пры наяўнасці няспраўнасці, названай у дадатку 4 да дадзеных Правіл;

**194.8.** з няспраўнай рабочай тармазной сістэмай, рулявым кіраваннем;

**194.9.** з няспраўнай счэпнай прыладай (у складзе аўтапоезда);

**194.10.** з фарамі і (або) заднімі габарытнымі агнямі, якія не гараць (адсутнічаюць) у цёмны час сутак на неасветленых участках дарогі і (або) пры яе недастатковай бачнасці (фарамі, якія не гараць, лічацца фары, у якіх не гарыць (не працуе) ні блізкае, ні далёкае святло);

**194.11.** з няспраўнымі шклоачышчальнікамі (падчас выпадзення ападкаў);

**194.12.** шкло якога мае ступень святлопрапускання менш за:

75 працэнтаў — для ветравога шкла (шкла, якое ўжываецца для шклення пярэдняга праёма транспартнага сродку);

70 працэнтаў — для пярэдняга бакавога шкла;

70 працэнтаў — для іншага шкла, калі на яго не нанесена арганізацыяй (заводам)-вытворцам маркіроўка, якая ўтрымлівае адно з наступных спалучэнняў знакаў: «43R», «V»; «43R», «V-VI»; «AS3»; «43R», «V», «AS3»*;

**194.13.** са знешне бачнымі наклейкамі (выявамі), акрамя апазнавальных знакаў транспартных сродкаў, што размяшчаюцца ў

* Дадзеныя патрабаванні не распаўсюджваюцца на транспартныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца для транспартнага абслугоўвання, суправаджэння і забеспячэння бяспекі службовых асоб, якія падлягаюць дзяржаўнай ахове ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

вызначаным парадку, прадугледжаных у дадатку 5 да дадзеных Правіл, дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху, рэкламы, інфармацыі аб прыналежнасці транспартнага сродку адпаведнай арганізацыі (індывідуальнаму прадпрымальніку).

**195.** Забараняецца ўдзел у дарожным руху тралейбусаў і трамваяў пры наяўнасці адной і больш няспраўнасці, названай у тэхнічных нарматыўных прававых актах, якія рэгламентуюць тэхнічны стан гэтых транспартных сродкаў.

**196.** Пры ўзнікненні няспраўнасцей, за выключэннем названых у падпунктах 194.8 – 194.11 пункта 194 дадзеных Правіл, кіроўца павінен прыняць меры да іх ліквідацыі, а калі гэта немагчыма, ён можа рухацца да месца стаянкі або рамонту, выконваючы неабходныя меры засцярогі па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху.

**197.** На механічных транспартных сродках (акрамя трамваяў і тралейбусаў) і прычэпах у прадугледжаных месцах павінны быць усталяваны рэгістрацыйныя знакі, якія адпавядаюць тэхнічным нарматыўным прававым актам. Пры гэтым:

**197.1.** забараняецца ўстаноўка рэгістрацыйных знакаў, якія адрозніваюцца ад вызначаных узораў;

**197.2.** на трамвай і тралейбус наносяцца рэгістрацыйныя нумары, якія прысвойваюцца Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

**198.** Грузавыя аўтамабілі з бартавой платформай, якія выкарыстоўваюцца для перавозкі пасажыраў, павінны быць абсталяваны сядзеннямі, замацаванымі на вышыні не менш за 0,3 метра ад верхняга краю борта ўніз да падлогі. Сядзенні, размешчаныя ўздоўж задняга і бакавых бартоў, павінны мець трывалыя спінкі.

Грузавыя аўтамабілі з кузавам-фургонам, якія выкарыстоўваюцца для перавозкі пасажыраў, павінны быць абсталяваны сядзеннямі, замацаванымі на вышыні 0,3 – 0,5 метра ад падлогі.

**199.** Механічныя транспартныя сродкі, што выкарыстоўваюцца для навучання кіраванню механічным транспартным сродкам і належаць вучэбным арганізацыям, павінны быць дадаткова абсталяваны:

**199.1.** аўтамабіль (аўтобус) — педалямі прывода счаплення і тормаза, неабходнай колькасцю люстэркаў задняга віду для асобы, якая навучае кіраванню аўтамабілем (аўтобусам), а таксама пазначаны спераду і ззаду апазнавальным знакам «Вучэбны транспартны сродак». Педалі прыводаў счаплення і тормаза

для асобы, якая навучаецца, і асобы, якая навучае кіраванню аўтамабілем (аўтобусам), дапушчаным да ўдзелу ў дарожным руху з 1 ліпеня 2003 г., павінны ўздзейнічаць на рабочы орган адпаведнай сістэмы незалежна адзін ад аднаго;

**199.2.** тралейбус і трамвай — спецыяльнай кабінай з сядзеннем і люстэркам задняга віду для асобы, якая навучае кіраванню тралейбусам або трамваем, прыводамі тормазу, а таксама пазначаны спераду і ззаду апазнавальным знакам «Вучэбны транспартны сродак».

**200.** Веласіпед павінен мець спраўную тармазную сістэму, рулявое кіраванне і гукавы сігнал, быць абсталяваным люстэркам задняга віду, спераду святлоадбівальнікам белага колеру, ззаду — святлоадбівальнікам (святлоадбівальнікамі) чырвонага колеру, а з кожнага боку — святлоадбівальнікамі аранжавага колеру.

Гужавы транспартны сродак павінен быць абсталяваны спераду святлоадбівальнікамі белага колеру, ззаду — чырвонага, мець прадугледжаныя канструкцыяй спраўную стаяначную тармазную прыладу і супрацьадкатныя ўпоры.

**201.** На транспартных сродках павінны быць усталяваны апазнавальныя знакі, названыя ў дадатку 5 да дадзеных Правіл:

**201.1.** «Аўтапоезд» — у выглядзе трох ліхтароў, якія выпраменьваюць аранжавае святло, гарызантальна размешчаных на даху кабіны, з прамежкам паміж імі ад 150 да 300 мм — на грузавых аўтамабілях і колавых трактарах (класаў цягі 1,4 тоны і вышэй) з прычэпамі, на сучлененых аўтобусах і тралейбусах або ў выглядзе верхніх габарытных ліхтароў у крайніх пярэдніх габарытных кропках даху кабіны на названых транспартных сродках;

**201.2.** «Знак аварыйнага прыпынку» — у выпадках, прадугледжаных дадзенымі Правіламі;

**201.3.** «Шыпы» — у выглядзе роўнастаронняга трохвугольніка белага колеру вяршыняй уверх з аблямоўкай чырвонага колеру, у які ўпісана літара «Ш» чорнага колеру (старана трохвугольніка — не менш за 200 мм, шырыня аблямоўкі — 1/10 стараны), — ззаду механічных транспартных сродкаў, якія маюць ашыпаваныя шыны;

**201.4.** «Вучэбны транспартны сродак» — у выглядзе роўнастаронняга трохвугольніка белага колеру вяршыняй уверх з аблямоўкай чырвонага колеру, у які ўпісана літара «У» чорнага колеру (старана трохвугольніка — не менш за 200 мм, шырыня аблямоўкі — 1/10 стараны), — спераду і ззаду механічных транспартных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца для навучання кіра-

ванню механічным транспартным сродкам (на даху легкавых аўтамабіляў усталёўваецца двухбаковы знак, які свеціцца);

**201.5.** «Абмежаванне хуткасці» — у выглядзе паменшанай каляровай выявы дарожнага знака «Абмежаванне максімальнай хуткасці» з указаннем дазволенай хуткасці руху (дыяметр знака — не менш за 160 мм, шырыня аблямоўкі — 1/10 дыяметра) — на заднім баку кузава злева механічных транспартных сродкаў, якія кіруюцца кіроўцамі са стажам менш за два гады, механічных транспартных сродкаў, якія перавозяць небяспечныя, цяжкавагавыя і (або) буйнагабарытныя грузы, а таксама ў выпадках, калі максімальная хуткасць руху транспартнага сродку па тэхнічнай характарыстыцы ніжэй за хуткасць руху, вызначаную ў пункце 89 дадзеных Правіл;

**201.6.** «Перавозка дзяцей» — у выглядзе квадрата жоўтага колеру з аблямоўкай чырвонага колеру (старана квадрата — не менш за 250 мм, шырыня аблямоўкі — 1/10 стараны) з чорнай выявай сімвала дарожнага знака «Дзеці» — спераду і ззаду аўтобусаў пры перавозцы груп дзяцей;

**201.7.** «Калона» — у выглядзе квадрата жоўтага колеру з аблямоўкай чырвонага колеру, у які ўпісана літара «К» чорнага колеру (старана квадрата — не менш за 300 мм, шырыня аблямоўкі — 1/10 стараны), — спераду і ззаду транспартных сродкаў, якія рухаюцца ў транспартнай калоне. Пры руху ў арганізаванай транспартнай калоне дадзены апазнавальны знак усталёўваецца спераду і ззаду толькі на транспартным сродку, які замыкае дадзеную калону і не з'яўляецца транспартным сродкам аператыўнага прызначэння;

**201.8.** «Ціхаходны транспартны сродак» — ззаду транспартных сродкаў;

**201.9.** «Распазнавальны знак транспартнага сродку Рэспублікі Беларусь» — на заднім баку кузава справа механічных транспартных сродкаў у адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў. Дадзены апазнавальны знак можа не ўсталёўвацца на транспартных сродках з рэгістрацыйнымі знакамі, якія змяшчаюць выяву сімвала «BY»;

**201.10.** «Буйнагабарытны груз» — у выглядзе квадрата памерам 400×400 мм з нанесенымі па дыяганалі ад левага ніжняга да правага верхняга вугла чырвонымі і белымі палосамі, якія чаргуюцца, шырынёй 50 мм са святлоадбівальнай паверхняй — на крайніх знешніх частках грузу, які выступае за габарыты транспартных сродкаў;

**201.11.** «Небяспечны груз» — у выглядзе прамавугольніка аранжавага колеру памерам 400×300 мм з аблямоўкай чорнага колеру шырынёй 15 мм, у верхняй частцы якога паказваецца

ідэнтыфікацыйны нумар віду небяспекі, у ніжняй частцы — ідэнтыфікацыйны нумар адпаведнага небяспечнага рэчыва, і «Знак небяспекі» — у выглядзе ромба са стараной 250 мм, выява якога павінна адпавядаць класу небяспечнага рэчыва, — усталёўваюцца ў адпаведнасці з правіламі перавозкі небяспечных грузаў аўтамабільным транспартам;

**201.12.** «Інвалід па слыху» — у выглядзе жоўтага круга дыяметрам 160 мм з нанесенымі ўнутры трыма чорнымі кружкамі дыяметрам 40 мм, размешчанымі па вуглах уяўнага роўнастаронняга трохвугольніка вяршыняй уніз, — спераду і ззаду механічных транспартных сродкаў, якімі кіруюць кіроўцы — інваліды па слыху;

**201.13.** «Транспартны сродак вялікай грузападымальнасці», «Транспартны сродак вялікай даўжыні».

**202.** Апазнавальныя знакі «Ціхаходны транспартны сродак», «Транспартны сродак вялікай грузападымальнасці», «Транспартны сродак вялікай даўжыні» павінны быць выраблены і ўсталяваны на транспартных сродках, а «Знак аварыйнага прыпынку» — выраблены ў адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

**203.** Па жаданні кіроўцы могуць быць усталяваны апазнавальныя знакі:

**203.1.** «Інвалід» — у выглядзе квадрата жоўтага колеру са стараной 150 мм і з выявай сімвала дарожнага знака «Інваліды» чорнага колеру — спераду і ззаду механічных транспартных сродкаў, якімі кіруюць інваліды І, ІІ групы, а таксама інваліды ІІІ групы з парушэннямі апорна-рухальнага апарата або якія перавозяць такіх інвалідаў;

**203.2.** «Урач» — у выглядзе квадрата сіняга колеру са стараной 140 мм з упісаным у яго белым кругам дыяметрам 125 мм, на які нанесены зялёны крыж (вышыня квадрата — 90 мм, шырыня рыскі штрыха — 25 мм), — спераду і ззаду аўтамабіляў, якімі кіруюць кіроўцы-ўрачы.

**204.** Дазваляецца ўстаноўка святлоадбівальных стужак (палос) чырвонага колеру ззаду і белага колеру спераду транспартных сродкаў у адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

**205.** Транспартныя сродкі (акрамя тых, якія належаць Міністэрству абароны, Міністэрству ўнутраных спраў, Міністэрству па надзвычайных сітуацыях, Камітэту дзяржаўнай бяспекі, Дзяржаўнаму пагранічнаму камітэту, іншым войскам і вайсковым фарміраванням Рэспублікі Беларусь) павінны быць пазначаны маркіроўкай з палепшанымі святлоадбівальнымі

характарыстыкамі ў выпадках, прадугледжаных тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі.

**206.** Папераджальныя прылады для абазначэння гнуткіх сувязных звёнаў пры буксіроўцы механічных транспартных сродкаў павінны выконвацца ў выглядзе сцяжкоў ці шчыткоў памерам 200×200 мм з нанесенымі на іх па дыяганалі чырвонымі і белымі палосамі, якія чаргуюцца, шырынёй 50 мм са святлоадбівальнай паверхняй. На гнуткім сувязным звяне павінна быць усталявана не менш за дзве названыя папераджальныя прылады.

**207.** Канструкцыя жорсткай буксіруючай прылады павінна адпавядаць патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

**207.1.** Пры наяўнасці снежнага покрыва рэкамендуецца ўдзел у дарожным руху транспартных сродкаў, якія абсталяваны шынамі, прызначанымі для эксплуатацыі ў зімовых умовах.

## Раздзел 27
## АБАВЯЗКІ СЛУЖБОВЫХ І ІНШЫХ АСОБ ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ БЯСПЕКІ ДАРОЖНАГА РУХУ

**208.** Службовым і іншым асобам транспартных і іншых арганізацый, адказным за тэхнічны стан і эксплуатацыю транспартных сродкаў, забараняецца дапускаць іх да ўдзелу ў дарожным руху і дапускаць кіроўцаў да кіравання транспартнымі сродкамі з парушэннем патрабаванняў, вызначаных дадзенымі Правіламі і іншымі актамі заканадаўства.

**209.** Службовыя і іншыя асобы, адказныя за эксплуатацыю дарог, дарожных збудаванняў, чыгуначных пераездаў і тэхнічных сродкаў арганізацыі дарожнага руху, абавязаны:

**209.1.** утрымліваць дарогі, дарожныя збудаванні, чыгуначныя пераезды і тэхнічныя сродкі арганізацыі дарожнага руху ў адпаведнасці з патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў у стане, бяспечным для дарожнага руху;

**209.2.** своечасова прымаць меры да абмежавання або забароны руху транспартных сродкаў па дарогах або іх асобных участках з папярэднім інфармаваннем ДАІ.

**210.** Службовыя асобы дарожных, будаўнічых і іншых арганізацый, а таксама грамадзяне, якія ажыццяўляюць на дарозе і (або) прылеглай тэрыторыі рамонтныя і іншыя работы, абавязаны:

**210.1.** арганізаваць пазначэнне месцаў правядзення на дарозе і (або) прылеглай тэрыторыі рамонтных і іншых работ, пакінутых на дарозе і (або) прылеглай тэрыторыі дарожна-будаўнічых ма-

шын, будаўнічых матэрыялаў, канструкцый і іншых аб'ектаў дарожнымі знакамі, прыладамі, якія агароджваюць і накіроўваюць, паказальнікамі аб'езду, а ў цёмны час сутак і (або) пры недастатковай бачнасці дарогі — дадаткова ліхтарамі, якія выпраменьваюць чырвонае або жоўтае святло;

**210.2.** пасля заканчэння на дарозе і (або) прылеглай тэрыторыі рамонтных і іншых работ прыняць неадкладныя меры па прывядзенні яе ў стан, які забяспечвае бесперашкодны і бяспечны дарожны рух;

**210.3.** прымаць меры па папярэджанні забруджвання дарог.

**211.** Работнікі дарожных, будаўнічых і іншых арганізацый, а таксама грамадзяне пры правядзенні на дарозе рамонтных і іншых работ павінны знаходзіцца ў адзенні павышанай бачнасці, апісанне якой вызначаецца Міністэрствам транспарту і камунікацый.

**212.** Дарожна-эксплуатацыйныя і камунальныя службы павінны прымаць неадкладныя меры па ліквідацыі наступстваў, якія ўзніклі на дарозе ў выніку надзвычайных і іншых сітуацый, якія зніжаюць бяспеку дарожнага руху, а таксама па эвакуацыі транспартных сродкаў, пашкоджаных у выніку дарожна-транспартных здарэнняў. Органы і падраздзяленні па надзвычайных сітуацыях удзельнічаюць у ліквідацыі надзвычайных сітуацый, якія ўзніклі на дарозе ў выніку дарожна-транспартных здарэнняў.

**Дадатак 1**
**да Правіл**
**дарожнага**
**руху**

## ДАРОЖНЫЯ СВЯТЛАФОРЫ

(гл. каляровы ўкладыш)

# Дарожныя знакі

## Раздзел 1
## Апісанне дарожных знакаў

**1.** Дарожныя знакі (калі не вызначана іншае, далей — знакі) вырабляюцца і ўстанаўліваюцца ў адпаведнасці з дадзеным дадаткам і патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі.

**2.** Знакі дзеляцца на:

пастаянныя і часовыя;

папераджальныя, знакі прыярытэту, забараняльныя, прадпісальныя, інфармацыйна-ўказальныя, знакі сэрвісу і знакі дадатковай інфармацыі (таблічкі) (калі не ўказана іншае, далей — таблічкі).

**3.** Знакі на жоўтым фоне належаць да часовых і прымяняюцца як асобна, так і ў спалучэнні з іншымі часовымі тэхнічнымі сродкамі арганізацыі дарожнага руху ў месцах правядзення рамонтных і іншых работ на дарозе, а таксама ў выпадках аператыўных змен у арганізацыі дарожнага руху, звязаных з забеспячэннем яго бяспекі або правядзеннем спецыяльных мерапрыемстваў.

**4.** У выпадках, калі значэнні часовых і пастаянных знакаў супярэчаць адзін аднаму, удзельнікі дарожнага руху павінны кіравацца часовымі знакамі.

### § 1. Папераджальныя знакі*

**5.** Папераджальныя знакі інфармуюць кіроўцаў аб набліжэнні да небяспечнага ўчастка дарогі, рух па якім патрабуе прыняцця мер, якія адпавядаюць дарожнай абстаноўцы.

**6.** Да папераджальных знакаў належаць наступныя:

«1.1 Чыгуначны пераезд са шлагбаумам»;

«1.2 Чыгуначны пераезд без шлагбаума»;

«1.3.1 Аднакалейная чыгунка» — пераезд праз чыгунку з адной каляінай;

«1.3.2 Шматкалейная чыгунка» — пераезд праз чыгунку з дзвюма і болей каляінамі;

«1.4.1 – 1.4.6 Набліжэнне да чыгуначнага пераезду» — дадатковае папярэджанне аб набліжэнні да чыгуначнага пераезду па-за населенымі пунктамі;

«1.5 Перасячэнне з трамвайнай лініяй»;

---

* У дадзеным дадатку выкарыстоўваюцца параграфы — структурныя элементы раздзелаў, якія аб'ядноўваюць пункты (акрамя пунктаў 1–4) і маюць скразную нумарацыю для кожнага раздзела дадатку.

«1.6 Канец дарогі з удасканаленым пакрыццём» — пераход дарогі з удасканаленым пакрыццём у гравійную або грунтавую дарогу;

«1.7 Перасячэнне з кругавым рухам»;

«1.8 Святлафорнае рэгуляванне» — скрыжаванне, пешаходны пераход або ўчастак дарогі, рух на якіх рэгулюецца святлафорам;

«1.9 Разводны мост або паромная пераправа»;

«1.10 Выезд на набярэжную» — выезд на набярэжную (бераг вадаёма);

«1.11.1, 1.11.2 Небяспечны паварот» — закругленне дарогі малога радыуса (1.11.1 — направа, 1.11.2 — налева) або з абмежаванай аглядаясцю;

«1.12.1, 1.12.2 Небяспечныя павароты» — участак дарогі з двума і болей небяспечнымі паваротамі, размешчанымі адзін за другім (1.12.1 — першы паварот направа, 1.12.2 — першы паварот налева). Пры трох і болей паваротах знак прымяняецца з таблічкай 7.7, а таксама можа прымяняцца з таблічкай 7.2.1;

«1.13 Круты спуск», «1.14 Круты пад'ём» — спуск або пад'ём, на якім дзейнічаюць спецыяльныя патрабаванні Правіл дарожнага руху (далей — Правілы), якія ўстанаўліваюць парадак дарожнага руху адпаведна на крутых спусках або крутых пад'ёмах.

Знакі 1.13, 1.14 могуць усталёўвацца без таблічкі 7.1.1 непасрэдна перад пачаткам спуску або пад'ёму, калі спускі і пад'ёмы ідуць адзін за другім;

«1.15 Слізкая дарога»;

«1.16.1 Штучная няроўнасць» — участак дарогі з вызначанай штучнай няроўнасцю (штучнымі няроўнасцямі) на праезнай частцы дарогі;

«1.16.2 Няроўная дарога» — участак дарогі з няроўнасцямі на праезнай частцы (хвалі, наплывы, грэбень і г. д.);

«1.16.3 Няроўная дарога» — участак дарогі, які мае няплаўныя спалучэнні з пакрыццём дарогі ў выглядзе наплыву (пагорка);

«1.16.4 Няроўная дарога» — участак дарогі, які мае пашкоджанні пакрыцця ў выглядзе асобных выбоінаў, прасадак;

«1.17 Выкід шчэбню» — участак дарогі з удасканаленым пакрыццём, на якім магчымы выкід шчэбню з-пад колаў транспартных сродкаў;

«1.18.1 – 1.18.6 Звужэнне дарогі» — звужэнне дарогі: 1.18.1, 1.18.4 — з абодвух бакоў, 1.18.2, 1.18.5 — справа, 1.18.3, 1.18.6 — злева;

«1.19.1, 1.19.2 Двухбаковы рух» — пачатак участка дарогі (праезнай часткі дарогі) з сустрэчным рухам пасля ўчастка дарогі з аднабаковым рухам;

«1.20 Наперадзе пешаходны пераход» — набліжэнне да нерэгулюемага пешаходнага перахода, пазначанага знакамі 5.16.1, 5.16.2 і (або) гарызантальнай дарожнай разметкай 1.14.1, 1.14.2;

«1.21 Дзеці» — участак дарогі, на якім магчыма з'яўленне дзяцей з тэрыторыі дзіцячай або іншай установы (школы, аздараўленчага летніка, бальніцы і г. д.), прылеглай непасрэдна да дарогі;

«1.22 Перасячэнне з веласіпеднай дарожкай» — месца перасячэння веласіпеднай дарожкі з дарогай па-за скрыжаваннем;

«1.23 Дарожныя работы» — участак дарогі, на якім у вызначаным парадку выконваюцца рамонтныя і іншыя работы;

«1.24 Перагон жывёлы» — участак дарогі, на якім магчыма з'яўленне жывёлы;

«1.25 Дзікія жывёлы» — участак дарогі, які праходзіць па тэрыторыі запаведнікаў (паляўнічых гаспадарак, лясных масіваў і г. д.), на якім магчыма з'яўленне дзікіх жывёл;

«1.26 Падзенне камянёў» — участак дарогі, на якім магчымыя абвалы, апоўзні, падзенне камянёў;

«1.27 Бакавы вецер» — участак дарогі, на якім магчымы моцны бакавы вецер або яго раптоўныя парывы;

«1.28 Нізка ляцяць самалёты» — участак дарогі недалёка ад аэрадромаў або над якім пралятаюць самалёты ці верталёты на невялікай вышыні;

«1.29 Аварыйна-небяспечны ўчастак» — участак дарогі, на якім часта адбываюцца дарожна-транспартныя здарэнні;

«1.30 Іншыя небяспекі» — небяспечны ўчастак дарогі, які немагчыма пазначыць іншымі папераджальнымі знакамі;

«1.31.1 – 1.31.5 Напрамак павароту» — напрамак руху на павароце дарогі малога радыуса з абмежаванай агляднасцю (знакі 1.31.1, 1.31.2, 1.31.4, 1.31.5); напрамак аб'езду перашкоды для дарожнага руху на ўчастку дарогі, які рамантуецца (знакі 1.31.1, 1.31.2); напрамак аб'езду цэнтральнага астраўка на скрыжаванні з кругавым рухам (знак 1.31.1); напрамак руху на Т-падобным скрыжаванні, разгалінаванні дарог (знакі 1.31.1 – 1.31.3); напрамак аб'езду ўчастка дарогі, які рамантуецца (знак 1.31.3);

«1.32 Небяспечная ўзбочына» — участак дарогі з заніжанай або зруйнаванай узбочынай або на якім вядуцца работы па рамонце ўзбочын;

«1.33 Галалёдзіца» — участак дарогі, на якім магчымы снежныя заносы або ледзяныя ці снежна-ледзяныя ўтварэнні;

«1.34 Затор на дарозе»;

«1.35 Сезонныя міграцыі земнаводных» — участак дарогі, на якім магчымы масавыя з'яўленні земнаводных на праезнай частцы.

**7.** Знакі 1.1, 1.2, 1.5 – 1.30, 1.32 – 1.35 устанаўліваюцца па-за населенымі пунктамі на адлегласці ад 150 да 300 метраў, а ў населеных пунктах — як правіла, на адлегласці ад 50 да 100 метраў да пачатку небяспечнага ўчастка дарогі. Пры неабходнасці (пачатак небяспечнага ўчастка дарогі схаваны ад кіроўцы крутым паваротам, пераломам падоўжнага профілю, будынкам і г. д.) названыя знакі могуць быць усталяваныя на іншай адлегласці, якая ў такім выпадку ўказваецца на таблічцы 7.1.1.

**8.** Знакі 1.1, 1.2, 1.9, 1.10, 1.21, 1.23 паўтараюцца па-за населенымі пунктамі і ўстанаўліваюцца на адлегласці ад 20 да 50 метраў да пачатку небяспечнага ўчастка дарогі. Знак 1.23 паўтараецца таксама ў населеных пунктах і ўстанаўліваецца непасрэдна ў пачатку ўчастка правядзення рамонтных і іншых работ. За пачатак участка трэба лічыць першую па ходзе руху прыладу, якая агароджвае або накіроўвае.

**9.** Знакі 1.3.1, 1.3.2, 1.31.1 – 1.31.5 ставяцца ў межах небяспечнага ўчастка дарогі або непасрэдна перад ім.

**10.** Знакі 1.4.1 – 1.4.3 ставяцца на правым баку, а знакі 1.4.4 – 1.4.6 — на левым баку дарогі.

## § 2. Знакі прыярытэту

**11.** Знакі прыярытэту ўстанаўліваюць чарговасць праезду скрыжаванняў, перасячэнняў асобных праезных частак дарог, вузкіх участкаў дарог, рух на якіх не рэгулюецца сігналамі рэгуліроўшчыка або святлафора.

**12.** Да знакаў прыярытэту належаць наступныя:

«2.1 Галоўная дарога» — даецца права пераважнага праезду скрыжавання (перасячэння праезных частак дарог);

«2.2 Канец галоўнай дарогі» — адмяняецца права пераважнага праезду скрыжавання (перасячэння праезных частак дарог);

«2.3.1 Перасячэнне з другараднай дарогай»;

«2.3.2, 2.3.3 Прымыканне другараднай дарогі» — прымыканне другараднай дарогі: 2.3.2 — справа, 2.3.3 — злева;

«2.3.4 Перасячэнне раўназначных дарог» — набліжэнне да скрыжавання роўных па значэнні дарог, на якім дзейнічаюць патрабаванні пункта 110 Правіл;

«2.4 Саступіць дарогу» — трэба саступіць дарогу транспартным сродкам, якія рухаюцца па дарозе, што перасякаецца, а пры наяўнасці таблічкі 7.13 — транспартным сродкам, якія руха-

юцца па галоўнай дарозе, а таксама справа па раўназначнай дарозе. Знак, усталяваны на галоўнай дарозе, абазначае таксама канец галоўнай дарогі;

«2.5 Рух без спынення забаронены» — забараняецца рух без спынення перад «стоп-лініяй» (гарызантальнай дарожнай разметкай 1.12), а пры яе адсутнасці — перад краем праезнай часткі дарогі, што перасякаецца. Трэба саступіць дарогу транспартным сродкам, якія рухаюцца па дарозе, што перасякаецца, а пры наяўнасці таблічкі 7.13 — транспартным сродкам, якія рухаюцца па галоўнай дарозе, а таксама справа па раўназначнай дарозе;

«2.6.1, 2.6.2 Перавага сустрэчнага руху» — забараняецца ўезд на ўчастак дарогі, калі гэта можа абцяжарыць сустрэчны рух. Трэба саступіць дарогу транспартным сродкам, якія знаходзяцца на дадзеным участку дарогі або на процілеглым пад'ездзе да яго;

«2.7 Перавага перад сустрэчным рухам» — участак дарогі, пры руху па якім кіроўца карыстаецца перавагай у дачыненні да сустрэчных транспартных сродкаў.

**13.** Знак 2.1 ставіцца непасрэдна перад скрыжаваннем, у тым ліку з таблічкай 7.13 — перад скрыжаваннем са складанай планіроўкай або на якім галоўная дарога змяняе напрамак. Пры гэтым па-за населенымі пунктамі перад скрыжаваннем, на якім галоўная дарога змяняе напрамак, знак 2.1 паўтараецца: першы знак 2.1 з таблічкамі 7.1.1 і 7.13 ставіцца на адлегласці ад 100 да 150 метраў да скрыжавання, другі знак 2.1 з таблічкай 7.13 — непасрэдна перад скрыжаваннем.

Знак 2.1, усталяваны са знакам 5.22.1 або 5.22.2, дае перавагу пры праездзе ўсіх скрыжаванняў населенага пункта, размешчаных на дадзенай дарозе.

**14.** Усталяваныя на рэгулюемых скрыжаваннях знакі 2.1, 2.4, 2.5 не вызначаюць чарговасць праезду скрыжаванняў і асобных праезных частак дарогі, а інфармуюць кіроўцаў, што скрыжаванні з'яўляюцца пазначанымі.

**15.** Знакі 2.3.1 – 2.3.3 прымяняюцца па-за населенымі пунктамі для пазначэння дарог, на якіх даецца перавага пры праездзе скрыжаванняў, і ставяцца на адлегласці ад 150 да 300 метраў да скрыжавання.

Знак 2.3.4 ставіцца па-за населенымі пунктамі на адлегласці ад 150 да 300 метраў, а ў населеных пунктах — як правіла, на адлегласці ад 50 да 100 метраў да скрыжавання.

**16.** Знак 2.4 ставіцца непасрэдна перад скрыжаваннем, а пры наяўнасці паласы разгону — перад пачаткам гэтай паласы.

Перад скрыжаваннем, на якім галоўная дарога змяняе напрамак, знак 2.4 ставіцца з таблічкай 7.13.

Па-за населенымі пунктамі на дарогах з удасканаленым пакрыццём знак 2.4 з таблічкай 7.1.1 або 7.1.2 ставіцца на адлегласці ад 150 да 300 метраў да скрыжавання. У населеных пунктах знак 2.4 з таблічкай 7.1.1 або 7.1.2 можа ставіцца на адлегласці ад 50 да 100 метраў да скрыжавання.

## § 3. Забараняльныя знакі

**17.** Забараняльныя знакі ўводзяць або адмяняюць пэўныя абмежаванні дарожнага руху.

**18.** Да забараняльных знакаў належаць наступныя:

«3.1 Уезд забаронены» — забараняецца ўезд транспартных сродкаў;

«3.2 Рух забаронены» — забараняецца рух транспартных сродкаў;

«3.3 Рух механічных транспартных сродкаў забаронены»;

«3.4 Рух грузавых аўтамабіляў забаронены» — забараняецца рух грузавых аўтамабіляў (аўтапаяздоў) з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай болей за 3,5 тоны (калі на знаку не ўказана маса) або з фактычнай масай, якая перавышае названую на знаку, а таксама колавых трактароў і самаходных машын;

«3.5 Рух матацыклаў забаронены» — забараняецца рух матацыклаў і мапедаў;

«3.6 Рух трактароў забаронены» — забараняецца рух колавых трактароў і самаходных машын;

«3.7 Рух з прычэпам забаронены» — забараняюцца рух грузавых аўтамабіляў, колавых трактароў і самаходных машын з прычэпамі, а таксама буксіроўка механічных транспартных сродкаў;

«3.8 Рух гужавых транспартных сродкаў забаронены» — забараняюцца рух гужавых транспартных сродкаў, жывёл пад сядлом або ўюком, а таксама прагон жывёлы;

«3.9 Рух веласіпедаў забаронены»;

«3.10 Рух пешаходаў забаронены»;

«3.11.1, 3.11.2 Абмежаванне масы» — забараняецца рух транспартных сродкаў, у тым ліку аўтапаяздоў, агульная фактычная маса якіх большая за названую на знаку;

«3.12.1, 3.12.2 Абмежаванне нагрузкі на вось» — забараняецца рух транспартных сродкаў, у якіх фактычная нагрузка на любую вось большая за названую на знаку;

«3.13 Абмежаванне вышыні» — забараняецца рух транспартных сродкаў, габарытная вышыня якіх (з грузам або без груза) большая за названую на знаку;

«3.14 Абмежаванне шырыні» — забараняецца рух транспартных сродкаў, габарытная шырыня якіх (з грузам або без груза) большая за названую на знаку;

«3.15.1, 3.15.2 Абмежаванне даўжыні» — забараняецца рух транспартных сродкаў (аўтапаяздоў), габарытная даўжыня якіх (з грузам або без груза) большая за названую на знаку;

«3.16 Абмежаванне мінімальнай дыстанцыі» — забараняецца рух транспартных сродкаў з дыстанцыяй паміж імі меншай за названую на знаку;

«3.17.1 Мытня» — забараняецца праезд без спынення каля мытні (кантрольнага пункта). Дазвол на далейшы рух дае супрацоўнік мытні (кантрольнага пункта);

«3.17.2 Небяспека» — забараняецца рух усіх без выключэння транспартных сродкаў у сувязі з дарожна-транспартным здарэннем, аварыяй, стыхійным бедствам або іншай небяспекай для руху;

«3.18.1 Паварот направа забаронены»;

«3.18.2 Паварот налева забаронены» — забараняецца паварот налева, пры гэтым разварот дазваляецца;

«3.19 Разварот забаронены» — забараняецца разварот, пры гэтым паварот налева дазваляецца;

«3.20.1, 3.20.2 Абгон забаронены» — забараняецца абгон транспартных сродкаў, акрамя адзінкавых, якія рухаюцца з хуткасцю меншай за 30 км/г;

«3.20.3 Абгон забаронены» — забараняецца абгон транспартных сродкаў, хуткасць руху якіх большая за названую на знаку;

«3.21.1, 3.21.2 Канец зоны забароны абгону»;

«3.22 Абгон грузавым аўтамабілям забаронены» — грузавым аўтамабілям з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай болей за 3,5 тоны забараняецца абгон транспартных сродкаў, акрамя адзінкавых, якія рухаюцца з хуткасцю меншай за 30 км/г. Колавым трактарам і самаходным машынам забараняецца абгон транспартных сродкаў, акрамя адзінкавых веласіпедаў, гужавых транспартных сродкаў;

«3.23 Канец зоны забароны абгону грузавым аўтамабілям»;

«3.24.1, 3.24.2 Абмежаванне максімальнай хуткасці» — забараняецца рух з хуткасцю (км/г), якая перавышае названую на знаку;

«3.25.1, 3.25.2 Канец зоны абмежавання максімальнай хуткасці»;

«3.26 Падача гукавога сігнала забароненая» — забараняецца карыстацца гукавым сігналам, акрамя выпадку падачы яго для прадухілення дарожна-транспартнага здарэння;

«3.27 Прыпынак забаронены» — забараняюцца прыпынак і стаянка транспартных сродкаў;

«3.28 Стаянка забароненая»;

«3.29 Стаянка забароненая па няцотных чыслах месяца»;

«3.30 Стаянка забароненая па цотных чыслах месяца».

При адначасовым прымяненні знакаў 3.29 і 3.30 на процілеглых баках дарогі транспартныя сродкі павінны быць перастаўлены з аднаго яе боку на іншы ў перыяд з 19 да 24 гадзін;

«3.31 Канец зоны ўсіх абмежаванняў» — знак канца зоны дзеяння наступных знакаў: 3.16, 3.20.1 – 3.20.3, 3.22, 3.24.1, 3.24.2, 3.26 – 3.30;

«3.32 Рух транспартных сродкаў з небяспечнымі грузамі забаронены» — забараняецца рух транспартных сродкаў з апазнавальнымі знакамі «Небяспечны груз».

**19.** Дзеянне не распаўсюджваецца:

знакаў 3.1 – 3.3, 3.18.1 – 3.19, 3.27 — на маршрутныя транспартныя сродкі, якія рухаюцца па вызначаных маршрутах;

знакаў 3.2 – 3.8 — на транспартныя сродкі дарожна-эксплуатацыйнай і камунальнай службаў, аўтамабілі з нахіленай белай паласой на бартах і на іншыя транспартныя сродкі, якія абслугоўваюць гандлёвыя і іншыя арганізацыі, размешчаныя ў пазначанай зоне (грамадзянаў, якія пражываюць або працуюць у дадзенай зоне), а таксама на транспартныя сродкі, якія належаць грамадзянам, якія пражываюць або працуюць у гэтай зоне, пры адсутнасці іншых магчымасцей іх пад'езда. Такія транспартныя сродкі павінны ўязджаць у пазначаную зону і выязджаць з яе на бліжэйшым да месца прызначэння скрыжаванні;

знакаў 3.2, 3.3, 3.28 – 3.30 — на транспартныя сродкі, якія кіруюцца інвалідамі I або II групы, III групы з парушэннямі апорна-рухальнага апарата, або транспартныя сродкі, якія перавозяць інвалідаў гэтых груп;

знака 3.4 — на грузавыя аўтамабілі, прызначаныя для перавозкі пасажыраў;

знакаў 3.27 – 3.30 — на месцы, пазначаныя знакам 5.15;

знакаў 3.28 – 3.30 — на таксі з уключаным таксометрам.

**20.** Дзеянне распаўсюджваецца:

знакаў 3.10, 3.27 – 3.30 — толькі на той бок дарогі, у якім (над якім) яны ўсталяваны. Дзеянне знакаў 3.27 – 3.30, усталяваных

на тэрыторыі, прылеглай да дарогі, распаўсюджваецца на гэтую тэрыторыю з улікам патрабаванняў таблічак, усталяваных з такімі знакамі;

знакаў 3.16, 3.20.1, 3.20.3, 3.22, 3.24.1, 3.24.2, 3.26 – 3.30 — ад месца ўстаноўкі знака да бліжэйшага пазначанага скрыжавання, пры гэтым у населеным пункце без пазначанага скрыжавання — да канца населенага пункта;

знакаў 3.18.1 і 3.18.2 — на скрыжаванне, перад якім усталяваны знак, а таксама на бліжэйшае перасячэнне праезных частак дарог на скрыжаванні, калі дарога, на якую ажыццяўляецца паварот, утрымлівае раздзяляльную паласу (раздзяляльную зону);

знакаў 3.24.1, 3.24.2, усталяваных перад населеным пунктам, пазначаным знакам 5.22.1 або 5.22.2, — да гэтага знака.

**21.** Зона дзеяння можа быць зменшана для:

знакаў 3.16, 3.26 — прымяненнем таблічкі 7.2.1;

знакаў 3.20.1 – 3.20.3, 3.22, 3.24.1, 3.24.2 — усталяваннем у канцы зоны іх дзеяння адпаведна знакаў 3.21.1, 3.21.2, 3.23, 3.25.1, 3.25.2 або прымяненнем таблічкі 7.2.1;

знакаў 3.24.1, 3.24.2 — усталяваннем гэтых знакаў з іншым значэннем максімальнай хуткасці руху;

знакаў 3.27 – 3.30 — прымяненнем таблічак 7.2.1, 7.2.2 або ўсталяваннем у канцы зоны іх дзеяння паўторных знакаў 3.27 – 3.30 з таблічкай 7.2.3.

## § 4. Прадпісальныя знакі

**22.** Прадпісальныя знакі прымяняюцца для пазначэння неабходных напрамкаў, умоў і рэжымаў руху.

**23.** Да прадпісальных знакаў належаць наступныя:

«4.1.1 Рух прама»;

«4.1.2 Рух направа»;

«4.1.3 Рух налева»;

«4.1.4 Рух прама або направа»;

«4.1.5 Рух прама або налева»;

«4.1.6 Рух направа або налева».

Знакі 4.1.1 – 4.1.6 дазваляюць рух толькі ў напрамках, паказаных стрэлкамі. Знакі 4.1.3, 4.1.5, 4.1.6 таксама дазваляюць разварот з крайняй левай паласы руху.

Могуць прымяняцца знакі са змененай канфігурацыяй стрэлак, якая адпавядае паказаным напрамкам руху на канкрэтным скрыжаванні;

«4.2.1 Аб'езд перашкоды справа», «4.2.2 Аб'езд перашкоды злева» — аб'езд астраўкоў бяспекі і рознага роду перашкодаў для дарожнага руху, якія знаходзяцца на праезнай частцы дарогі, дазваляецца толькі з боку, паказанага стрэлкай;

«4.2.3 Аб'езд перашкоды справа або злева» — аб'езд астраўкоў бяспекі і рознага роду перашкодаў для дарожнага руху, якія знаходзяцца на праезнай частцы дарогі, дазваляецца з любога боку;

«4.3 Кругавы рух» — дазваляецца аб'езд цэнтральнага астраўка на скрыжаванні (плошчы) з кругавым рухам толькі ў напрамку, паказаным стрэлкамі;

«4.4 Рух легкавых аўтамабіляў» — дазваляецца рух толькі легкавых аўтамабіляў і матацыклаў;

«4.5.1 Веласіпедная дарожка» — дазваляецца рух толькі на веласіпедах, а пры адсутнасці тратуара або пешаходнай дарожкі — і рух пешаходаў, пры гэтым пешаходы не павінны ствараць перашкодаў для руху веласіпедыстаў. На знак можа быць дадаткова нанесены сілуэт пешахода;

«4.5.2 Канец веласіпеднай дарожкі» — канец зоны дзеяння знака 4.5.1. На знак можа быць дадаткова нанесены сілуэт пешахода;

«4.6.1 Пешаходная дарожка» — дазваляецца рух толькі пешаходам, а пры адсутнасці веласіпеднай дарожкі — і на веласіпедах, пры гэтым веласіпедысты не павінны ствараць перашкодаў для руху пешаходаў. На знак можа быць дадаткова нанесены сілуэт веласіпеда;

«4.6.2 Канец пешаходнай дарожкі» — канец зоны дзеяння знака 4.6.1. На знак можа быць дадаткова нанесены сілуэт веласіпеда;

«4.7 Абмежаванне мінімальнай хуткасці» — дазваляецца рух толькі з названай або з большай хуткасцю, але не болей за прадугледжаную пунктамі 88 і 89 Правіл;

«4.8 Канец зоны абмежавання мінімальнай хуткасці»;

«4.9.1 – 4.9.3 Напрамак руху транспартных сродкаў з небяспечнымі грузамі» — рух транспартных сродкаў з апазнавальнымі знакамі «Небяспечны груз» дазваляецца толькі ў напрамку, паказаным на знаку: 4.9.1 — налева, 4.9.2 — прама, 4.9.3 — направа;

«4.10.1 Дарожка для коннікаў» — дазваляецца рух толькі коннікам;

«4.10.2 Канец дарожкі для коннікаў».

**24.** Дзеянне знакаў 4.1.1 – 4.1.6, усталяваных перад скрыжаваннем, распаўсюджваецца на ўсё скрыжаванне, калі знакі 4.1.1 – 4.1.6

або 5.8.1, 5.8.2, усталяваныя на ім, не даюць іншых прадпісанняў (указанняў).

Дзеянне знакаў 4.1.1 – 4.1.6 не распаўсюджваецца на маршрутныя транспартныя сродкі, якія рухаюцца па вызначаных маршрутах.

Дзеянне знака 4.1.1, усталяванага за скрыжаваннем, распаўсюджваецца да наступнага пазначанага скрыжавання. Зона дзеяння дадзенага знака можа быць паменшана прымяненнем таблічкі 7.2.1.

**25.** Знакі 4.2.1 і 4.2.2 могуць прымяняцца групамі (не менш за тры знакі) для пазначэння лініі адхілення траекторыі руху транспартных сродкаў ад перашкоды для дарожнага руху.

**26.** Дзеянне знакаў 4.4, 4.7, усталяваных з таблічкай 7.14 і размешчаных над паласой руху, распаўсюджваецца толькі на дадзеную паласу. Пры адсутнасці таблічкі 7.14 дзеянне гэтых знакаў распаўсюджваецца на ўсе палосы праезнай часткі дарогі дадзенага напрамку. Дзеянне знакаў 4.4, 4.7, выявы якіх нанесеныя на поле знакаў 5.8.1, 5.8.2, 5.8.7, 5.8.8, распаўсюджваецца на адпаведныя палосы руху.

**27.** Дзеянне знакаў 4.9.1 – 4.9.3 распаўсюджваецца на бліжэйшае скрыжаванне.

## § 5. Інфармацыйна-ўказальныя знакі

**28.** Інфармацыйна-ўказальнымі знакамі ўводзяцца або адмяняюцца пэўныя рэжымы руху, а таксама інфармуюцца ўдзельнікі дарожнага руху аб размяшчэнні населеных пунктаў і іншых аб'ектаў.

**29.** Да інфармацыйна-ўказальных знакаў належаць наступныя:

«5.1 Аўтамагістраль», «5.2 Канец аўтамагістралі».

Знакі інфармуюць аб пачатку і канцы дарогі, на якой дзейнічаюць спецыяльныя патрабаванні Правіл, якія ўстанаўліваюць парадак дарожнага руху на аўтамагістралі;

«5.3 Дарога для аўтамабіляў» — дарога, прызначаная для руху толькі аўтамабіляў, аўтобусаў і матацыклаў;

«5.4 Канец дарогі для аўтамабіляў»;

«5.5 Дарога з аднабаковым рухам» — дарога або канструктыўна аддзеленая праезная частка дарогі, па якой рух транспартных сродкаў па ўсёй шырыні ажыццяўляецца ў адным напрамку;

«5.6 Канец дарогі з аднабаковым рухам»;

«5.7.1, 5.7.2 Выезд на дарогу з аднабаковым рухам» — выезд на дарогу, па якой рух транспартных сродкаў дазволены толькі ў напрамку, паказаным на знаку;

«5.8.1 Напрамкі руху па палосах» — колькасць палос руху на скрыжаванні і дазволеныя напрамкі руху па кожнай з іх;

«5.8.2 Напрамак руху па паласе» — дазволены напрамак (напрамкі) руху па паласе.

На знаках 5.8.1, 5.8.2 можа быць адлюстравана інфармацыя аб абмежаваннях дарожнага руху на скрыжаванні (нанесены выявы забараняльных або прадпісальных знакаў). Знакі 5.8.1, 5.8.2, якія дазваляюць паварот налева з крайняй левай паласы руху, дазваляюць і разварот з гэтай паласы. Канфігурацыя стрэлак можа быць зменена ў адпаведнасці з канфігурацыяй канкрэтнага скрыжавання.

Дзеянне знакаў 5.8.1, 5.8.2, усталяваных перад скрыжаваннем, распаўсюджваецца на ўсё скрыжаванне, калі знакі 5.8.1, 5.8.2 або 4.1.1 – 4.1.6, усталяваныя на скрыжаванні, не даюць іншых указанняў;

«5.8.3 Пачатак паласы» — пачатак дадатковай паласы руху на пад'ёме або паласы тармажэння.

Калі на знаку, усталяваным перад дадатковай паласой руху, нанесена выява знака 4.4 або 4.7, то кіроўца транспартнага сродку, які не можа працягнуць рух па асноўнай паласе з улікам патрабаванняў названых знакаў, павінен перастроіцца на дадатковую паласу руху;

«5.8.4 Пачатак паласы» — пачатак участка сярэдняй паласы трохпалоснай дарогі, прызначанага для руху ў дадзеным напрамку, або пачатак паласы тармажэння для павароту налева або развароту;

«5.8.5 Канец паласы» — канец дадатковай паласы руху на пад'ёме або паласы разгону;

«5.8.6 Канец паласы» — канец паласы, прызначанай для руху ў дадзеным напрамку;

«5.8.7, 5.8.8 Напрамак руху па палосах».

Калі на знаку 5.8.7 нанесена выява забараняльнага або прадпісальнага знака, то названыя абмежаванні, умовы або рэжымы руху ўводзяцца на адпаведнай паласе руху.

Часткі знакаў 5.8.7, 5.8.8, якія абазначаюць колькасць палос для сустрэчных напрамкаў руху, могуць быць выкананы ў выглядзе асобных знакаў, усталяваных на невялікай адлегласці адзін ад аднаго;

«5.9.1 Паласа для маршрутных транспартных сродкаў» — паласа, прызначаная для руху толькі маршрутных транспартных сродкаў;

«5.9.2 Канец паласы для маршрутных транспартных сродкаў»;

«5.10.1 Дарога з паласой для маршрутных транспартных сродкаў» — дарога, па якой рух маршрутных транспартных сродкаў ажыццяўляецца па спецыяльна выдзеленай паласе насустрач агульнаму патоку транспартных сродкаў;

«5.10.2, 5.10.3 Выезд на дарогу з паласой для маршрутных транспартных сродкаў»;

«5.10.4 Канец дарогі з паласой для маршрутных транспартных сродкаў»;

«5.11.1 Месца для развароту»;

«5.11.2 Зона для развароту» — пачатак зоны для развароту транспартных сродкаў і яе даўжыня;

«5.12.1 Пункт прыпынку аўтобуса і (або) тралейбуса».

Знак пазначае пачатак пасадачнай пляцоўкі пункта прыпынку аўтобуса і (або) тралейбуса. Па-за населенымі пунктамі знак можа быць усталяваны на павільёне з боку прыбыцця маршрутных транспартных сродкаў.

У ніжняй частцы знака можа быць нанесена выява таблічкі 7.2.1 з указаннем адлегласці, роўнай працягласці пасадачнай пляцоўкі;

«5.12.2 Месца прыпынку аўтобуса і (або) тралейбуса».

Знак можа ставіцца ў канцы пасадачнай пляцоўкі пункта прыпынку аўтобуса і (або) тралейбуса. Пад знакам размяшчаецца таблічка (таблічкі) з інфармацыяй аб разнавіднасці транспарту агульнага карыстання (аўтобус — літарны індэкс «А», тралейбус — «Т») і аб рэжыме яго руху (расклад);

«5.13.1 Пункт прыпынку трамвая».

Знак пазначае пачатак зоны пункта прыпынку трамвая. У ніжняй частцы знака можа быць нанесена выява таблічкі 7.2.1 з указаннем адлегласці, роўнай працягласці зоны пункта прыпынку трамвая;

«5.13.2 Месца прыпынку трамвая».

Знак можа ставіцца ў канцы зоны пункта прыпынку трамвая. Пад знакам размяшчаецца таблічка з інфармацыяй аб маршрутах і рэжыме руху трамваяў (расклад);

«5.14.1 Пункт прыпынку экспрэс-маршрута».

Знак пазначае пачатак пасадачнай пляцоўкі пункта прыпынку транспартнага сродку, які ажыццяўляе рух па рэгулярным экспрэсным маршруце.

Дадзены пункт прыпынку можа быць адзначаны двума знакамі 5.14.1, усталяванымі ў пачатку і ў канцы пасадачнай пляцоўкі. У гэтым выпадку ў ніжняй частцы першага па ходзе руху знака можа быць нанесена выява таблічкі 7.2.1 з указан-

нем працягласці пасадачнай пляцоўкі, а таксама інфармацыя аб колькасці транспартных сродкаў, якім дазволена адначасова знаходзіцца на пункце прыпынку;

«5.14.2 Месца стаянкі таксі».

Знак пазначае зону на праезнай частцы дарогі або спецыяльную пляцоўку, прызначаную толькі для стаянкі таксі. На знаку можа быць названа колькасць таксі, якім дазволена адначасова знаходзіцца на стаянцы.

У населеных пунктах зона стаянкі таксі можа быць пазначана двума знакамі 5.14.2, адзін з якіх ставіцца ў пачатку зоны з таблічкай 7.2.1, другі — у канцы зоны стаянкі;

«5.15 Месца стаянкі».

Знак пазначае спецыяльную пляцоўку, зону на праезнай частцы дарогі або на тратуары, якія адведзеныя для стаянкі транспартных сродкаў. Для ўдакладнення напрамку руху, адлегласці да спецыяльнай пляцоўкі і дазволеных на ёй умоў стаянкі са знакам 5.15 могуць прымяняцца таблічкі;

«5.16.1, 5.16.2 Пешаходны пераход».

Знакі пазначаюць зону для перахода пешаходамі праезнай часткі дарогі. На пешаходных пераходах шырынёй болей за 10 метраў са знакам 5.16.2 можа быць усталявана таблічка 7.2.1 або 7.2.2, на якой указваецца шырыня зоны пешаходнага перахода;

«5.17.1, 5.17.2 Падземны пешаходны пераход»;

«5.17.3, 5.17.4 Надземны пешаходны пераход»;

«5.18.1 Рэкамендаваная хуткасць».

Зона дзеяння знака распаўсюджваецца да знака 5.18.2 або да знака 5.18.1 з іншым значэннем рэкамендаванай хуткасці або да бліжэйшага пазначанага скрыжавання, а пры прымяненні знака 5.18.1 з папераджальным знакам вызначаецца працягласцю небяспечнага ўчастка дарогі;

«5.18.2 Канец дзеяння знака «Рэкамендаваная хуткасць»;

«5.19.1 – 5.19.3 Тупік» — дарога без скразнога праезду;

«5.20.1, 5.20.2 Папярэдні паказальнік напрамкаў» — напрамак руху да населеных пунктаў або іншых аб'ектаў.

На знаках могуць быць нанесены сімвалы аўтамагістралі, аэрапорта, выявы знакаў 5.29.1, 5.29.2, а таксама іншых сімвалаў і знакаў, якія інфармуюць аб асаблівасцях дарожнага руху.

У ніжняй частцы знака 5.20.1 указваецца адлегласць ад месца яго ўстаноўкі да скрыжавання або пачатку паласы тармажэння.

Знак 5.20.1 прымяняецца таксама для паказання схемы маршрута аб'езду ўчасткаў дарог, на якіх усталяваны адзін з забаранальных знакаў 3.4, 3.6, 3.11.1, 3.12.1, 3.13–3.15.1. У гэтым выпадку на знаку павінны быць нанесены схема маршрута аб'езду і выява адпаведнага забаранальнага знака;

«5.20.3 Схема руху» — маршрут руху на скрыжаванні ў выпадку забароны асобных манеўраў, паказванне дазволеных напрамкаў руху на скрыжаванні са складанай планіроўкай;

«5.21.1 Паказальнік напрамку», «5.21.2 Паказальнік напрамкаў» — напрамак (напрамкі) руху да населеных пунктаў або іншых аб'ектаў.

На знаках могуць быць нанесены адлегласці да названых на іх аб'ектаў, сімвалы аўтамагістралі, аэрапорта, выявы знакаў 5.29.1, 5.29.2, а таксама іншых сімвалаў і знакаў, якія інфармуюць аб асаблівасцях дарожнага руху;

«5.22.1, 5.22.2 Пачатак населенага пункта» — пачатак населенага пункта, у якім дзейнічаюць спецыяльныя патрабаванні Правіл, якія ўстанаўліваюць парадак дарожнага руху ў населеных пунктах;

«5.23.1, 5.23.2 Канец населенага пункта» — месца дарогі, з якога губляюць сілу спецыяльныя патрабаванні Правіл, якія ўстанаўліваюць парадак дарожнага руху ў населеных пунктах;

«5.24 Пачатак мяжы населенага пункта» — пачатак мяжы населенага пункта, пры руху па якім на дадзенай дарозе не дзейнічаюць спецыяльныя патрабаванні Правіл, якія ўстанаўліваюць парадак дарожнага руху ў населеных пунктах;

«5.25 Канец мяжы населенага пункта» — канец мяжы населенага пункта, пазначанага знакам 5.24;

«5.26.1 Найменне аб'екта» — найменне аб'екта, які не з'яўляецца населеным пунктам (рака, возера, славутасці і г. д.), а таксама знак між адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі і тэрытарыяльнымі адзінкамі;

«5.26.2 Найменне аб'екта» — найменне аб'екта ў населеным пункце (назва вуліцы, тэатра, музея і г. д.);

«5.27 Паказальнік адлегласцей» — адлегласць да населеных пунктаў або іншых аб'ектаў (км);

«5.28 Кіламетровы знак» — адлегласць ад пачатку дарогі (км);

«5.29.1 Нумар дарогі» — нумар дарогі, на якой усталяваны дадзены знак.

На знаках 5.29.1, 5.29.3 з зялёным фонам называецца нумар дарогі, уключанай у Еўрапейскую сістэму аўтамабільных магістралей, з чырвоным фонам — нумар магістральнай або

рэспубліканскай дарогі, з белым фонам — нумар мясцовай дарогі;

«5.29.2 Нумар дарогі» — нумар дарогі, у напрамку да якой ажыццяўляецца рух;

«5.29.3 Нумар і напрамак дарогі»;

«5.30.1 – 5.30.3 Напрамак руху грузавых аўтамабіляў» — напрамак, які рэкамендуецца для руху грузавых аўтамабіляў, колавых трактароў і самаходных машын, калі іх рух на скрыжаванні ў адным або некалькіх напрамках забаронены;

«5.31 Схема аб'езду» — маршрут аб'езду ўчастка дарогі, часова зачыненага для руху;

«5.32.1 – 5.32.3 Напрамак аб'езду» — напрамак аб'езду ўчастка дарогі, часова зачыненага для руху;

«5.33 Стоп-лінія» — месца прыпынку транспартных сродкаў пры забараняльным сігнале рэгуліроўшчыка, святлафора;

«5.34.1, 5.34.2 Папярэдні паказальнік перастраення на іншую праезную частку» — адпаведна напрамак аб'езду ўчастка праезнай часткі дарогі з раздзяляльнай паласой, часова зачыненага для руху, і напрамак руху для вяртання на правую праезную частку дарогі;

«5.35 Рэверсіўны рух» — пачатак участка дарогі, на адной або некалькіх палосах якога напрамак руху можа мяняцца на процілеглы;

«5.36 Канец рэверсіўнага руху»;

«5.37 Выезд на дарогу з рэверсіўным рухам»;

«5.38 Жылая зона», «5.39 Канец жылой зоны».

Знакі інфармуюць адпаведна аб пачатку і канцы тэрыторыі, на якой дзейнічаюць спецыяльныя патрабаванні Правіл, якія ўстанаўліваюць парадак дарожнага руху ў жылых зонах;

«5.40 Пешаходная зона», «5.41 Канец пешаходнай зоны».

Знакі інфармуюць адпаведна аб пачатку і канцы тэрыторыі, на якой дзейнічаюць спецыяльныя патрабаванні Правіл, якія ўстанаўліваюць парадак дарожнага руху ў пешаходных зонах.

**30.** Зялёны або сіні фон знакаў 5.20.1 – 5.21.2, усталяваных па-за населеным пунктам (уставак на знаках 5.20.1, 5.20.2, асобных палёў знака 5.21.2), інфармуе аб тым, што рух да названага населенага пункта або да іншага аб'екта будзе ажыццяўляцца адпаведна па аўтамагістралі або па іншай дарозе. Зялёны або сіні фон усталяваных у населеным пункце знакаў 5.20.1 – 5.21.2 інфармуе аб тым, што пасля выезда з дадзенага населенага пункта рух да названага на знаку населенага пункта або да

іншага аб'екта будзе ажыццяўляцца адпаведна па аўтамагістралі або па іншай дарозе, белы фон — аб тым, што названы аб'ект знаходзіцца ў дадзеным населеным пункце.

**31.** Фон знакаў 5.24 – 5.26.1, 5.27, 5.28, усталяваных на аўтамагістралі, — зялёны.

## § 6. Знакі сэрвісу

**32.** Знакі сэрвісу інфармуюць аб распалажэнні адпаведных аб'ектаў.

**33.** Да знакаў сэрвісу належаць наступныя:

«6.1 Пункт першай медыцынскай дапамогі»;

«6.2 Бальніца»;

«6.3.1 – 6.3.3 Аўтазаправачная станцыя».

Знакам 6.3.2 пазначаюцца толькі газавыя аўтазаправачныя станцыі, знакам 6.3.3 — сумесныя аўтазаправачныя станцыі;

«6.4 Тэхнічнае абслугоўванне аўтамабіляў»;

«6.5 Мыйка аўтамабіляў»;

«6.6 Тэлефон»;

«6.7 Пункт харчавання»;

«6.8 Пітная вада»;

«6.9 Гасцініца або матэль»;

«6.10 Кемпінг»;

«6.11 Месца адпачынку»;

«6.12.1 Міліцыя»;

«6.12.2 ДАІ»;

«6.13 Туалет»;

«6.14 Пункт кантролю аўтамабільных перавозак»;

«6.15 Славутасць».

## § 7. Знакі дадатковай інфармацыі (таблічкі)

**34.** Знакі дадатковай інфармацыі (таблічкі) удакладняюць або абмяжоўваюць дзеянне іншых дарожных знакаў.

**35.** Да знакаў дадатковай інфармацыі (таблічак) належаць наступныя:

«7.1.1 – 7.1.4 Адлегласць да аб'екта».

**Таблічкі паказваюць:**

7.1.1 — адлегласць ад знака да пачатку небяспечнага ўчастка дарогі або да месца, з якога пачынае дзейнічаць абмежаванне дарожнага руху, або да пэўнага аб'екта (месца), размешчанага па ходзе руху;

7.1.2 — адлегласць ад знака 2.4 да скрыжавання, калі непасрэдна перад скрыжаваннем усталяваны знак 2.5;

7.1.3 , 7.1.4 — адлегласць да аб'екта, размешчанага ўзбоч ад дарогі;

«7.2.1 – 7.2.6 Зона дзеяння».

**Таблічкі:**

7.2.1 — указвае працягласць небяспечнага ўчастка дарогі, пазначанага папераджальнымі знакамі, або зону дзеяння забараняльных, прадпісальных або інфармацыйна-ўказальных знакаў;

7.2.2 — паказвае зону дзеяння знакаў 3.27 – 3.30, калі яна не распаўсюджваецца да бліжэйшага пазначанага скрыжавання, а таксама шырыню зоны пешаходнага перахода, пазначанага знакамі 5.16.1, 5.16.2;

7.2.3 — пазначае канец зоны дзеяння знакаў 3.27 – 3.30;

7.2.4 — інфармуе кіроўцаў аб знаходжанні транспартных сродкаў у зоне дзеяння знакаў 3.27 – 3.30;

7.2.5, 7.2.6 — паказваюць напрамак і зону дзеяння знакаў 3.27 – 3.30 справа і (або) злева ад іх;

«7.3.1 – 7.3.3 Напрамак дзеяння».

Таблічкі паказваюць напрамак дзеяння знакаў, усталяваных перад скрыжаваннем, або напрамак руху да пазначаных аб'ектаў, якія знаходзяцца непасрэдна каля дарогі;

«7.4.1 – 7.4.8 Від транспартнага сродку».

Таблічкі паказваюць від транспартнага сродку, на які распаўсюджваецца дзеянне знака. Пры гэтым таблічка 7.4.1 распаўсюджвае дзеянне знака на грузавыя аўтамабілі (у тым ліку з прычэпам) з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай большай за 3,5 тоны, таблічка 7.4.3 — на легкавыя аўтамабілі, а таксама на грузавыя аўтамабілі з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай да 3,5 тоны ўключна;

«7.5.1 Суботнія, нядзельныя і святочныя дні», «7.5.2 Працоўныя дні», «7.5.3 Дні тыдня», «7.5.4 – 7.5.7 Час дзеяння».

**Таблічкі паказваюць:**

7.5.1 – 7.5.3 — дні тыдня, на працягу якіх дзейнічае знак;

7.5.4 — час сутак, на працягу якога дзейнічае знак;

7.5.5 – 7.5.7 — дні тыдня і час сутак, на працягу якіх дзейнічае знак;

«7.6.1 – 7.6.18 Спосаб пастаноўкі транспартнага сродку на стаянку».

Таблічкі 7.6.1, 7.6.10 указваюць, што ўсе транспартныя сродкі павінны быць пастаўлены на стаянку на праезнай частцы дарогі ўздоўж тратуара адпаведна злева або справа ад яго.

Таблічкі 7.6.2—7.6.9, 7.6.11—7.6.18 паказваюць спосабы пастаноўкі легкавых аўтамабіляў і матацыклаў на стаянку. Прыпынак і стаянка іншых транспартных сродкаў забараняюцца;

«7.7 Колькасць небяспечных паваротаў».

Таблічка ставіцца са знакамі 1.12.1, 1.12.2 і інфармуе аб колькасці небяспечных паваротаў, размешчаных адзін за адным;

«7.8 Платныя паслугі»;

«7.9 Абмежаванне працягласці стаянкі».

Таблічка паказвае максімальную працягласць знаходжання транспартнага сродку на стаянцы, пазначанай знакам 5.15;

«7.10 Месца для агляду аўтамабіляў».

Таблічка паказвае, што на пляцоўцы, пазначанай знакам 5.15 або 6.11, ёсць аглядная канава для агляду транспартных сродкаў;

«7.11 Абмежаванне максімальнай масы».

Таблічка паказвае, што дзеянне знака распаўсюджваецца толькі на транспартныя сродкі з фактычнай масай болей за пазначаную на таблічцы;

«7.12 Нанясенне разметкі».

Таблічка ставіцца са знакам 1.23 і інфармуе аб правядзенні работ па нанясенні дарожнай разметкі;

«7.13 Напрамак галоўнай дарогі».

Таблічка ставіцца са знакамі 2.1, 2.4, 2.5 і паказвае напрамак галоўнай дарогі на скрыжаванні;

«7.14 Паласа руху».

Таблічка паказвае паласу руху, на якую распаўсюджваецца дзеянне святлафора або знака;

«7.15 Пешаходы — інваліды па зроку».

Таблічка паказвае, што пешаходным пераходам часта карыстаюцца інваліды па зроку;

«7.16 Вільготнае пакрыццё».

Таблічка паказвае, што дзеянне знака распаўсюджваецца толькі на перыяд часу, калі пакрыццё праезнай часткі дарогі з'яўляецца вільготным;

«7.17 Інваліды».

Таблічка выкарыстоўваецца з дарожным знакам 5.15 і інфармуе, што стаяначная пляцоўка або яе частка адведзена для стаянкі транспартных сродкаў з апазнавальным знакам «Інвалід»;

«7.18 Акрамя інвалідаў».

Таблічка паказвае, што дзеянне знака не распаўсюджваецца на транспартныя сродкі з апазнавальным знакам «Інвалід»;

«7.19 Клас небяспечнага грузу».

Таблічка ставіцца са знакам 3.32 і ўказвае нумар класа небяспечнага груза, з якім рух транспартных сродкаў забаронены;

«7.20 Эвакуатар».

Таблічка ставіцца са знакамі 3.27 – 3.30 і інфармуе аб магчымай эвакуацыі (блакаванні колаў) транспартнага сродку пры адсутнасці кіроўцы ў транспартным сродку або ў непасрэднай блізкасці ад яго;

«7.21 Слізкая паласа накату».

Таблічка ставіцца са знакам 1.23 і інфармуе аб магчымым змяненні каэфіцыента счаплення па шырыні праезнай часткі дарогі;

«7.22.1 – 7.22.4 Від небяспекі».

Таблічка ставіцца са знакам 1.29 і інфармуе аб магчымым відзе дарожна-транспартнага здарэння;

«7.23 Экстранная дапамога».

Таблічка інфармуе аб наяўнасці экстраннай сувязі на дарозе.

**36.** Дапускаецца з дазволу ДАІ прымяненне на дарогах таблічак, якія маюць сціслы надпіс з адназначным тлумачэннем.

**Дадатак 3 да Правіл дарожнага руху**

# ДАРОЖНАЯ РАЗМЕТКА

(гл. каляровы ўкладыш)

**ДАДАТАК 4**
**ДА ПРАВІЛ**
**ДАРОЖНАГА**
**РУХУ**

# ПЕРАЛІК
## НЯСПРАЎНАСЦЕЙ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ І ЎМОЎ, ПРЫ ЯКІХ ЗАБАРАНЯЕЦЦА ІХ УДЗЕЛ У ДАРОЖНЫМ РУХУ

Дадзеным пералікам вызначаюцца няспраўнасці аўтамабіляў, аўтобусаў, аўтапаяздоў, прычэпаў, матацыклаў, мапедаў, колавых трактароў і самаходных машын.

### Раздзел 1
### ТАРМАЗНЫЯ СІСТЭМЫ

**1.** Эфектыўнасць тармажэння рабочай тармазной сістэмы не адпавядае патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі (далей — тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты).

**2.** Парушаная герметычнасць гідраўлічнага тармазнога прывода, маецца падцяканне тармазной вадкасці.

**3.** Парушаная герметычнасць пнеўматычнага або пнеўмагідраўлічнага тармазнога прывода, якая вядзе да падзення ціску паветра пры непрацуючым рухавіку болей чым на 0,05 МПА (0,5 кг/см$^2$) за 15 хвілін пасля поўнага прывядзення названага прывода ў дзеянне.

**4.** Не дзейнічае манометр пнеўматычнага або пнеўмагідраўлічнага тармазнога прывода.

**5.** Стаяначная тармазная сістэма не забяспечвае нерухомага стану:

транспартных сродкаў з поўнай нагрузкай на ўхіле да 16 працэнтаў уключна;

легкавых аўтамабіляў і аўтобусаў у падрыхтаваным стане на ўхіле да 23 працэнтаў уключна;

грузавых аўтамабіляў і аўтапаяздоў у падрыхтаваным стане на ўхіле да 31 працэнта ўключна.

**6.** Рычаг (ручка) кіравання стаяначнай тармазной сістэмай не ўтрымліваецца замыкальнай прыладай.

**7.** Ёсць:

дэталі з трэшчынамі або рэшткавай дэфармацыяй;

не прадугледжаны канструкцыяй кантакт трубаправода тармазнога прывода з элементамі транспартнага сродку.

## Раздзел 2
## РУЛЯВОЕ КІРАВАННЕ

**8.** Сумарны люфт у рулявым кіраванні перавышае наступныя значэнні:

легкавыя аўтамабілі і створаныя на іх базе грузавыя аўтамабілі і аўтобусы — 10 градусаў;

аўтобусы — 20 градусаў;

грузавыя аўтамабілі — 25 градусаў.

**9.** Ёсць перамяшчэнні дэталяў і вузлоў, не прадугледжаныя канструкцыяй, разьбовыя злучэнні не зацягнуты або не зафіксаваны вызначаным чынам.

**10.** Няспраўны або адсутнічае прадугледжаны канструкцыяй узмацняльнік рулявога кіравання або рулявы дэмпфер (для матацыклаў).

**11.** Прыменены дэталі са слядамі рэшткавай дэфармацыі, з трэшчынамі, іншымі дэфектамі.

**12.** Кручэнне рулявога кола адбываецца з рыўкамі і (або) заяданнямі.

## Раздзел 3
## ЗНЕШНІЯ СВЕТЛАВЫЯ ПРЫБОРЫ

**13.** Колькасць, тып, колер, размяшчэнне і рэжым працы знешніх светлавых прыбораў не адпавядаюць патрабаванням канструкцыі транспартнага сродку. На транспартных сродках, знятых з вытворчасці, дапускаецца ўстаноўка знешніх светлавых прыбораў ад транспартных сродкаў іншых марак і мадэлей. Забараняецца падключаць заднія супрацьтуманныя ліхтары да стоп-сігналаў.

**14.** Парушана прадугледжаная тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі (тэхнічнай дакументацыяй) рэгуліроўка фар.

**15.** Не працуюць у вызначаным рэжыме або забруджаныя знешнія светлавыя прыборы і святлоадбівальнікі.

**16.** На светлавых прыборах адсутнічаюць рассейвальнікі або выкарыстоўваюцца рассейвальнікі і лямпы, якія не адпавядаюць тыпу дадзенага светлавога прыбора.

**17.** Устаноўка праблісквых сігналаў (маячкоў) не адпавядае патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

**18.** Спераду транспартнага сродку ўсталяваны светлавыя прыборы з агнямі або святлоадбівальнікамі чырвонага колеру ці ззаду — белага колеру (за выключэннем ліхтароў задняга ходу і асвятлення рэгістрацыйнага знака, святлоадбівальных рэгістрацыйнага, распазнавальнага і апазнавальнага знакаў).

**19.** Унутры аптычных элементаў знаходзяцца не прадугледжаныя канструкцыяй прадметы (вадкасці).

**20.** Сігналы тармажэння або апазнавальны знак «Аўтапоезд» працуюць у пробліскавым рэжыме.

**21.** Акрамя дзвюх супрацьтуманных, усталяваны дадатковыя фары, дадатковыя фары ўсталяваны на даху аўтамабіля.

## Раздзел 4
## Шклоачышчальнікі і шклоабмывальнікі ветравой шыбы

**22.** Не працуюць у вызначаным рэжыме шклоачышчальнікі. Частата перамяшчэння шчотак па мокрай шыбе ў рэжыме максімальнай хуткасці шклоачышчальнікаў меншая за 35 двайных хадоў за хвіліну.

**23.** Не працуюць прадугледжаныя канструкцыяй транспартнага сродку шклоабмывальнікі.

**24.** Ветравая шыба транспартнага сродку з боку кіроўцы мае трэшчыну (трэшчыны) у зоне, якая ачышчаецца шклоачышчальнікам.

## Раздзел 5
## Колы і шыны

**25.** Шыны легкавых аўтамабіляў маюць рэшткавую вышыню малюнка пратэктара меншую за 1,6 мм, грузавых аўтамабіляў — 1 мм, аўтобусаў — 2 мм, матацыклаў і мапедаў — 0,8 мм. Для прычэпаў устанаўліваюцца нормы рэшткавай вышыні малюнка пратэктара шынаў, аналагічныя нормам для шынаў механічных транспартных сродкаў, у счапленні з якімі яны ўдзельнічаюць у дарожным руху.

Шына лічыцца непрыгоднай да эксплуатацыі, калі з'явіўся адзін індыкатар зносу, размешчаны па дне канаўкі пратэктара, пры раўнамерным зносе або два індыкатары ў кожным з двух сячэнняў — пры нераўнамерным зносе бегавой дарожкі.

**26.** Шыны маюць мясцовыя пашкоджанні (прабоі, парэзы, разрывы), якія абгольваюць корд, а таксама расслаенне каркаса, адслаенне пратэктара і бакавіны, растрэскванні ад старэння гумы.

**27.** Адсутнічае болт (гайка) мацавання і (або) ёсць трэшчыны дыска і обадаў колаў.

**28.** Шыны па памеры або дапушчальнай нагрузцы не адпавядаюць мадэлі транспартнага сродку.

**29.** На адну вось аўтобуса, легкавога аўтамабіля або прычэпа да яго ўсталяваныя дыяганальныя шыны сумесна з радыяльнымі або шыны з розным малюнкам пратэктара.

На адну вось грузавога аўтамабіля або прычэпа да яго ўсталяваныя дыяганальныя шыны сумесна з радыяльнымі або шыны з розным тыпам малюнка пратэктара.

## Раздзел 6
## РУХАВІК

**30.** Утрыманне шкодных рэчываў у адпрацаваных газах і іх дымнасць перавышаюць велічыні, устаноўленыя тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі.

**31.** Парушаная герметычнасць сістэмы сілкавання.

**32.** Няспраўная сістэма выпуску адпрацаваных газаў.

**33.** Негерметычная газавая сістэма сілкавання на транспартным сродку з газавай паліўнай апаратурай.

**34.** Скончыўся тэрмін перыядычнага агляду балонаў на газабалонных транспартных сродках.

## Раздзел 7
## ІНШЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ КАНСТРУКЦЫІ ТРАНСПАРТНАГА СРОДКУ

**35.** Адсутнічаюць прадугледжаныя канструкцыяй транспартнага сродку сістэмы, агрэгаты, элементы кузава і асобныя дэталі.

**36.** Не працуе гукавы сігнал.

**37.** На шыбах і (або) у аконных праёмах транспартнага сродку ўсталяваны не прадугледжаныя яго канструкцыяй дадатковыя прадметы або нанесены пакрыцці, у тым ліку плёначныя.*

**38.** Не працуюць прадугледжаныя канструкцыяй транспартнага сродку:

замкі дзвярэй кузава або кабіны;

запоры бартоў грузавой платформы;

запоры паліўных бакаў;

запоры гарлавін цыстэрн.

**39.** Негерметычныя коркі паліўных бакаў, гарлавін цыстэрн.

**40.** Не працуюць:

механізм рэгуліроўкі палажэння сядзення кіроўцы;

аварыйныя выхады, прылады прывядзення іх у дзеянне;

прывад кіравання дзвярыма;

спідометр;

---

* Дадзеныя патрабаванні:

не датычацца нанесеных на верхнюю частку ветравой шыбы транспартнага сродку плёнак, пакрыццяў або напыленняў шырынёй не болей за 140 мм, а таксама да штор ак на вокнах аўтобуса, жалюзі або штор ак на задняй шыбе легкавога аўтамабіля пры наяўнасці ў іх з абодвух бакоў вонкавых люстэркаў задняга віду;

не распаўсюджваюцца на транспартныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца для транспартнага абслугоўвання, суправаджэння і забеспячэння бяспекі службовых асоб, якія падлягаюць дзяржаўнай ахове ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

супрацьугонныя прылады;

прылада абагрэву і абдзімання шыбаў.

**41.** Адсутнічаюць прадугледжаныя канструкцыяй транспартнага сродку задняя абаронная прылада, гразеабаронныя фартухі і пырскавікі.

**42.** Няспраўныя цягава-счэпная і апорна-счэпная прылады цягача і прычапнога звяна, а таксама адсутнічаюць або няспраўныя прадугледжаныя іх канструкцыяй страхавачныя тросы (ланцугі). Ёсць люфты ў злучэннях рамы матацыклаў з рамай бакавога прычэпа.

**43.** Няспраўны або не працуе тахограф.

**44.** Адсутнічаюць:

у аўтобусе, легкавым і грузавым аўтамабілях, колавым трактары, самаходнай машыне — медыцынская аптэчка, вогнетушыцель, знак аварыйнага прыпынку, а ў грузавым аўтамабілі з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай больш за 3,5 тоны і аўтобусе з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай больш за 5 тон — таксама супрацьадкатныя ўпоры (не менш за два). У аўтобусе і грузавым аўтамабілі, прызначаным для перавозкі пасажыраў, адзін вогнетушыцель павінен знаходзіцца ў кабіне кіроўцы, а другі — у пасажырскім салоне (кузаве). Вогнетушыцель павінен быць спраўны і сертыфікаваны;

на матацыкле з бакавым прычэпам — медыцынская аптэчка, знак аварыйнага прыпынку.

Медыцынская аптэчка павінна быць укамплектавана прэпаратамі (вырабамі), прыгоднымі для выкарыстання (з дзеючым тэрмінам прыдатнасці), згодна з пералікам, зацверджаным Міністэрствам аховы здароўя.

**45.** На транспартных сродках, якія не належаць аператыўным і спецыяльным службам, выкарыстоўваюцца праблісковыя сігналы (маячкі), гукавыя сігналы з чаргаваннем тонаў і колераграфічныя схемы, прадугледжаныя тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі для адпаведных транспартных сродкаў.

**46.** Адсутнічаюць рамяні бяспекі, калі іх устаноўка прадугледжаная канструкцыяй транспартнага сродку, рамяні бяспекі маюць бачныя надрывы на лямцы або няспраўны рабочы механізм.

**47.** Рэгістрацыйны знак транспартнага сродку не адпавядае патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

**48.** На матацыкле адсутнічаюць прадугледжаныя яго канструкцыяй дугі бяспекі.

**49.** На матацыкле і мапедзе адсутнічаюць прадугледжаныя іх канструкцыяй падножкі, папярочныя ручкі для пасажыраў у сядле.

**50.** Адсутнічаюць прадугледжаныя канструкцыяй транспартнага сродку або ўсталяваныя без узгаднення з арганізацыяй (заводам)-вытворцам або іншай упаўнаважанай арганізацыяй дадатковыя элементы тармазных сістэм, рулявога кіравання, сістэмы сілкавання палівам, іншых вузлоў і агрэгатаў, патрабаванні да якіх рэгламентуюцца дадзеным дадаткам.

**51.** Ёсць значныя знешнія пашкоджанні дэталяў кузава (кабіны), афарбоўкі транспартнага сродку і (або) яго афарбоўка не адпавядае названай у пасведчанні аб рэгістрацыі транспартнага сродку (пашпарце транспартнага сродку або шасі транспартнага сродку).

**52.** Апазнавальны знак транспартнага сродку не адпавядае патрабаванням Правіл дарожнага руху і тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

**ДАДАТАК 1**
**ДА ПРАВІЛ**
**ДАРОЖНАГА**
**РУХУ**

# ДАРОЖНЫЯ СВЯТЛАФОРЫ

## Транспартныя святлафоры



З вертыкальным размяшчэннем сігналаў



З дадатковымі секцыямі



Для рэгулявання руху ў пэўных напрамках



Для рэгулявання руху веласіпедаў



З гарызантальным размяшчэннем сігналаў



Рэверсіўны



Для рэгулявання руху трамваяў і іншых маршрутных транспартных сродкаў



Для рэгулявання руху на тэрыторыях арганізацый і ў месцах звужэння праезнай часткі дарогі



Для пазначэння нерэгуляваных скрыжаванняў і пешаходных пераходаў



Для рэгулявання руху праз чыгуначныя пераезды

Прыклад дарожнага святлафора, які прымяняецца з:

інфармацыйнай секцыяй — інфармацыйнай таблічкай



## Пешаходныя святлафоры



## Дадатковае абсталяванне, якое прымяняецца з транспартнымі святлафорамі



Інфармацыйныя секцыі



Пазначальныя таблічкі



Інфармацыйныя таблічкі

## §3. Забараняльныя знакі




3.1 Уезд забаронены

3.2 Рух забаронены

3.3 Рух механічных транспартных сродкаў забаронены

3.4 Рух грузавых аўтамабіляў забаронены

3.5 Рух матацыклаў забаронены

3.6 Рух трактароў забаронены




3.7 Рух з прычэпам забаронены

3.8 Рух гужавых транспартных сродкаў забаронены

3.9 Рух веласіпедаў забаронены

3.10 Рух пешаходаў забаронены

3.11.1 3.11.2 Абмежаванне масы




3.12.1 3.12.2 Абмежаванне нагрузкі на вось

3.13 Абмежаванне вышыні

3.14 Абмежаванне шырыні

3.15.1 3.15.2 Абмежаванне даўжыні




3.16 Абмежаванне мінімальнай дыстанцыі

3.17.1 Мытня

3.17.2 Небяспека

3.18.1 Паварот направа забаронены

3.18.2 Паварот налева забаронены

3.19 Разварот забаронены




3.20.1 3.20.2 3.20.3 Абгон забаронены

3.21.1 3.21.2 Канец зоны забароны абгону

3.22 Абгон грузавым аўтамабілям забаронены

3.23 Канец зоны забароны абгону грузавым аўтамабілям




3.24.1 3.24.2 Абмежаванне максімальнай хуткасці

3.25.1 3.25.2 Канец зоны абмежавання максімальнай хуткасці

3.26 Падача гукавага сігнала забаронена

3.27 Прыпынак забаронены



3.28 Стаянка забаронена

3.29 Стаянка забаронена па няцотных чыслах месяца

3.30 Стаянка забаронена па цотных чыслах месяца

3.31 Канец зоны ўсіх абмежаванняў

3.32 Рух транспартных сродкаў з небяспечнымі грузамі забаронены



5.7.1 5.7.2

Выезд на дарогу
з аднабаковым рухам



5.8.1
Напрамкі руху
па палосах



5.8.2

Напрамак руху па паласе




5.8.3



5.8.4

Пачатак паласы



5.8.5 5.8.6

Канец паласы



5.8.7



5.8.8

Напрамак руху па палосах



5.9.1
Паласа для
маршрутных
транспартных
сродкаў



5.9.2
Канец паласы
для маршрутных
транспартных
сродкаў



5.10.1
Дарога з паласой
для маршрутных
транспартных
сродкаў



5.10.2 5.10.3
Выезд на дарогу
з паласой для маршрутных
транспартных сродкаў



5.10.4
Канец дарогі
з паласой
для маршрутных
транспартных
сродкаў



5.11.1
Месца
для
развароту



5.11.2
Зона
для
развароту



5.12.1
Пункт
прыпынку
аўтобуса і (або)
тралейбуса




5.12.2
Месца прыпынку
аўтобуса і (або)
тралейбуса



5.13.1
Пункт
прыпынку
трамвая




5.13.2
Месца
прыпынку
трамвая



5.14.1
Пункт прыпынку экспрэс-маршрута




5.14.2
Месца стаянкі таксі




5.15
Месца стаянкі



5.16.1 5.16.2
Пешаходны пераход



5.17.1 5.17.2
Падземны пешаходны пераход



5.17.3 5.17.4
Надземны пешаходны пераход




5.18.1
Рэкамендаваная хуткасць




5.18.2
Канец дзеяння знака «Рэкамендаваная хуткасць»



5.19.1 5.19.2 5.19.3
Тупік




5.20.1
Папярэдні паказальнік напрамкаў




5.20.2
Папярэдні паказальнік напрамкаў



5.20.3
Схема руху




5.21.1
Паказальнік напрамку




5.21.2
Паказальнік напрамкаў




5.22.1 5.22.2
Пачатак населенага пункта




5.23.1 5.23.2
Канец населенага пункта




5.24
Пачатак мяжы населенага пункта




5.25
Канец мяжы населенага пункта



5.26.1



5.26.2
Найменне аб'екта



5.27
Паказальнік адлегласцей




5.28
Кіламетровы знак

## §7. Знакі дадатковай інфармацыі (таблічкі)




7.1.1 7.1.2 7.1.3 7.1.4 — Адлегласць да аб'екта

7.2.1 7.2.2 7.2.3 7.2.4 7.2.5 7.2.6 — Напрамак дзеяння



7.3.1 7.3.2 7.3.3 — Зона дзеяння



7.4.1 7.4.2 7.4.3 7.4.4 7.4.5 7.4.6 7.4.7 7.4.8 — Від транспартнага сродку




7.5.1 Субботнія, нядзельныя і святочныя дні

7.5.2 Працоўныя дні

7.5.3 Дні тыдня

7.5.4 7.5.5 7.5.6 7.5.7 — Час дзеяння



7.6.1 7.6.2 7.6.3 7.6.4 7.6.5 7.6.6 7.6.7 7.6.7 7.6.9

7.6.10 7.6.11 7.6.12 7.6.13 7.6.14 7.6.15 7.6.16 7.6.17 7.6.18

Спосаб пастаноўкі транспартнага сродку на стаянку




7.7 Колькасць небяспечных паваротаў

7.8 Платныя паслугі

7.9 Абмежаванне працягласці стаянкі

7.10 Месца для агляду аўтамабіляў

7.11 Абмежаванне максімальнай масы

7.12 Нанясенне разметкі

7.13 Напрамак галоўнай дарогі




7.14 Паласа руху

7.15 Пешаходы – інваліды па зроку

7.16 Вільготнае пакрыццё

7.17 Інваліды

7.18 Акрамя інвалідаў

7.19 Клас небяспечнага грузу




7.20 Эвакуатар

7.21 Слізкая паласа накату

7.22.1 7.22.2 7.22.3 7.22.4 — Від небяспекі

7.23 Экстраная дапамога

**Дадатак 3**
**да Правіл**
**дарожнага руху**

# ДАРОЖНАЯ РАЗМЕТКА

## Раздзел 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**1.** Дарожная разметка прымяняецца ў адпаведнасці з дадзеным дадаткам і патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі.

**2.** Дарожная разметка дзеліцца на гарызантальную (лініі, стрэлы, надпісы і іншыя знакі на праезнай частцы дарогі) і вертыкальную (чорныя, белыя, чырвоныя палосы на дарожных збудаваннях і элементах абсталявання дарог).

Гарызантальная дарожная разметка ўстанаўлівае пэўныя рэжымы і парадак дарожнага руху, а вертыкальная — абазначае элементы дарожных збудаванняў, абсталявання дарог і служыць сродкам зрокавага арыентавання на дарогах.

## Раздзел 2
## ГАРЫЗАНТАЛЬНАЯ ДАРОЖНАЯ РАЗМЕТКА

**3.** Гарызантальная дарожная разметка (калі не вызначана іншае, далей — разметка) дзеліцца на пастаянную і часовую.

Пастаянная разметка мае белы колер, акрамя ліній разметкі 1.4, 1.10, 1.17.1, 1.17.2, 1.26, якія маюць жоўты колер. Лініі разметкі 1.1 – 1.3, 1.5, 1.6, 1.11 могуць мець жоўты колер у выпадках, вызначаных дадзеным дадаткам. Разметка 1.14.2 мае элементы жоўтага колеру.

Часовая разметка мае аранжавы колер і выкарыстоўваецца ў месцах правядзення рамонтных і іншых работ на дарозе, у выпадках аператыўнага змянення ў арганізацыі дарожнага руху, звязанага з забеспячэннем яго бяспекі або правядзеннем спецыяльных мерапрыемстваў.

Калі часовая разметка супярэчыць пастаяннай, удзельнікі дарожнага руху павінны кіравацца часовай разметкай.

**4.** Лініі разметкі 1.1 – 1.3 перасякаць забараняецца, за выключэннем выпадкаў прымянення лініі разметкі 1.1 для пазначэння межаў месцаў стаянкі транспартных сродкаў і лініі разметкі 1.2 белага колеру, якая размяшчаецца справа ад кіроўцы для прыпынку транспартнага сродку на ўзбочыне (злева ад кіроўцы для выезда транспартнага сродку з узбочыны пасля яго прыпынку).

Лінію разметкі 1.1 дазваляецца перасякаць таксама для абгону адзіночнага транспартнага сродку, які рухаецца з хуткасцю менш за 30 км/г, і для аб'езду нерухомай перашкоды на дарозе, якая стварае небяспеку для руху.

**5.** Лініі разметкі 1.5 – 1.8 дазваляецца перасякаць з любога боку, акрамя скрыжаванняў, на якіх не арганізаваны кругавы рух.

**6.** Лінію разметкі 1.9 на ўчастку дарогі паміж рэверсіўнымі святлафорамі дазваляецца перасякаць, калі яна размешчана справа ад кіроўцы. Пры ўключаных зялёных сігналах рэверсіўных святлафораў лінію разметкі 1.9 дазваляецца перасякаць з любога боку, калі яна падзяляе палосы, па якіх рух дазволены ў адным напрамку. Пры адключэнні рэверсіўных святлафораў кіроўца павінен неадкладна перастроіцца ўправа за лінію разметкі 1.9. Пры выключаных рэверсіўных святлафорах або забараняльным сігнале на іх лінію разметкі 1.9, якая знаходзіцца злева, перасякаць забараняецца.

**7.** Лінію разметкі 1.11 дазваляецца перасякаць толькі з боку перарывістай лініі, а з боку суцэльнай — толькі пры завяршэнні абгону або аб'езду перашкоды.

**8.** У выпадках, калі значэнні ліній разметкі і дарожных знакаў супярэчаць адно аднаму, удзельнікі дарожнага руху павінны кіравацца дарожнымі знакамі.

**9.** Устанаўліваюцца наступныя віды і прызначэнні разметкі:

| № лініі разметкі | Выгляд разметкі | Прызначэнне разметкі |
|---|---|---|
| 1.1 |  | Раздзяленне транспартных патокаў супрацьлеглых напрамкаў (можа мець жоўты колер).<br>Пазначэнне межаў палос руху на небяспечных участках дарогі.<br>Пазначэнне межаў праезнай часткі дарогі, на якія ўезд забаронены.<br>Пазначэнне межаў месцаў стаянкі транспартных сродкаў на пляцоўках, спецыяльна адведзеных для стаянкі.<br>Пазначэнне астраўкоў бяспекі (у выпадках, вызначаных у пэўным парадку Міністрам унутраных спраў) |
| 1.2 |  | Раздзяленне транспартных патокаў супрацьлеглых напрамкаў на дарогах без раздзяляльнай паласы, якія маюць чатыры і болей палос руху (можа мець жоўты колер) |
| 1.3 |  | Пазначэнне месцаў, дзе забароненыя прыпынак і стаянка транспартных сродкаў, акрамя маршрутных транспартных сродкаў (наносіцца каля края праезнай часткі дарогі або па версе бардзюра) |
| 1.4 |  | Раздзяленне транспартных патокаў супрацьлеглых напрамкаў на дарогах, якія маюць дзве ці тры паласы руху (можа мець жоўты колер) |
| 1.5 |  | Пазначэнне межаў палос руху пры наяўнасці дзвюх і болей палос, прызначаных для руху ў адным напрамку |
| 1.6 |  | Пазначэнне набліжэння да суцэльнай лініі падоўжнай разметкі (можа мець жоўты колер) |
| 1.7 |  | Пазначэнне палос руху ў межах скрыжавання |
| 1.8 |  | Пазначэнне мяжы паміж паласой разгону ці тармажэння і асноўнай паласой праезнай часткі дарогі (на скрыжаваннях, перасячэннях дарог у розных узроўнях, у зоне пунктаў прыпынку маршрутных транспартных сродкаў, на іншых аб'ектах) |

| № лініі разметкі | Выгляд разметкі | Прызначэнне разметкі |
|---|---|---|
| 1.9 |  | Пазначэнне межаў палос руху, на якіх ажыццяўляецца рэверсіўнае рэгуляванне |
| 1.10 |  | Пазначэнне месцаў, дзе забаронена стаянка транспартных сродкаў (наносіцца каля края праезнай часткі дарогі ці па версе бардзюра) |
| 1.11 |  | Раздзяленне транспартных патокаў супрацьлеглых ці спадарожных напрамкаў на ўчастках дарог, на якіх перастраенне дазволена толькі з боку перарывістай лініі (можа мець жоўты колер).<br>Пазначэнне месцаў, прызначаных для разварота, выезда ці ўезда з пляцовак стаянкі, аўтазаправачных станцый і іншых аб'ектаў |
| 1.12 |  | Пазначэнне месца спынення транспартнага сродку – «стоп-лінія» |
| 1.13 |  | Пазначэнне месца, дзе кіроўца абавязаны саступіць дарогу транспартным сродкам, якія рухаюцца па дарозе, што перасякаецца |
| 1.14.1 |  | Пазначэнне нерэгулюемага пешаходнага перахода – «зебра» |
| 1.14.2 |  | Пазначэнне нерэгулюемага пешаходнага перахода ў месцах павышанай небяспекі |
| 1.14.3 |  | Пазначэнне пешаходнага перахода, абсталяванага дарожнымі святлафорамі |
| 1.15 |  | Пазначэнне месца, дзе веласіпедная дарожка перасякае праезную частку дарогі |

| № лініі разметкі | Выгляд разметкі | Прызначэнне разметкі |
|---|---|---|
| 1.16.1 |  | Пазначэнне астраўкоў, якія раздзяляюць транспартныя патокі супрацьлеглых напрамкаў |
| 1.16.2 |  | Пазначэнне астраўкоў, якія раздзяляюць транспартныя патокі аднаго напрамку |
| 1.16.3 |  | Пазначэнне астраўкоў у месцах зліцця транспартных патокаў |
| 1.17.1 |  | Пазначэнне пунктаў прыпынку маршрутных транспартных сродкаў і стаянак таксі |
| 1.17.2 |  | Пазначэнне мяжы зоны пункта прыпынку трамвая, які размешчаны на адным узроўні з праезнай часткай дарогі |
| 1.18.1–1.18.8 |  | Пазначэнне напрамкаў руху па палосах руху:<br>1.18.1 – толькі прама;<br>1.18.2 – толькі направа;<br>1.18.3 – налева, а таксама на разварот у выпадку нанясення разметкі ў крайняй левай паласе руху ў дадзеным напрамку;<br>1.18.4 – прама і направа;<br>1.18.5 – прама і налева, а таксама на разварот у выпадку нанясення разметкі ў крайняй левай паласе руху ў дадзеным напрамку;<br>1.18.6 – направа і налева, а таксама на разварот з крайняй левай паласы ў дадзеным напрамку;<br>1.18.7 – на бліжэйшую праезную частку дарогі паварот налева забаронены;<br>1.18.8 - на бліжэйшую праезную частку дарогі паварот направа забаронены |

| № лініі разметкі | Выгляд разметкі | Прызначэнне разметкі |
|---|---|---|
| 1.19 |  | Пазначэнне набліжэння да звужэння праезнай часткі дарогі (участка, дзе змяншаецца колькасць палос руху ў дадзеным напрамку) або да разметкі 1.1 або 1.11, якая раздзяляе транспартныя патокі супрацьлеглых напрамкаў |
| 1.20 |  | Пазначэнне набліжэння да разметкі 1.13 |
| 1.21 |   | Пазначэнне набліжэння да разметкі 1.12 |
| 1.22 |   | Пазначэнне нумара дарогі |
| 1.23 |   | Пазначэнне паласы, вылучанай для руху маршрутных транспартных сродкаў |
| 1.24.1 |  | Дубляванне на праезнай частцы дарогі дарожнага знака 1.20 |
| 1.24.2 |  | Дубляванне на праезнай частцы дарогі дарожнага знака 1.21 |
| 1.24.3 |   | Дубляванне на праезнай частцы дарогі дарожнага знака 3.24.1 |
| 1.25 |  | Пазначэнне набліжэння да штучнай няроўнасці |
| 1.26 |  | Пазначэнне штучнай няроўнасці |

## Раздзел 3
## ВЕРТЫКАЛЬНАЯ ДАРОЖНАЯ РАЗМЕТКА

**10.** Вертыкальная дарожная разметка (далей — разметка) 2.1.1 – 2.1.3 абазначае вертыкальныя элементы дарожных збудаванняў (апор мастоў, пуцеправодаў, эстакад, тарцовых частак парапетаў), калі гэтыя элементы ўяўляюць небяспеку для руху транспартных сродкаў. Шчыткі з разметкай 2.1.1 – 2.1.3 могуць устанаўлівацца на апоры дарожных знакаў 4.2.1 – 4.2.3.

**11.** Разметка 2.2 абазначае ніжні край пралётнага збудавання мастоў, пуцеправодаў і эстакад.

**12.** Разметка 2.3 абазначае круглыя тумбы, устаноўленыя на раздзяляльных палосах ці астраўках бяспекі.

**13.** Разметка 2.4.1 выканана са святлоадбівальным элементам чырвонага колеру і абазначае сігнальныя слупкі, у тым ліку пакарочаныя, надаўбні, апоры агароджаў і да т. п., размешчаныя справа ад праезнай часткі дарогі.

**14.** Разметка 2.4.2 выканана са святлоадбівальным элементам белага, жоўтага колераў і абазначае сігнальныя слупкі, у тым ліку пакарочаныя, надаўбні, апоры агароджаў і да т. п., размешчаныя злева ад праезнай часткі дарогі.

**15.** Разметка 2.4.3 абазначае сігнальныя шчыткі, устаноўленыя на бар'ерных агароджах дарог.

**16.** Разметка 2.5 абазначае бакавыя паверхні пачатковых і канцавых участкаў дарожных агароджаў.

**17.** Разметка 2.6 абазначае бардзюры на небяспечных участках дарогі і ўзвышаных астраўках бяспекі.

**18.** Разметка мае наступнае графічнае адлюстраванне:















**ДАДАТАК 5**
**ДА ПРАВІЛ ДАРОЖНАГА РУХУ**

# АПАЗНАВАЛЬНЫЯ ЗНАКІ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ



Аўтапоезд



Знак аварыйнага прыпынку




Шыпы




Навучальны транспартны сродак




Абмежаванне хуткасці



Перавозка дзяцей




Калона



Ціхаходны транспартны сродак




Распазнавальны знак транспартнага сродку Рэспублікі Беларусь



Буйнагабарытны груз




Небяспечны груз




Знак небяспекі



Інвалід па слыху



Інвалід



Урач



Пазначэнне гнуткіх сувязных звёнаў пры буксіроўцы механічных транспартных сродкаў



Транспартны сродак вялікай грузападымальнасці



Транспартны сродак вялікай даўжыні

# ЗМЕСТ


Прадмова ... 3

Раздзел 1. Агульныя палажэнні ... 4

Раздзел 2. Агульныя правы і абавязкі ўдзельнікаў дарожнага руху ... 13

Раздзел 3. Правы і абавязкі кіроўцаў ... 14

Раздзел 4. Правы і абавязкі пешаходаў ... 19

Раздзел 5. Абавязкі пасажыраў ... 21

Раздзел 6. Правы і абавязкі кіроўцаў і іншых асоб у асаблівых выпадках ... 22

Раздзел 7. Сігналы рэгуліроўшчыка і святлафораў ... 26

Раздзел 8. Прымяненне аварыйнай светлавой сігналізацыі, знака аварыйнага прыпынку, ліхтара з перарывістым чырвоным святлом ... 31

Раздзел 9. Манеўраванне ... 33

Раздзел 10. Размяшчэнне транспартных сродкаў на праезнай частцы дарогі ... 36

Раздзел 11. Хуткасць руху транспартных сродкаў ... 39

Раздзел 12. Абгон, сустрэчны раз'езд ... 41

Раздзел 13. Праезд скрыжаванняў ... 42

Раздзел 14. Пешаходныя пераходы і пункты прыпынку маршрутных транспартных сродкаў ... 44

Раздзел 15. Перавага маршрутных транспартных сродкаў ... 45

Раздзел 16. Чыгуначныя пераезды ... 46

Раздзел 17. Рух па аўтамагістралі ... 48

Раздзел 18. Рух у жылой і пешаходнай зонах, на прылеглай тэрыторыі ... 48

Раздзел 19. Прыпынак і стаянка транспартных сродкаў ... 49

Раздзел 20. Рух на веласіпедах і мапедах ... 52

Раздзел 21. Рух гужавых транспартных сродкаў, коннікаў і прагон жывёлы ... 54

Раздзел 22. Карыстанне знешнімі светлавымі прыборамі і гукавымі сігналамі транспартных сродкаў ... 55

Раздзел 23. Перавозка пасажыраў ... 57

Раздзел 24. Перавозка грузаў ... 59

Раздзел 25. Буксіроўка механічных транспартных сродкаў ... 60

Раздзел 26. Асноўныя палажэнні аб допуску транспартных сродкаў да ўдзелу ў дарожным руху, іх тэхнічны стан, абсталяванне ... 61

Раздзел 27. Абавязкі службовых і іншых асоб па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху ... 67

Дадатак 1. ДАРОЖНЫЯ СВЯТЛАФОРЫ (гл. каляровы ўкладыш)

Дадатак 2. ДАРОЖНЫЯ ЗНАКІ ... 69
- Раздзел 1. Апісанне дарожных знакаў ... 69
- Выявы дарожных знакаў (гл. каляровы ўкладыш)

Дадатак 3. ДАРОЖНАЯ РАЗМЕТКА (гл. каляровы ўкладыш)
- Раздзел 1. Агульныя палажэнні
- Раздзел 2. Гарызантальная дарожная разметка
- Раздзел 3. Вертыкальная дарожная разметка

Дадатак 4. ПЕРАЛІК НЯСПРАЎНАСЦЕЙ транспартных сродкаў і ўмоў, пры якіх забараняецца іх удзел у дарожным руху ... 89

Дадатак 5. АПАЗНАВАЛЬНЫЯ ЗНАКІ транспартных сродкаў (гл. каляровы ўкладыш)

*Даведачнае выданне*

**ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Адказны за выпуск *Ул. М. Сіўчыкаў*

Падпісана да друку 23.02.2012.
Фармат 60×84/16. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 4,14. Ул.-выд. арк. 4,08.
Наклад 200 ас. Замова 111.

Індывідуальны прадпрымальнік Сіўчыкаў Уладзімір Мікалаевіч.
№ 02330/985 ад 31.08.2011.
Пр. Незалежнасці, 72 – 12, 220012, Мінск.
siuchykau@gmail.com

Паліграфічнае выкананне:
Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медысонт».
ЛП № 02330/0552782 ад 01.10.2010.
Вул. Ціміразева, 9-404, Рэспубліка Беларусь, 220004, г. Мінск

ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ

ISBN 978-985-7030-03-3
9 789857 030033

ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ